Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

26 КРАСАВІКА 2018 г. ЧАЦВЕР № 79 (28695)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



## Прафесія — ахоўнік спадчыны

СТАР. 5



## Куды дзенуцца сталічныя веласіпедысты

СТАР. 10

Сямейная газета



## Дыджэй Казімір пра жыццё пасля 70

# Рэха Чарнобыля. ПАМІЖ ДЗВЮМА РАДЗІМАМІ






Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Ганна ШАЦІЛА і яе дачка Галіна ПРОХАРАВА прыехалі на сваю малую радзіму — у былую вёску Варацец Хойніцкага раёна, наведалі родны дом, які пакінулі яшчэ ў першыя дні аварыі на Чарнобыльскай атамнай станцыі. Такія сустрэчы для іх вельмі рэдкія — і таму дарагія, хвалюючыя, незабыўныя.**

**(Заканчэнне фотарэпартажу на 7-й старонцы.)**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Дзмітрый КАЛЕЧЫЦ, намеснік старшыні праўлення Нацбанка:**

*«Нацыянальны банк прымае неабходныя меры для дасягнення мэты па інфляцыі не вышэй за 6 % у 2018 годзе. Мы прымаем усе неабходныя меры, каб дасягнуць гэтага. Працуем у цесным кантакце з органамі дзяржаўнага кіравання, Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю — гэта наш мандат агульны з урадам, і гэта з'яўляецца адной з мэт нашай эканамічнай палітыкі. Прыняцце рэзкіх мер для абмежавання інфляцыі не прадугледжваецца. Ёсць асноўныя напрамкі грашова-крэдытнай палітыкі, пралічаны цэлы набор усіх неабходных паказчыкаў у галіне грашовых прапаноў, працэнтных ставак, у галіне зніжэння макраэканамічных паказчыкаў, у рамках гэтага фрэймворка мы спрабуем працаваць».*

ISSN 1990 - 763X

18079

■ Круглы стол

# ГОД МАЛОЙ РАДЗІМЫ. ДЗЕЙНАСЦІ ГОД

**Гэты год абвешчаны Годам малой радзімы. І тым, хто ўсур'ёз заклапочаны яе лёсам, відавочна, што зрабіць трэба нямала і што задачы пастаўлены маштабныя. У той жа час малая радзіма патрабуе ўвагі не толькі сёлета. Яна, наша зямля, заўсёды адгукаецца на клопат — як цяпер, як сто гадоў таму, так і ў будучыні, калі на ёй будуць жыць нашы нашчадкі. Што сёння адбываецца ў невялічкіх вёсачках? Ці ведаюць жыхары раённых цэнтраў пра тыя цікавінкі, што іх атачаюць? Якія захады варта было б зрабіць на ўзроўні ўсёй краіны?.. На гэтыя і некаторыя іншыя пытанні шукалі адказу падчас круглага стала, арганізаванага Выдавецкім домам «Звязда» і рэдакцыяй «Краязнаўчай газеты». Удзел у ім прынялі дырэктар — галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда» Павел СУХАРУКАЎ, галоўны рэдактар «Краязнаўчай газеты» Уладзімір ГІЛЕП, старшыня Беларускага фонду культуры Тадэвуш СТРУЖЭЦКІ, намеснік старшыні Беларускага фонду культуры Анатоль БУТЭВІЧ, старшыня Пастаўскага раённага аддзялення Таварыства беларускай мовы краязнавец Ігар ПРАКАПОВІЧ, выканаўчы дырэктар маладзёжнага аб'яднання «Гісторыка» Таццяна ПЯТРОВА, вядучы навуковы супрацоўнік Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы музеязнаўца Павел КАРАЛЁЎ, навуковы супрацоўнік Лідскага гісторыка-мастацкага музея Алесь ХІТРУН.**




Фота Кастуся ДРОБАВА.

СТАР. 4

## КОРАТКА

**Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Беларусі запусціла першую ў краіне супольнасць Viber, якая будзе выкарыстоўвацца для аператыўнага інфармавання грамадзян.**

Беларусь абмяжоўвае ўвоз свініны з Венгрыі з-за афрыканскай чумы свіней.

**На другім энергаблоку Беларускай АЭС завяршылася зварка двух стыкаў галоўнага цыркуляцыйнага трубаправода.**

Пяць беларускіх птушкафабрык пачнуць пастаўкі прадукцыі ў Кітай: агракамбінат «Дзяржынскі», Віцебская бройлерная птушкафабрыка», птушкафабрыка «Дружба», СЗАТ «Сервалюкс», ААТ «Смалявічы Бройлер».

**Пасля перамогі над тэнісісткамі Славакіі ў Кубку Федэрацыі зборная Беларусі ўзнялася на 3-е месца ў сусветным камандным рэйтынгу.**

У Ліцэі БДУ пачаты прыём дакументаў. Прыёмная кампанія ажыццяўляецца ў анлайн-рэжыме з дапамогай «Асабістага кабінета абітурыента».

**Каля 30 кампаній аштрафавалі ў Беларусі за неліцэнзійнае праграмнае забеспячэнне Microsoft.**

■ Парламенцкі дзённік

# Вырашаць пытанні бізнесу будуць на месцах

**Работу Дэкрэта № 7 «Аб развіцці прадпрымальніцтва» ацанілі падчас пасяджэння Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па эканамічнай палітыцы.**
**Дэпутаты і прадстаўнікі міністэрстваў, бізнес-саюзаў абмеркавалі, як найлепш растлумачыць прадпрымальнікам яго нормы і як вырашыць праблемы мясцовых выканкамаў у стварэнні дзелавога клімату.**

## Дасягнуць разумення трактоўкі

Як адзначыў **намеснік міністра эканомікі Дзмітрый МАТУСЕВІЧ**, дзякуючы прыняццю Дэкрэта № 7 ужо адбылося нямала пазітыўных змен для бізнесу. Так, па паведамляльным прынцыпе работы, якія былі уведзены з 26 лютага, зарэгістравана ўжо больш за 800 арганізацый.

Аднак на месцах рэалізацыя галоўнага дакумента па разнявоўленні бізнесу часта ідзе марудна. Не менш актуальным, на думку намесніка міністра эканомікі, застаецца дасягненне аднолькавага разумення трактовак дакумента.

«Сённяшняе мерапрыемства мае вялікае значэнне. Дэпутаты праз некаторы час паедуць у рэгіёны і будуць праводзіць з мясцовымі органамі ўлады тлумачэнні па рабоце Дэкрэта № 7», — дадаў Дзмітрый Матусевіч.

## Пласт праблем

У сваю чаргу, у Мінэканомікі адзначаюць, што ў прадпрымальнікаў працягваюць назапашвацца пытанні па рэалізацыі Дэкрэта № 7. Больш за ўсё адказаў бізнесмены хочуць пачуць па дзейнасці ў сферы будаўніцтва і транспарту. На думку **старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па эканамічнай палітыцы Уладзіслава ШЧЭПАВА**, бізнесу таксама трэба растлумачваць нормы дэкрэта, змены ў тэхнічным рэгуляванні, санітарных рэгламентах.

«Дэкрэт № 7 падняў пласт праблем і перашкод для развіцця бізнесу. Ёсць тэхнічныя моманты, пытанні, якія нельга было ўключыць у дэкрэт загадзя. Іх трэба вырашыць. Тут патрэбна кансультацыя рэспубліканскіх органаў кіравання», — лічыць Уладзіслаў Шчэпаў.

Таксама ён адзначыў, што прадпрымальнікам сёння складана падладжвацца пад рынак, які пастаянна змяняецца. У беларусаў з'явілася больш канкурэнтаў з суседніх краін у сферы лёгкай прамысловасці.

«Нашы прадпрымальнікі часам успрымаюць гэта як пагрозу. Мы ўступалі ў ЕАЭС, каб павысіць узровень канкурэнцыі і знізіць цэны, павялічыць асартымент. Гэтыя пытанні трэба вырашаць цывілізавана», — дадаў Уладзіслаў Шчэпаў.

У найбліжэйшай будучыні з Дэкрэтам № 7 узгодняць яшчэ шэсць кодэксаў, 21 закон, 13 указаў і 34 пастановы. Акрамя гэтага, прапрацоўваюцца дадатковыя дакументы. Як паведаміў намеснік міністра эканомікі, прамежкавыя вынікі па рабоце з Дэкрэтам № 7 ураду краіны прадставяць 14 мая.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ**

■ Акцэнты

# ТОЕ, ШТО Ў ЦЭНТРЫ ЎВАГІ



**Аляксандр РАГАЧУК, старшыня Брэсцкага гарвыканкама:**

— Кіраўнік дзяржавы абсалютна правільна сказаў аб недастатковым выкарыстанні краінай свайго геаграфічнага рэсурсу. Я гэта перш за ўсё праецырую на горад Брэст, на работу нашай турыстычнай галіны.

У нас нямала зроблена, маю на ўвазе бязвізавы рэжым, якім ужо карыстаюцца многія турысты. Але ёсць яшчэ аграмадныя рэзервы, над якімі працаваць і працаваць. Чаму сёння з Брэсцкага аэрапорта немагчыма вылецець у цэлы шэраг краін, чаму нашы людзі едуць у Львоў, Варшаву, Кіеў, каб адтуль вылецець на адпачынак у Еўропу? Над гэтым трэба працаваць зацікаўленым ведамствам краіны.

У горадзе мы будзем развіваць турыстычную інфраструктуру, різлічваю менавіта на ўязны турызм. Цяпер да нас прыязджае за год прыкладна 500 тысяч турыстаў. Гэта госці ў асноўным з краін бліжняга замежжа. Зараз мы павінны зрабіць акцэнт на еўрапейскага турыста. У нас ёсць што паказаць чалавеку з Еўропы. А калі ён прыедзе, пажыве некалькі дзён, зразумела, пакіне грошы, якія паслужаць развіццю эканомікі горада. І ўжо да канца гэтага года мы плануем павялічыць колькасць такіх турыстаў прыкладна ўдвая.



**Кацярына ЗЕНКЕВІЧ, старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў:**

— Вельмі важна, што ў пасланні Прэзідэнта былі абагульнены тыя важныя для краіны задачы, якія абмяркоўваліся на працягу мінулага года пры ўдзеле кіраўніка дзяржавы. Гэта кірункі развіцця прадпрымальніцтва, праблемы занятасці, ЖКГ, развіццё фізкультуры і спорту.

Пасланне Прэзідэнта датычыцца жыцця ўсяго беларускага грамадства і кожнага чалавека асабіста. Мне як дэпутату абласнога Савета важна, што Прэзідэнт казаў не толькі пра глабальныя задачы, але і пра тое, як важна праводзіць работу на месцах, на канкрэтных тэрыторыях. Канешне, у гэтай рабоце вельмі значная роля дэпутатаў мясцовых Саветаў базавага, першаснага ўзроўню. Бо менавіта яны ведаюць праблемы людзей, што жывуць у аддаленых населеных пунктах краіны. Самае важнае — развіццё эканомікі. Толькі дзякуючы ёй мы атрымліваем паступленні ў бюджэт і развіццё сацыяльнай сферы. Новыя рабочыя месцы трэба ствараць і на прадпрыемствах, якія ўжо паспяхова дзейнічаюць. Тут, як сказаў Прэзідэнт, важна прыцягненне інвестыцый. Наша краіна адкрыта ў тым ліку для замежных інвестыцый. Часта высокія тэхналогіі і высокапрадукцыйную вытворчасць нам могуць прапанаваць інвестары, якія прыходзяць звонку. Не менш важна стварэнне новых прадпрыемстваў і стымуляванне самазанятасці насельніцтва. Сёння вельмі актуальная тэма развіцця прыватнай ініцыятывы. Мы прыйшлі да таго, што ў грамадстве павінны ствараць новы клас — уласнікаў. Відома ж, калі чалавек працуе на сябе — ён зробіць усё, каб яго прадпрыемства плённа працавала. Канешне, у падтрымку Дэкрэта № 7 «Аб развіцці прадпрымальніцтва» будзе прыняты шэраг нарматыўна-прававых дакументаў. Тут вельмі важна, каб яны былі зразумелыя і празрыстыя для кожнага чалавека, які працуе на сябе. Гэта датычыцца не толькі вытворчай дзейнасці, але і рамесніцтва, аграэкатурызму і развіцця паслуг насельніцтву. Бо, калі чалавек сумленна працуе на сябе, расце не толькі яго дабрабыт, але і паступленні ў дзяржаўны бюджэт. Што ўрэшце добра для развіцця той тэрыторыі, на якой ён жыве.



**Ігар ЖУК, старшыня Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў:**

— У сваім звароце Прэзідэнтам скіравана ўвага на сітуацыю ў свеце. Яна не спакойная, а ў стане «халодная» вайны, гонкі ўзбраенняў. Таму самая галоўная каштоўнасць, якую трэба берагчы, — бяспека і мір, стабільнасць, згуртаванасць грамадства. Гэты тыя каштоўнасці, без якіх немагчыма далейшае развіццё ніводнай краіны. А ў Беларусі многія ведаюць, што за гэтым стаіць.

Вядома, нас, як дэпутатаў, хвалюе тэма сацыяльна-эканамічнага развіцця. Цяпер з'явіліся больш шырокія магчымасці для прадпрымальніцтва, прыцягнення прамых замежных інвестыцый, развіцця экспарту. Гэта — залог далейшага развіцця краіны, фактары, якія садзейнічаюць павышэнню дабрабыту народа, у тым ліку павелічэнню заработнай платы.

Думаю, што многіх усхвалявала тэма карупцыі. Прыкладаў такіх апошнім часам нямала. Нягледзячы на тое, што вядзецца барацьба з гэтай з'явай, кантроль нельга аслабляць і з боку выканаўчай улады, праваахоўных органаў. Грамадства павінна да фактаў хабарніцтва ставіцца адмоўна, каб не дапускаць карупцыйных праяўленняў. Бо гэта карозія, якая разбурае ўсе маральныя асновы, наносіць шкоду дзяржаве.

Спадабалася, што Прэзідэнт гатовы да адкрытага дыялогу ў абмеркаванні змяненняў у Канстытуцыю, іншыя заканадаўчыя акты, якія патрабуюць удасканалення, бо свет не стаіць на месцы, і наша краіна таксама. Таму і асноўны абавязак дэпутатаў — ствараць такія законы, якія б не стрымлівалі эканоміку ў развіцці.

Важным момантам, лічу, стала тэма па адміністрацыйна-тэрытарыяльным змяненні нашых абласцей і раёнаў. Справа ў тым, што мы бачым, як змяншаецца колькасць сельскіх саветаў, у нас у вобласці за апошнія гады іх стала на 12 менш. Разам з тым Прэзідэнт падкрэсліў, што да гэтага трэба ставіцца асэнсавана і абавязкова абмеркаваць на месцы кожны крок у гэтым кірунку.



**Віктар СІРЭНКА, намеснік старшыні Мінаблвыканкама, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці:**

— Пытанні, якія падняў падчас Паслання кіраўнік дзяржавы, актуальныя і злабадзённыя. У прыватнасці, трывожнага свету вакол нас, які парадзіў новы тэрмін «ледзяная» вайна. Як выказаўся Прэзідэнт, гэта пагроза для ўсёй сусветнай супольнасці. Калі з'явяцца нейкія гарачыя галовы, неістотна, на Усходзе або Захадзе, страты будуць нанесены нашай дзяржаве і нашаму народу. Таму вельмі важна, што ў межах Паслання прагучаў тэзіс пра тое, што наша агульная задача — берагчы мір. І самае галоўнае — разумець яго цану. На маю думку, таксама была закранутая вельмі важная тэма наконт эканомікі, газавай і нафтавай войнаў, адносіны іншых краін да збыту айчыннай прадукцыі на іх рынку. Усе гэтыя рэчы актуальныя і сказаны па сутнасці. Мяркую, гэтыя ацэнкі адпавядаюць і нашым унутраным ацэнкам таго, што адбываецца навокал.



**Рыгор БЫСЮК, дырэктар мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой», намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы:**

— Тое, што сказаў кіраўнік дзяржавы ў самым пачатку паслання, уяўляецца, на мой погляд, самым важным. Гаворка ішла аб захаванні міру, бяспекі, стабільнасці ў дзяржаве. Паводле слоў Прэзідэнта, сёння асабліва вострa адчуваецца, як лёгка страціць бяспеку і якіх неймаверных намаганняў каштуе яе захаваць. Акрамя таго, абвастраецца барацьба за месца ў сусветнай іерархіі, а стратэгічнае саперніцтва, канкурэнцыя паміж дзяржавамі сталі штодзённымі з'явамі. Амаль будзённай рэчаіснасцю выглядаюць гандлёвыя войны.

І на гэтым фоне мы ўсё вастрэй адчуваем каштоўнасць міру і бяспекі. Адчувалі, калі дружна выйшлі на суботнік у крэпасці, калі прыводзілі горад у парадак. А думаць пра чысціню і парадак, несумненна, можна толькі ў абстаноўцы камфорту і бяспекі, як і вырашаць задачы эканомікі, сацыяльна-культурнага развіцця, побытавыя праблемы. На 9 Мая, калі чарговы раз у Брэсцкую крэпасць прыйдуць сівыя ветэраны, а з імі разам шмат моладзі, гэта будзе дадатковы напамін аб каштоўнасці міру, у якім мы жывём больш за 70 гадоў. А яшчэ пра тое, што сёння за мір і стабільнасць адказны кожны чалавек, кожны грамадзянін сваёй краіны.



**Анатоль ДУЦЬКО, старшыня Магілёўскага райвыканкама:**

— Прэзідэнт правільна звярнуў увагу на тое, што выпадковых людзей на вытворчасці не павінна быць. Неабходна, каб кіравалі сапраўдныя прафесіяналы, спецыялісты сваёй справы, якія ведаюць, што рабіць, і бачаць перспектывы. Калі нешта не атрымліваецца, лепш даць дарогу больш таленавітым.

Справядлівыя словы прагучалі і наконт утрыманства, калі людзі патрабуюць нешта ад дзяржавы, а самі ні за што не адказваюць. Сёння з раніцы пабываў у гаспадарках раёна, сустракаўся з калектывамі. Гаварылі і наконт выступлення Прэзідэнта, пра тое, што трэба з адказнасцю ставіцца да сваёй работы. Дзяржава забяспечыла нас усім неабходным для пасяўной, ёсць і паліва, і насенне. Засталося толькі папрацаваць як мае быць, усе сілы ўкласці ў вытворчасць і атрымаць вынік. Кожны ўкладзены рубель павінен прынесці аддачу.

Наогул усе кірункі, якія агучыў кіраўнік дзяржавы, правільныя і своечасовыя. Трэба ўсё гэта браць на ўзбраенне і выконваць.

**Святлана ЯСКЕВІЧ, Ірына АСТАШКЕВІЧ, Маргарыта УШКЕВІЧ, Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ, Нэлі ЗІГУЛЯ**

СМІ ў Беларусі

# СМІ ДЛЯ ЎСІХ

## Традыцыйная выстава сёлета пройдзе ў новым фармаце

**На выставе «СМІ ў Беларусі», якая сёлета традыцыйна пройдзе з 3 да 5 мая ў сталічным НВЦ «БелЭкспа», будзе прадстаўлена каля чатырох сотняў перыядычных выданняў, радыё- і тэлекампаній, інтэрнэт-рэсурсаў і інфармацыйных агенцтваў, аператараў кабельнага тэлебачання і выдавецтваў.**

Цікавасць да выставы праявілі госці з Расіі, Украіны, Польшчы, Латвіі, Казахстана, Турцыі і іншых краін, якія таксама прадставяць свае экспазіцыі. У прыватнасці, сярод удзельнікаў будуць СМІ Кастрамской, Бранскай абласцей і Ямала-Ненецкай аўтаномнай акругі Расіі. Дэлегацыю апошняй узначаліць віцэ-губернатар Ірына Сакалова, якая правядзе шэраг сустрэч, у тым ліку з міністрам інфармацыі Аляксандрам Карлюкевічам і кіраўніцтвам Мінгарвыканкама.

Акрамя таго, у мерапрыемстве возьмуць удзел сродкі масавай інфармацыі Кастрамской вобласці, з якой у нашай краіны даволі цесныя сувязі. На цяперашні момант рэалізуецца пагадненне паміж урадам Рэспублікі Беларусь і Адміністрацыяй Кастрамской вобласці аб гандлёва-эканамічным, навукова-тэхнічным і сацыяльна-культурным супрацоўніцтве. У інфармацыйнай сферы двухбаковыя адносіны ладзяцца на аснове меморандума аб супрацоўніцтве ў галіне друку і інфарматызацыі, падпісаным у чэрвені 2017 года. Апроч узаемнага асвятлення розных мерапрыемстваў у сродках масавай інфармацыі на пастаяннай аснове вядзецца абмен вопытам у сферы падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне кнігавыдання, паліграфіі, СМІ. Напрыклад, у чэрвені 2017 года прадстаўнікі журналісцкай супольнасці Беларусі прынялі ўдзел ва Усерасійскім фестывалі тэлевізійнай, радыё і друкаванай журналістыкі «Мая правінцыя» ў Кастраме.

Як заўсёды, наведвальнікаў выставы чакае насычаная праграма мерапрыемстваў, у прыватнасці прэзентацыі шматлікіх інфармацыйных і інтэрнэт-праектаў, аўтограф-сесіі, майстар-класы, флэш-акцыі. У прыватнасці, Выдавецкі дом «Звязда» прадставіць сумесна з «Настаўніцкай газетай» праект «Мая малая радзіма», у яго межах пройдзе круглы стол з краязнаўцамі, этнографамі і іншымі спецыялістамі. А вось «Сталічнае тэлебачанне», якое рыхтуе да новага сезона цалкам абноўлены дызайн і шэраг новых праграм, часткова прэзентуе іх на выставе. Акрамя гэтага, па словах **намесніка генеральнага дырэктара ЗАТ «Сталічнае тэлебачанне» Кірыла КАЗАКОВА**, госці выставы атрымаюць унікальны шанц трапіць на тэлеканал у якасці вядучых ці карэспандэнтаў.

— Удзельнікі нашых інтэрактыўных конкурсаў могуць паспрабаваць сябе ў ролі вядучых, і калі нам яны падыдуць, мы запросім іх на працу на тэлеканал, — адзначыў Кірыл Казакоў.

Цырымонія адкрыцця выставы адбудзецца 3 мая, 4 мая ўпершыню будзе аб'яўлены Днём рэгіянальнай прэсы, а 5 мая стане Днём для дзяцей і моладзі. На спецыяльнай дзіцячай пляцоўцы забаўляць маленькіх гледачоў будуць не толькі дзіцячыя выданні, але і інфармацыйнае агенцтва БелТА, холдынг «СБ. Беларусь сегодня». Спецыяльны канцэрт для юнай аўдыторыі рыхтуе газета «Комсомольская правда».

Увечары 3 мая ўрачыста ўзнагародзяць пераможцаў 14-га нацыянальнага конкурсу «Залатая Літара».

— Нягледзячы на тое, што многія друкаваныя СМІ ператварыліся ў мультымедыйныя цэнтры і выйшлі ў інтэрнэт, цікавасць да конкурсу год ад году павышаецца, — адзначыла **начальнік інфармацыйна-аналітычнага ўпраўлення Міністэрства інфармацыі Таццяна ХМЕЛЬ**. — Мы атрымалі 260 работ, якія журы ацэніць у 23 намінацыях.

**Алена КРАВЕЦ, Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

■ Камунальныя стасункі

# ШЧЭПКІ, ТОРФ І АДХОДЫ ЗАМЕСТ ГАЗУ

**Энергазберажэнне — гэта яшчэ адна крыніца энергіі, не танная, аднак вельмі эфектыўная. Так лічаць спецыялісты, якія расказалі пра асаблівасці і перавагі працы кацельных на мясцовых відах паліва (МВП). Яны дазваляюць знізіць выкарыстанне імпартных энергарэсурсаў за кошт спальвання мясцовай прадукцыі: шчэпак, торфу і нават адходаў ад лушчэння зерня.**



Калі параўноўваць віды паліва па сабекошце, то самы танны — шчэпкі. Менавіта іх з паслянага выкарыстоўваюць з канца снежня 2017-га на кацельнай у Старых Дарогах. Два катлы аб'екта магутнасцю па 7 МВт працуюць для ацяплення жыллёвага фонду і іншых арганізацый, а кацёл магутнасцю 3 МВт разлічаны на гарачае водазабеспячэнне ў міжсезонны перыяд.

— Выкарыстанне шчэпак дапамагае замяшчаць імпартныя віды паліва, а лясістасць, якая ў Старадарожскім раёне складае 52 %, дазволіць цалкам закрываць уласнымі сродкамі паліўныя патрэбы кацельнай, — расказаў **Уладзімір ЖАЛДАК, галоўны інжынер КУП «Старадарожская ЖКГ».** — Сабекошт адной гігакалорыі з выкарыстаннем прыроднага газу складае крыху больш за 75 рублёў, а з прымяненнем МВП — 74,25 рубля. Тым што эканамічны эфект ад замяшчэння газу шчэпкамі за два месяцы склаў 228,8 тысячы рублёў.

Аб'ект абышоўся ў 8,8 млн рублёў. Мяркуецца, што ён акупіцца праз сем гадоў.

Кацельная на адходах ад лушчэння зерня, якія атрымліваюцца падчас яго сушкі і перавозкі, працуе на патрэбы Слуцкага камбіната хлебапрадуктаў. На будаўніцтва кацельнай спатрэбіўся 1 млн рублёў. Цяпер тут расходуюць 316 кг незвычайнага паліва за гадзіну або 7,5 тон за суткі, каб забяспечыць камбінат ацяпленнем і гарачай вадой і, адпаведна, знізіць спажыванне на гэтыя мэты прыроднага газу.

— Штогод каля 1000 тон адходаў ад лушчэння зерня мы захоўвалі на палігоне, на што выдаткоўвалі 5000 рублёў. Выкарыстоўваючы іх у якасці паліва, за сакавік мы выпрацавалі 750 Гкал цеплаэнергіі, што знізіла расход газу на 43 тысячы м³ і дазволіла сэканоміць амаль 30 тысяч рублёў, — падзяліўся **Сяргей ГАЛОЦІК, галоўны інжынер Слуцкага камбіната хлебапрадуктаў.**

А вось у вёсцы Рудаўка, што ў Нясвіжскім раёне, больш мэтазгодна было стварыць кацельную на фрэзерным торфе. Яна пачала працаваць у канцы 2017-га і каштавала крыху больш за 2,5 млн рублёў.

— Лясістасць у Нясвіжскім раёне толькі 9 %, а фрэзерны торф знаходзіцца за дзевяць кіламетраў ад кацельнай, так што дастаўка да месца мінімальная, — растлумачыў рашэнне **Аляксандр ЖУК, дырэктар РУП «Нясвіжская ЖКГ».** — Мяркуем, што за год працы кацельнай удасца замясціць МВП 1 млн м³ газу або 1150 тон умоўнага паліва, а доля МВП вырасце з 17,8 % да 31 %.

Акрамя таго, як запэўніваюць камунальнікі, абапіраючыся на праліченыя за тры месяцы работы кацельнай паказчыкі, чакаецца, што сабекошт адной гігакалорыі паменшыцца на 25 %. Згатаваная на газе гэта адзінка каштавала ў 116 рублёў, а на торфе яна абыдзецца ў 88 рублёў.

**Ірына СІДАРОК** ■

■ Сітуацыя

# ГУЛЯЛА З САБАКАМ — АПЫНУЛАСЯ ЗА МЯЖОЙ

Неардынарная сітуацыя адбылася на беларуска-польскай мяжы ў канцы мінулага тыдня. Брэсцкія памежнікі атрымалі ад польскіх калег інфармацыю, што на нашай тэрыторыі можа знаходзіцца грамадзянка Польшчы. Памежны нарад накіраваўся па арыенціроўцы, і неўзабаве вайскоўцы знайшлі маладую жанчыну, якая была мокрая і ўся дрыжала ад холаду.

Як паведаміў афіцыйны прадстаўнік Брэсцкай пагранічнай групы Сяргей Дзмітрыеў, 31-гадовая «госця» нашай краіны не планавала парушаць мяжу, яна гуляла з сяброўкай і сабакам на беразе Буга. Але яе лабрадор скокнуў у ваду, а потым не змог сам выбрацца. Гаспадыня перадала сяброўцы тэлефон і дакументы, кінулася ратаваць любімца. У выніку сабака неяк выбраўся на сваёй тэрыторыі, а жанчыну моцнае цячэнне падхапіла і вынесла ўжо на беларускім боку.

Вартавыя мяжы аказалі ёй дапамогу. Але і пратакол склалі, бо рэжым мяжы яна ўсё ж такі парушыла. Пасля гэтага прасушаную і адагрэтую грамадзянку суседняй краіны адправілі дадому.

**Святлана ЯСКЕВІЧ** ■


Паритетбанк

www.paritetbank.by

**Информация об открытом акционерном обществе «Паритетбанк» и его деятельности по состоянию на 01.01.2018 г. (место нахождения общества: г. Минск, ул. Киселева, 61а)**

Доля государства в уставном фонде эмитента – 99,8362 (всего в процентах).

| Вид собственности | Количество акций, штук | Доля в уставном фонде, % |
|---|---|---|
| Республиканская | 219 960 302 765 | 99,8324 |
| Коммунальная – всего | 8 492 575 | 0,0038 |
| В том числе: областная | 0 | 0 |
| районная | 0 | 0 |
| городская | 8 492 575 | 0,0038 |

**Информация о дивидендах и акциях**

| Наименование показателя | Единица измерения | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Количество акционеров, всего | лиц | 2535 | 2566 |
| в том числе юридических лиц | лиц | 159 | 193 |
| из них нерезидентов Республики Беларусь | лиц | 2 | 2 |
| в том числе физических лиц | лиц | 2376 | 2373 |
| из них нерезидентов Республики Беларусь | лиц | 10 | 10 |
| Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде | тысяч рублей | 1828.83 | 925.88 |
| Фактически выплаченные дивиденды в данном отчетном периоде | тысяч рублей | 1828.83 | 925.88 |
| Дивиденды, приходящиеся на одну простую (обыкновенную) акцию (включая налоги) | рублей | 0.0000083 | 0.0000042 |
| Дивиденды, приходящиеся на одну привилегированную акцию (включая налоги) | рублей | 0.000048 | 0.000048 |
| Дивиденды, фактически выплаченные на одну простую (обыкновенную) акцию (включая налоги) | рублей | 0.0000083 | 0.0000042 |
| Дивиденды, фактически выплаченные на одну привилегированную акцию (включая налоги) | рублей | 0.000048 | 0.000048 |
| Период, за который выплачивались дивиденды | месяц, квартал, год | 2016 год | X |
| Дата (даты) принятия решений о выплате дивидендов | число, месяц, год | 27.03.2017 | X |
| Срок (сроки) выплаты дивидендов | число, месяц, год | в бюджет 22.04.2017 остальным 24.05.2017 | X |
| Количество акций, находящихся на балансе общества, – всего | штук | 78782526 | |

Среднесписочная численность работающих (человек): 479.

Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено 20 и более процентов выручки от реализации товаров, продукции, работ, услуг (только в составе годового отчета): деятельность коммерческих банков.

Дата проведения годового общего собрания акционеров, на котором утверждены годовой отчет, бухгалтерский баланс, отчет о прибылях и убытках за отчетный 2017 год: 27.03.2018.

Сведения о применении открытым акционерным обществом Свода правил корпоративного поведения (только в составе годового отчета):

разработаны и утверждены локальные нормативные акты: регламент работы с реестром владельцев ценных бумаг; положение о наблюдательном совете; положение о ревизионной комиссии; о порядке учета аффилированных лиц ОАО «Паритетбанк» и согласования сделок, в совершении которых имеется заинтересованность аффилированных лиц; положение о комитете по рискам, положение об аудиторском комитете.

Адрес официального сайта открытого акционерного общества в глобальной компьютерной сети интернет www.paritetbank.by.

Телефон для справок (8017) 237 76 79.

Лицензия на осуществление банковской деятельности Национального банка Республики Беларусь от 27 октября 2014 № 5. УНП 100233809

**РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении открытого аукциона по продаже здания магазина, принадлежащего ОАО «Дабрабыт»**

Лот № 1. Здание магазина, с инв. № 621/С-1026890. Адрес: Минская обл., Несвижский р-н, г. Несвиж, ул. Ленинская, 115/7. Назначение: здание специализированное розничной торговли. Г. п. – 1986. Этажность – 1. Общая площадь – 44,10 кв. м.

**Начальная цена – 12 100,00 бел. руб. с учетом НДС 20 %.**
**Задаток – 1 210,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %**

ЗЕМЕЛЬНЫЙ УЧАСТОК

Земельный участок площадью 0,0495 га с кадастровым номером 624250100001004653. Целевое назначение – земельный участок для обслуживания здания магазина. На праве постоянного пользования.

Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с законодательством Республики Беларусь

ОБРЕМЕНЕНИЯ

Часть здания находится в аренде (25,40 кв. м по 31.03.2020)

УСЛОВИЯ АУКЦИОНА

1. Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов), – Претендент на покупку должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.
2. Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен оплатить стоимость приобретенного на аукционе Объекта Продавцу в течение 10 (десяти) календарных дней после подписания договора купли-продажи.
3. Победитель аукциона (Претендент на покупку) оплачивает Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
4. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством для Победителя аукциона

**Аукцион состоится 28.05.2018 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.

Задаток перечисляется нар/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, 220004, ул. Кальварийская, д. 4а, BIC банка BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества ОАО «Дабрабыт», проводимом 28 мая 2018 г.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений 24.05.2018 в 11.00. Организатор аукциона или Продавец вправе снять лот с торгов до объявления его проданным без объяснения причин снятия.

Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектом. Контактное лицо для осмотра Объекта – Скачко Антонина Владимировна, тел. +375 (29) 692 54 06

**Организатор аукциона: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by• e-mail: torgi@ino.by**

# ГОД МАЛОЙ РАДЗІМЫ.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**Анатоль БУТЭВІЧ:** — ***Трэба прызнаць, што і да абвяўлення Года малой радзімы было шмат карысных спраў, якімі людзі ўшаноўвалі сваю Бацькаўшчыну. Часта гэта рабілася на рэгіянальным узроўні, не заўсёды аб'яднанымі сіламі. Але цяпер, калі абвешчаны такі год, мы можам нешта зрабіць разам. Хоць гэтая тэма ніколі не была забытай — ні краязнаўцамі, ні мясцовымі жыхарамі, ні журналістамі. Варта адзначыць, што Беларусь заўсёды была сельскай краінай. І вясковы стыль жыцця — самы звыклы для нашых суайчыннікаў. На жаль, за апошні час многія пераехалі ў гарады, адарваўшыся ад каранёў. Аднак адбываецца і адваротны працэс: людзі разумеюць, што мегаполіс — гэта не панацэя, і цяпер часам, наадварот, з вялікіх гарадоў з'язджаюць у маленькія вёсачкі і робяць там важныя справы.***

## Шыльда ў памяць пра Алеся Белакоза

**Павел СУХАРУКАЎ:** — Я крыху больш за год з'яўляюся мінчанінам. Часам шукаю карэнных жыхароў сталіцы — хоць бы ў трэцім ці чацвёртым пакаленні — і не знаходжу. Усе мы родам з малой радзімы. Асабіста я — з Мастоў, пасля пераехаў у Гродна, цяпер жыву ў сталіцы. Але любоў да родных мясцін заўсёды будзе ў маім сэрцы. І калі з'явіца нагода ці патрэба, я з задавальненнем вярнуся ў Масты.

Тое, што гэты год абвешчаны Годам малой радзімы, сведчыць пра ўвагу дзяржавы да названай тэмы. Таму было б добра распрацаваць пэўную дзяржаўную праграму. Тым не менш усё ідзе ад чалавека. Зноў прыгадваючы Мастоўшчыну, безумоўна, успамінаю Алеся Белакоза. Яго постаць пацвярджае, як шмат можа зрабіць адзін чалавек — у гэтым выпадку звычайны настаўнік. Ён шмат зрабіў не толькі для сваёй вёскі, але і для цікавасці ў першую чаргу моладзі да сваёй малой радзімы. І зараз, калі яго ўжо няма, Гудзевічы з'яўляюцца цэнтрам развіцця краязнаўства. Ён стварыў там два музеі — краязнаўчы і музей беларускага ткацтва. У гэтых музеях я бываў не раз, не два і нават не дзесяць... Да апошняга дня Белакоз заставаўся верным сваёй справе і рабіў музеі яшчэ лепшымі. Гэтую хвалю цікавасці людзей да родных мясцін і імкненне зрабіць нешта канкрэтнае мы павінны падтрымаць.

**Анатоль БУТЭВІЧ:** — ***Карыстаючыся нагодай, давайце зробім прапанову ўстанавіць мемарыяльную дошку на той школе, дзе працаваў Алесь Белакоз і дзе стварыў два музеі. Гэта асоба сапраўды заслугоўвае такой увагі. Папершае, гэта будзе добрай памяццю пра чалавека. А па-другое, стане карысным тым людзям, якія прыязджаюць і якія працавалі разам з ім.***

## «Славутыя імёны Бацькаўшчыны»

**Уладзімір Гілеп:** — Адметных асоб з ліку землякоў абавязкова трэба ўшаноўваць! Гэта робіцца і ў «Краязнаўчай газеце»: літаральна з першага нумара тэмы малой радзімы і славутых імёнаў Бацькаўшчыны займаюць трывалае месца на яе старонках. Падпісчыкамі выдання з'яўляюцца не толькі краязнаўцы, яе выпісваюць і ў музеях, бібліятэках, на жаль, мала ў нашых школах.

Менавіта з пачатку новага тысячагоддзя Беларускі фонд культуры распачаў праграму «Славутыя імёны Бацькаўшчыны». Мы адраджаем імёны выдатных, але часта малавядомых ураджэнцаў беларускай зямлі. Калі вярнуцца на 20 гадоў назад, прыгадайце, ці згадваліся імёны Якуба Наркевіча-Ёдкі, Канстанціна і Міхала Ельскіх, Напалеона Орды, сямейства Ходзькаў, Аляксандра Скірмунта, Канстанціна Астрожскага і многіх іншых?.. Толькі-толькі на слых з'яўляліся імёны Радзівілаў і Сапегаў. За гэты час мы з вялікай насцярогай пачалі лічыць сваімі землякамі Адама Міцкевіча, Станіслава Манюшку, Соф'ю Кавалеўскую, род Шастаковічаў. Усе гэтыя прозвішчы ўвайшлі ў першыя 2 тамы «Славутых імёнаў Бацькаўшчыны», выдадзены Беларускім фондам культуры яшчэ да з'яўлення першага нумара «Краязнаўчай газеты». Менавіта праз знакамітых суайчыннікаў «Краязнаўчая» выйшла на тэму родных мясцін. Малая радзіма і імёны, якія яна нарадзіла, — гэта тая літара «аз», з якой пачынаецца Айчына. Уявіце, колькі ўсяго нам трэба ўвасрэсіць на шляху ад «аз» да «яць»! Тое, што зроблена — гэта толькі разведка. Краязнаўцы ведаюць, што разведка часта праходзіць з боем.

А што далей?.. Застаецца зусім не рытарычным пытанне, чым асабіста ты дапаможаш малой радзіме? Падтрымліваю Паўла Сухарукава ў тым, што нам патрэбна доўгатэрміновая праграма, прысвечаная малой радзіме. З 1980-х гадоў мы выдавалі кнігу «Памяць». Сама ідэя выдання давалася цяжка. Яна нарадзілася ў аддзеле культуры Цэнтральнага камітэта кампартыі Беларусі — і вельмі хутка была падтрымана на месцах: краязнаўцамі, бібліятэкарамі, музейшчыкамі. Аднак выданне не падтрымалі ў ЦК КПСС. Калі мы павезлі першую кнігу «Памяць» Шумілінскага раёна яшчэ ў рукапісе, каб узгадніць, сакратар ЦК Міхаіл Зімянін сказаў нам: «Не! Вы што, хочаце быць наперадзе Расіі? Хочаце апярэдзіць Украіну? Знайце сваё месца, беларусы». Едучы назад, сакратар ЦК КПБ Аляксандр Кузьмін першы раз не пагадзіўся з рэкамендацыямі цэнтральнага ЦК, ён сказаў: «Мы будзем рабіць гэту кнігу». У кожным раёне былі створаны спецыяльныя групы, былі людзі (і ў першую чаргу — краязнаўцы), якія працавалі над напаўненнем выданняў «Памяці» — унікальнай мемарыяльнай энцыклапедыі кожнага раёна Беларусі.



Павел СУХАРУКАЎ.



Уладзімір ГІЛЕП.



Тадэвуш СТРУЖЭЦКІ.



Анатоль БУТЭВІЧ.

Сёння краязнаўцы часта звяртаюцца ў нашу газету з патрабаваннем прадоўжыць працу над кнігай «Памяць», бо ёй патрэбны дапаўненні. Мне гэта ідэя падаецца слушнай. І, магчыма, сёння няма патрэбы ствараць спецыяльную камісію, бо нашымі краязнаўцамі ў бібліятэках назапашаны велізарны матэрыял. На іх падставе нават рэдакцыяй Беларускай энцыклапедыі атрымаецца зрабіць «Славутыя імёны Бацькаўшчыны» выдатным дапаўненнем да кнігі «Памяць».

## Да традыцый вясковага насельніцтва

**Тадэвуш СТРУЖЭЦКІ:** — З нашай памяццю непарыўна звязана і тэма пакінутых вёсак. Гэта з'яўляецца грамадска-палітычнай праблемай, якая абвастралася і фарміравалася на працягу многіх дзесяцігоддзяў. Давайце прыгадаем хоць бы неперспектыўнасць і неперспектыўнасць сельскага «бяспашпартнага» жыцця ў 1950—1970-я гады, афіцыйна вызначаных «неперспектыўных вёсак» і ўзбуйненне населеных пунктаў — у 1980—1990-я гады. У пазнейшыя часы вялікае жаданне людзей займацца фермерствам стрымлівалася — а гэта акурат магло б ажывіць вёскі, якія паміралі. Эпізадычна ўзнікалі і праблемы аптымізацыі — сацыяльна-культурныя ўстановы ў вёсках мэтава скарачаліся — агулам іх колькасць зменшылася амаль у два разы. Не хочацца гэтую праблему зводзіць да шэрагу маральна-настальгічных, але найперш трэба бачыць яе існуючай праблемай. Да таго ж мы маем у свеце адзін з самых высокіх паказчыкаў зніжэння колькасці сельскага насельніцтва.

Думаю, для выпраўлення такой сітуацыі патрэбны важныя крокі як з боку грамадства, так і з боку дзяржавы. Апошняя павінна ствараць умовы для фарміравання новых працоўных месцаў, для паляпшэння вясковай інфраструктуры, для аднаўлення дарог. Грамадству неабходна захоўваць памяць пра вясковыя традыцыі, удзельнічаць у аднаўленні. Тады сапраўды вымалюецца логіка змен і будзе відаць перспектыва. Краіна ў цэлым і кожны канкрэтны чалавек павінны бачыць задачы, якія стаяць перад імі непасрэдна. Тады мы атрымаем сістэму, якая прывядзе да карэнных зрухаў. Вядома, у Год малой радзімы мы не зможам вырашыць усе праблемы. Затое зможам іх вылучыць, абазначыць і скіраваць увагу і дзяржавы, і грамадства на іх вырашэнне.

## Сістэма краязнаўства

**Ігар ПРАКАПОВІЧ:** — Я прадстаўляю Пастаўшчыну і Мядзельшчыну і на праблему гляджу са свайго рэгіёна. Я займаўся тэорыяй школьнага краязнаўства і распрацоўваў яго сістэму, таму спрабаваў уявіць, як яна будзе выглядаць у межах дзяржавы. У высокаразвітых краінах праводзіцца спецыяльная рэгіянальная палітыка. Таму грамадства, натуральна, павінна падштурхоўваць дзяржаву, каб прымаліся нейкія канкрэтныя захады да развіцця рэгіёнаў. У Беларусі пятая частка насельніцтва жыве ў сталіцы. І многія нашы вучні, скончыўшы гімназію, імкнуцца паступіць у ВНУ ў Мінску і застацца працаваць у сталіцы — натуральна ж, гэта анамальная з'ява. Прыгадваецца Дзісеншчына — мяжа Пастаўскага і Браслаўскага раёнаў —у 1970-х гадах. Калі ўзяць карту таго часу, то відаць, што існаваў так званы вясковa-местачковы мегаполіс. Вёска ішла следам за вёскай — можна было доўга ехаць уздоўж іх. Цяпер на тых месцах даводзіцца прамінаць толькі могілкі, жывых вёсак амаль няма. Аднак гэта сацыяльная праблема, а мы, я думаю, павінны ісці іншым шляхам. Прапаную разглядаць краязнаўства ў двух ракурсах. Першы — як даследаванне, вывучэнне роднага краю: краязнаўцы разам з вучнямі, сябрамі займаюцца пошукам важных матэрыялаў. Натуральна, што не ўсе навукоўцы даедуць да аддаленых рэгіёнаў, таму краязнаўцы з'яўляюцца спецыялістамі ў вялікіх сферах. На Пастаўшчыне мы стараемся збіраць матэрыял па тэмах, напрыклад па асобах, і затым выдаваць яго. Другі акурс — асветная дзейнасць на тэрыторыі раёна ці на тэрыторыі ўсёй Беларусі.

Не ўсе ведаюць, што на Пастаўшчыне калісьці была школа парфорснага палявання. Як і не ўсе ведаюць, нават у музеі, што гэта за паляванне. Таму я вырашыў заняцца гэтай тэмай, выпусціў адпаведную брашуру. А зараз у музеі мы ўжо маем выстаўку, прысвечаную парфорснаму паляванню. Тэму Першай сусветнай вайны таксама я пачынаў практычна першым. У 1990-я гады разам з вучнямі мы шукалі звесткі, фіксавалі іх, рабілі пазнакі на картах — месцаў пахаванняў і вайсковых умацаванняў. З'яўляліся публікацыі, выйшла кніга. А ў наш час у Паставах ёсць і музейная экспазіцыя, прысвечаная Першай сусветнай вайне, плануецца стварыць экспазіцыю пад адкрытым небам. Дзейнічае валанцёрская арганізацыя «Заходні рубеж», якая займаецца аднаўленнем закінутых помнікаў не толькі расійскіх, але і нямецкіх салдат. Важна, што збор матэрыялаў краязнаўцамі потым выліваецца ў пэўную канкрэтную дзейнасць. Яна можа быць прадстаўлена як грамадскімі, так і дзяржаўнымі арганізацыямі. А гэта, у сваю чаргу, дапамагае развіваць турыстычны патэнцыял рэгіёна.

## Памяці зніклых вёсак

**Ігар ПРАКАПОВІЧ:** — Што датычыцца памяці пра зніклыя вёскі, хочацца згадаць у якасці прыкладу вёску Рымкі Пастаўскага раёна. Там стаіць царква, але няма ніводнага жыхара. Мы напісалі і выдалі кнігу пра вёску, прапанавалі некаторыя ідэі надання ёй новага жыцця. Вёска знаходзіцца ў міжрэччы, дзе сутыкаюцца тры ракі, дарогі там ніколі не было. Можа быць, калі праклаці дарогу, зрабіць мост праз Дзісну, пайшоў бы пэўны рух, у вёску нехта вярнуўся б... Аднак на сённяшні дзень гэта нерэальна, бо вельмі дорага. Другі варыянт — запрасіць туды на пасяленне некалькі манахаў — аднак ахвотных пакуль таксама не знайшлося.

У вёсцы Хрыстова ёсць мясцовы жыхар па прозвішчы Татаранка. Ён за свой кошт вырабляе шыльды з назвамі вёсак, якія зніклі, і ставіць іх у тых месцах, дзе яны былі. Такое своеасаблівае ўшанаванне памяці.

**Анатоль БУТЭВІЧ:** — ***Аналагічны прыклад мы маем у Вілейскім раёне. Колькі гадоў таму там была праведзена акцыя па ўшанаванні зніклых вёсак — кожнай з іх быў зроблены памятны знак. Аднак працэс знікнення вёсак сёння ўсё адно працягваецца... Забыцца на памяць невялікіх населеных пунктаў мы не можам. Што рабіць, каб не занядбаць?***

**Ігар Пракаповіч:** — Мы пішам гісторыю вёсак. Асабіста я падбухтораю знаёмых краязнаўцаў — імі апісана дзесьці 15 вёсак. Часам гэтым займаюцца мясцовыя жыхары. А інфармацыі сабраць даводзіцца сапраўды шмат: людзі там жылі, нешта стваралі — нават апісаць толькі вырабы, якія яны рабілі сваімі рукамі, не так проста. Іншае пытанне, як гэта ўсё захаваць.

**Анатоль БУТЭВІЧ:** — ***Найперш актуальным падаецца запіс успамінаў. Калі хтосьці сам не можа іх занатаваць, то варта абазнаным людзям браць мікрафон, ехаць у мясцовасць і фіксаваць, проста каб такія згадкі засталіся. Прыйдзе час, і нехта іх расшыфруе, выкладзе, напрыклад, у інтэрнэт, бо гэта важная на сёння крыніца інфармацыі. Важна, каб былі зафіксаваны словы тых людзей, якія бачылі ўсё на свае вочы, каб не атрымаліся ўспаміны з успамінаў... Гэта таксама вялікае поле для дзейнасці.***

**Алесь ХІТРУН:** — Я ўжо не адзін год займаюся зборам успамінаў. Выкарыстоўваю аўдыя-, відэазапісы. Дзякуючы гэтым сучасным сродкам удаецца захаваць нават гаворку, мясцовыя дыялекты. Два гады таму я прымаў удзел у конкурсе газеты «Звязда» пад назвай «Мясціны, знітаваныя з душой» і выйшаў у пераможцы. Хачу падзяліцца гісторыяй маёй краязнаўчай знаходкі. Аднойчы я ехаў праз вёску ў нашай мясцовасці, дзе цяпер жывуць толькі людзі сталага ўзросту. Я накіраваўся туды як прадстаўнік музея, а маёй мэтай было распытаць жыхароў пра іх жыццё. Адна бабуля не хацела пускаць нават на падворак, відаць, была нечым ці некім напалоханая, але мне ўсё-такі ўдалося яе супакоіць. На двары ўбачыў дзядулю, якому было больш за 90 гадоў, ён сек дровы. Я прапанаваў выканаць гэтую працу за яго, сам зрабіў усё. Яны запыталіся, што хачу ўзамен, а я адказаў, што толькі пачуць іх успаміны... Дзед і бабця

# ДЗЕЙНАСЦІ ГОД



Ігар ПРАКАПОВІЧ.



Таццяна ПЯТРОВА.



Павел КАРАЛЁЎ.



Алесь ХІТРУН.

раскрыліся, усё расказалі. А калі выйшла публікацыя, я патэлефанаваў бабулі, пачуў, як яна смяецца і плача... На пытанне, што адбылося, старая адказала, што задаволена выхадам матэрыялу, але дзядуля яе памёр. Мне ўдалося паспець — і запісаць сведчанне яго жыцця.

## Што рабіць для захавання

**Алесь ХІТРУН:** — Мяркую, што сёлета, у Год малой радзімы, было б добра правесці раскопкі ў маёй роднай вёсцы Крупава. Ёсць інфармацыя, што пад тратуарнай пліткай каля вясковай крамы пахавана звыш 30 вайскоўцаў — і амаль ніхто пра гэта не ведае. Успаміны пра тое захаваліся толькі ў адной бабулі, якая ўдзельнічала ў перазахаванні з суседняга вясковага поля ў 1951—1952 гадах.

Вёска Крупава вядомая і дзякуючы Ігнату Дамейку. Летась мы адзначалі 215 гадоў з дня яго нараджэння, здзейснілі адпаведнае памятнае падарожжа, там была праведзена расчыстка і добраўпарадкаванне тэрыторыі. Я працягваю збіраць інфармацыю пра гэтага дзеяча, штосьці будзе змешчана ў часопісе «Лідскі летапісец». Гэта выданне з электронным адрасам pawet.net вядомае і за межамі раёна дзякуючы яго стваральніку — актыўнаму краязнаўцу Леаніду Лаўрэшу.

У Лідскім гісторыка-мастацкім музеі распрацавана шмат мерапрыемстваў да Года малой радзімы. У тым ліку цэлыя праекты, такія як «Гісторыя адной хаты» пра людзей з вёсак Лідскага рэгіёна і самога горада, якім патрэбна дапамога і якія захоўваюць шмат цікавага з мінуўшчыны. Яшчэ адзін праект «Любі, браток, родны куток!» — гэта сустрэчы з землякамі, якія выехалі за межы Лідчыны і нашай краіны. Дзякуючы такім праектам мы зможам сабраць шмат цікавых звестак і папоўніць фонды музея.

**Тадэвуш СТРУЖЭЦКІ:** — Яшчэ ў 2016 годзе ў «Краязнаўчай газеце» быў надрукаваны артыкул «Захаваем і ўшануем малую радзіму», у якім мы звярталіся да чытачоў, у тым ліку да краязнаўцаў, з просьбай далучыцца да гэтага праекта. Мы прапаноўвалі і магчымыя кірункі дзейнасці па ўшанаванні памяці сваёй мясцовасці.

Што рабіць для захавання памяці невялікіх населеных пунктаў? Як і прапаноўвалася раней, для гэтага можна складваць ілюстраваныя карты мясцовасцяў, зніклых і існуючых, з кароткімі даведкамі і датамі іх заснавання. Варта ўсталёўваць памятныя знакі, дошкі, капліцы, прысвечаныя гістарычным падзеям і вядомым людзям, выхадцам з гэтых мясцін. Прыклады такой працы, натуральна, ёсць, але яна павінна праводзіцца сістэмна. Трэба яскрава абазначаць мясцовыя аб'екты гісторыка-культурнай спадчыны. Добры крок — стварэнне мясцовых дабрачынных фондаў, да прыкладу тых, што створаны ў Любчы і Шчорсах Навагрудскага раёна, і збор сродкаў на аднаўленне пэўных аб'ектаў... Варта праводзіць экспедыцыі для запісвання гісторый, збору ўспамінаў старэйшых жыхароў, пра што ўжо казалася за круглым сталом. Актуальнай падаецца і распрацоўка турыстычных брэндаў на базе цікавых мясцовых аб'ектаў, традыцый, народных калектываў. Сярод прыярытэтаў — і стварэнне этнаграфічных музеяў, экспазіцый у вясковых бібліятэках і музеях, школах — адпаведныя прыклады таксама ёсць, але нельга сказаць, што паўсюль. Варта ствараць і мясцовыя грамадскія аб'яднанні ў форме зямляцтваў, збіраючы разам ураджэнцаў гэтай мясцовасці.

## «Насыціць» жыццё рэгіёнаў

**Таццяна ПЯТРОВА:** — Захаванне малой радзімы залежыць у першую чаргу ад таго, наколькі яна будзе засвоена яе жыхарамі. Адзін з балючых прыкладаў апошняга часу — пашкоджанне брамы Радзівілаў у Лідскім раёне. Гэты аб'ект, на жаль, не мае статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці, таму няма і дзейсных рычагоў для яго захавання... Мне падаецца адчувальным тое, што ў школах цяпер мала краязнаўства. Дзецям не хапае ведаў пра іх радзіму: яны яшчэ могуць усведамляць, што знаходзіцца ў бліжэйшым горадзе, а вось у раёне — наўрад ці. Таму важна, каб у школе вялася належная адукацыя, каб урокі гісторыі не абмяжоўваліся агульнай гісторыяй. Трэба, каб хоць бы раз на тыдзень дзеці знаёміліся з гісторыяй малой радзімы, наведвалі знакавыя месцы, каб удзельнічалі ў суботніках у касцёлах, цэрквах, на рэштках сядзіб. Трэба разумець, што кожны камень у такім месцы нясе ў сабе індэкс нашай ідэнтычнасці. Каб захаваць ідэнтычнасць, трэба захоўваць і павагу да аб'ектаў-носьбітаў.

У 2015 годзе «Гісторыка» ладзіла фэст у гарадскім пасёлку Мір пад назвай «Я малюю гісторыю». Падчас экскурсіі мы паказвалі, што Мір — гэта не толькі замак. Дзеці малявалі касцёл Святога Мікалая — і мы падкрэслівалі, што гэта не проста месца сустрэчы вернікаў, але спадчына Мікалая Радзівіла Сіроткі... А потым мясцовыя жыхары галасавалі за тыя малюнкі, якія ім спадабаліся найбольш. Найлепшыя шэсць прац мы надрукавалі на календарыках, якія раздалі ўдзельнікам. Вы б бачылі, якімі радаснымі былі дзеці!.. І гэта таксама шлях засваення гісторыі нашай спадчыны. Я перакананa, што кожны помнік, нават калі яму не нададзены адпаведны афіцыйны статус, каштоўны. Таму перад тым як нешта разбурыць, знесці, намаляваць графіці, мы павінны ўсвядоміць, што кожны камень, які нясе гісторыю, значны.

Адукоўваць людзей трэба з дзяцінства. Як, напрыклад, у Шчучынскім раёне некалькі гадоў таму ладзіліся экскурсіі «Шляхамі продкаў» — маршруты па раёне. Такую акцыю праводзіў раённы метадычны цэнтр народнай творчасці. Дзеці з навакольных населеных пунктаў запісваліся на экскурсіі і ездзілі проста па сваёй мясцовасці. Вядома, важна зазірнуць і ў вобласць, і ў сталіцу. Але найперш важна насыціць жыццё рэгіёнаў такімі адукацыйнымі праграмамі.

**Павел КАРАЛЁЎ:** — Як я разумею, акрэслена некалькі праблем. З аднаго боку, «праблема зверху» ў тым, што населеныя пункты занепадаюць, знікаюць з картаў. А «праблема знізу» ў тым, што людзі не ведаюць, што знаходзіцца побач. Дзе ж ключ да вырашэння?.. Прыгадваецца і любімае мною Сёмкава, што непадалёк ад Мінска. Я там некалькі гадоў працаваў над аднаўленнем сядзібы. Нядаўна там пабудавалі пару чатырох-, пяціпавярховых дамоў — і людзі, што працуюць у Свята-Елісавецінскім манастыры, атрымалі ў іх жыллё. Мяне запрасілі правесці там экскурсію для мясцовых жыхароў, якія толькі засяліліся. Людзі прыйшлі разам з дзецьмі, і я прызнаўся, што крыху зайздрошчу ім, што яны засяліліся ў такое прыгожае месца, — я і сам хацеў бы там жыць, але не атрымалася. Правёў экскурсію — і рэакцыя на яе была каласальнай. Людзі ўжо чакаюць наступнай экскурсіі і плануюць у яе межах, з нагоды Фэсту экскурсаводаў, правесці там прыборку. Адна жанчына сказала цікавыя словы: «Я ўпершыню сустрэла чалавека, які зайздросціць, што мы жывём тут, што тут такая гісторыя...» Раней яна чула пра гэта месца зусім адваротнае і нарэшце сустрэла чалавека з такім поглядам. Таму мне падаецца важным паказаць і ўзбагаціць людзей ведамі пра іх мясцовасць.

На жаль, краязнаўцамі часта пагарджаюць, бо яны звычайна нешта просяць, патрабуюць, адстойваюць, робяць за свае грошы. Таму было б добра ў «Звяздзе» рэгулярна друкаваць невялікія артыкулы пра людзей з пэўных мясцовасцяў і пра тое, што яны зрабілі, што змянілі, што пасунулі. Бо такіх прыкладаў вельмі шмат! Зрабіць так званую «Галерэю герояў малой радзімы».

Было б добра пры Беларускім фондзе культуры стварыць каардынацыйны савет па рэгіёнах, які мог бы наладжваць работу па аб'яднанні розных мясцовых ініцыятыў.

Я цалкам падтрымліваю ідэю Уладзіміра Гілепа наконт кнігі «Славутыя імёны Бацькаўшчыны». Згодны і з тым, што мусіць быць пэўная праграма, прысвечаная малой радзіме. Яе запачаткаваць можа грамадскасць, а падтрымаць — дзяржава. Той жа Фэст экскурсаводаў пачынаў праводзіцца і цяпер па-ранейшаму ладзіцца сіламі грамадскасці, але з часам ён увайшоў у дзяржаўную праграму «Гасцінная Беларусь».

Добра было б зрабіць каляровую кнігу, дзе б кожны раён прадставіў самую «сакавітую» інфармацыю пра сваю мясцовасць. Да яе могуць быць прыкладзены карты, у тым ліку зніклых населеных пунктаў (ці іх назвы). Варта апісаць і тыя фэсты, дзе віруе жыццё раёна. Стварыць такім чынам карыснае прэзентацыйнае выданне і распаўсюдзіць у рэгіёне.

Яшчэ адна мая ідэя — раздрукаваць улёткі і зладзіць акцыю, падчас якой падыходзіць да людзей, напрыклад у межах пэўных фэстаў, і запытваць пра іх малую радзіму? Слушна падзяліўся сваім назіраннем Павел Сухаракаў, што мінчан у Мінску пакуль так і не сустрэў. Большасць жыхароў сталіцы мае малую радзіму. І рознымі захадамі варта заахвоціць людзей задумацца, дзе іх малая радзіма, і скіравацца туды...

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**
**Фота Кастуся ДРОБАВА.**

■ Ёсць пытанне!

# КОМПЛЕКСНЫ АБЕД ЦІ ЭКСКЛЮЗІЎНАЕ МЕНЮ?

## Як паднесці спадчыну новаму пакаленню?

**«Ці ёсць такая прафесія — «спадчыну ахоўваць»?» — гэта толькі адно з пытанняў, якія прагучалі на круглым стале, арганізаваным беларускім камітэтам ICOMOS (Міжнароднай Рады па помніках і мясцінах).**

Традыцыйна ў другой палове красавіка нацыянальныя камітэты ICOMOS (а сёння іх больш за 150) ладзяць разнастайныя мерапрыемствы. Агульнай для ўсіх тэмай сёлета стала «Спадчына дзеля пакаленняў». Таму і ў Беларусі на круглым стале было вырашана звярнуць увагу і даць магчымасць выказацца менавіта маладым прафесіяналам, ад якіх у наступныя 10—20 гадоў будзе залежаць тое, якім чынам праходзіць ахова і рэстаўрацыя помнікаў. Але на сустрэчу былі запрошаны і больш сталыя эксперты. Да таго ж арганізатары мерапрыемства паспрабавалі сабраць за адным сталом прадстаўнікоў розных прафесій: рэстаўратараў, дызайнераў, даследчыкаў, культуролагаў, работнікаў сферы турызму.

Валанцёрскія летнікі ці пратэснае краязнаўства (калі моладзь выступае супраць руйнавання нейкіх гістарычных аб'ектаў) — гэта менавіта той шлях, які прывёў некаторых удзельнікаў сустрэчы ў галіну, звязаную з аховай спадчыны. Але, як адзначыў **экскурсавод Цімафей АКУДОВІЧ**, пакуль грамадская дзейнасць — гэта хутчэй імпульсіўныя дзеянні па асобных ініцыятывах. Часта маладым людзям не хапае пэўнага разумення, куды накіраваць высілкі, каб сапраўды было больш карысці. Па сутнасці, тыя ж летнікі па ачыстцы ад смецця больш спрыяюць выхаванню, але прынцыпова не вырашаюць пытанняў з захаваннем помнікаў. «Маніторынг аб'ектаў, адсочванне іх стану, пошукі варыянтаў іх выкарыстання не з пазіцыі пэўнага гаспадара, а шырокай грамадскасці, — гэта можа быць асобным відам дзейнасці. Але пакуль ахова помнікаў не стала прафесіяй (няхай і эксклюзіўнай), на якую можна вучыцца і ў якой зарабляць грошы», — заўважыў выступоўца. Можа, таму некаторыя маладыя людзі, якія хваляюцца пра захаванне спадчыны, калі перад імі ўстае пытанне аб тым, як пракарміць сям'ю, адыходзяць ад гэтай справы.

***Калі за справу бяруцца некампетэнтныя людзі, часам яны могуць нанесці шкоду, бывае і непапраўную.***

Удзельнікі дыскусіі заўважылі, што сёння трэба гаварыць не толькі пра матэрыяльнае разбурэнне помнікаў, але і маральныя праблемы. Напрыклад, нават у нашых суседзяў ва Украіне і Літве гістарычныя аб'екты імкнуліся нейкім чынам выкарыстоўваць. У нас жа часта спадчына аказвалася закінутай, непатрэбнай і, маладыя людзі, што выраслі побач з такімі помнікамі, часам не адчуваюць іх каштоўнасць. І прагучала думка, што магчыма крыху выправіць сітуацыю, калі памяняць нешта ў сістэме адукацыі, каб яшчэ ў школе новае пакаленне атрымлівала веды пра тое, што такое спадчына.

Але шмат пытанняў сёння існуе і да тых, каму даводзіцца працаваць з гістарычнымі аб'ектамі. Так, сёння на Беларусі многа рэстаўратараў, але не так проста разабрацца, хто з іх сапраўдны прафесіянал. І калі за справу бяруцца некампетэнтныя людзі, часам яны могуць нанесці шкоду, бывае і непапраўную. І ўжо не першы год уздымаецца пытанне аб неабходнасці стварэння атэстацыйнай камісіі. Калі ў маладых спецыялістаў не будзе магчымасці павысіць катэгорыю, у іх няма стымулу для развіцця. Яны мала ўсведамляюць, што павінны ўмець рабіць і да чаго трэба імкнуцца.

**Інжынер будаўніцтва, аматар гісторыі, архітэктуры Зміцер ТРАСКОЎСКІ** звярнуў увагу, што сёння нідзе не прапісана, якім чынам трэба займацца аховай канкрэтных аб'ектаў. Часта важна захаваць не толькі сцены пэўнага помніка, але і асобныя элементы. Напрыклад, даследуючы дах аднаго з гістарычных будынкаў, ён заўважыў на кроквах цяслярскія засечкі, зробленыя старадаўнімі майстрамі, — і такую дэталь важна будзе захаваць пры рэстаўрацыі. Таксама ён звярнуў увагу, што вельмі важна вызначыцца з функцыямі для таго аб'екта, які імкнёмся захаваць, каб праз 10—20 гадоў ён не стаў зноў незапатрабаваным.

Наогул, новаму пакаленню давядзецца яшчэ падумаць над тым, як выкарыстоўваць аднойчы выратаваныя аб'екты. Але яно не павінна забывацца, што за кожным помнікам заўсёды стаяць гісторыя, сюжэты. І трэба знайсці цікавыя хады, як гэта паднесці спажыўцу. Як заўважыў **гісторык Андрэй КІШТЫМАЎ**, раней турысту прапаноўвалі «комплексны абед» — падарожжа-знаёмства па пэўных аб'ектах архітэктуры, а сёння трэба працаваць ужо над «эксклюзіўным, шыкоўным рэстаранным меню» — і тады аб'екты нашай спадчыны будуць запатрабаванымі.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ** ■

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС

На 31 декабря 2017 года

| | |
|---|---|
| Организация | **ОАО «БЕЛБАКАЛЕЯ»** СВОД |
| Учетный номер плательщика | 100025653 |
| Вид экономической деятельности | оптовая торговля |
| Организационно-правовая форма | частная |
| Орган управления | Главное управление потребительского рынка Мингорисполкома |
| Единица измерения | тыс. руб. |
| Адрес | 220075, г. Минск, ул. Промышленная, 15 |

| Активы | Код строки | На 31 декабря 2017 года | На 31 декабря 2016 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | 110 | 10 419 | 10 864 |
| Нематериальные активы | 120 | 19 | 33 |
| Доходные вложения в материальные активы | 130 | 476 | 493 |
| в том числе: | | | |
| инвестиционная недвижимость | 131 | 476 | 493 |
| предметы финансовой аренды (лизинга) | 132 | - | - |
| прочие доходные вложения в материальные активы | 133 | - | - |
| Вложения в долгосрочные активы | 140 | | 17 |
| Долгосрочные финансовые вложения | 150 | 16 | 9 |
| Отложенные налоговые активы | 160 | - | - |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | 170 | 114 | 106 |
| Прочие долгосрочные активы | 180 | - | - |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **11 044** | **11 522** |
| **II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы | 210 | 3 012 | 5 064 |
| в том числе: | | | |
| материалы | 211 | 319 | 323 |
| животные на выращивании и откорме | 212 | - | - |
| незавершенное производство | 213 | - | - |
| готовая продукция и товары | 214 | 2 693 | 4 741 |
| товары отгруженные | 215 | - | - |
| прочие запасы | 216 | - | - |
| Долгосрочные активы, предназначенные для реализации | 220 | - | - |
| Расходы будущих периодов | 230 | 1 422 | 1 687 |
| Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам | 240 | 657 | 411 |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 4 919 | 6 298 |
| Краткосрочные финансовые вложения | 260 | - | - |
| Денежные средства и эквиваленты денежных средств | 270 | 68 | 58 |
| Прочие краткосрочные активы | 280 | - | |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **10 078** | **13 518** |
| **БАЛАНС** | **300** | **21 122** | **25 040** |

| Собственный капитал и обязательства | Код строки | На 31 декабря 2017 года | На 31 декабря 2016 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| Уставный капитал | 410 | 675 | 675 |
| Неоплаченная часть уставного капитала | 420 | - | - |
| Собственные акции (доли в уставном капитале) | 430 | - | - |
| Резервный капитал | 440 | 51 | 51 |
| Добавочный капитал | 450 | 12 624 | 12 656 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 460 | (4 717) | (4 212) |
| Чистая прибыль (убыток) отчетного периода | 470 | - | - |
| Целевое финансирование | 480 | - | - |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **8 633** | **9 170** |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | - | - |
| Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам | 520 | - | - |
| Отложенные налоговые обязательства | 530 | - | - |
| Доходы будущих периодов | 540 | - | - |
| Резервы предстоящих платежей | 550 | - | - |
| Прочие долгосрочные обязательства | 560 | - | - |
| **ИТОГО по разделу IV** | **590** | **-** | **-** |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 610 | 4 200 | 4 889 |
| Краткосрочная часть долгосрочных обязательств | 620 | - | - |
| Краткосрочная кредиторская задолженность | 630 | 8 288 | 10 560 |
| в том числе: | | | |
| поставщикам, подрядчикам, исполнителям | 631 | 6 403 | 9 442 |
| по авансам полученным | 632 | 506 | 446 |
| по налогам и сборам | 633 | 667 | 412 |
| по социальному страхованию и обеспечению | 634 | 3 | 16 |
| по оплате труда | 635 | 82 | 91 |
| по лизинговым платежам | 636 | - | - |
| собственнику имущества (учредителям, участникам) | 637 | 2 | 2 |
| прочим кредиторам | 638 | 625 | 151 |
| Обязательства, предназначенные для реализации | 640 | - | - |
| Доходы будущих периодов | 650 | 1 | 421 |
| Резервы предстоящих платежей | 660 | - | - |
| Прочие краткосрочные обязательства | 670 | - | - |
| **ИТОГО по разделу V** | **690** | **12 489** | **15 870** |
| **БАЛАНС** | **700** | **21 122** | **25 040** |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ

за январь – декабрь 2017 года

| Наименование показателей | Код строки | За январь – декабрь 2017 года | За январь – декабрь 2016 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 010 | 21 611 | 38 200 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг | 020 | (17 249) | (31 900) |
| Валовая прибыль | 030 | 4 362 | 6 300 |
| Управленческие расходы | 040 | (618) | (690) |
| Расходы на реализацию | 050 | (5 089) | (6 696) |
| Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 060 | (1 345) | (1 086) |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 070 | 636 | 15 783 |
| Прочие расходы по текущей деятельности | 080 | (650) | (15 953) |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности | 090 | (1 359) | (1 256) |
| Доходы по инвестиционной деятельности | 100 | 1 935 | 1 150 |
| в том числе: | | | |
| доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 101 | 361 | 746 |
| доходы от участия в уставном капитале других организаций | 102 | 1 574 | 404 |
| проценты к получению | 103 | - | - |
| прочие доходы по инвестиционной деятельности | 104 | - | |
| Расходы по инвестиционной деятельности | 110 | (240) | (40) |
| в том числе: | | | |
| расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 111 | (166) | (40) |
| прочие расходы по инвестиционной деятельности | 112 | (74) | |
| Доходы по финансовой деятельности | 120 | 357 | 1 114 |
| в том числе: | | | |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 121 | 357 | 1 114 |
| прочие доходы по финансовой деятельности | 122 | - | - |
| Расходы по финансовой деятельности | 130 | -1 114 | -2 168 |
| в том числе: | | | |
| проценты к уплате | 131 | (782) | (1 054) |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 132 | (321) | (1 114) |
| прочие расходы по финансовой деятельности | 133 | (11) | |
| Прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности | 140 | 938 | 56 |
| Прибыль (убыток) до налогообложения | 150 | (421) | (1 200) |
| Налог на прибыль | 160 | | (23) |
| Изменение отложенных налоговых активов | 170 | - | - |
| Изменение отложенных налоговых обязательств | 180 | - | - |
| Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода) | 190 | - | - |
| Прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода) | 200 | (103) | (6) |
| Чистая прибыль (убыток) | 210 | (524) | (1 229) |
| Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 220 | - | - |
| Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 230 | - | - |
| Совокупная прибыль (убыток) | 240 | (524) | (1 229) |
| Базовая прибыль (убыток) на акцию | 250 | - | - |
| Разводненная прибыль (убыток) на акцию | 260 | - | - |

Руководитель А. М. Улезло
Главный бухгалтер И. В. Павлов
5 марта 2018 г.

| **4. Доля государства в уставном фонде эмитента (всего в %):** | **97,4466** |
|---|---|

| Вид собственности | Количество акций, шт. | Доля в уставном фонде, % |
|---|---|---|
| республиканская | | |
| коммунальная всего: | *2192122* | *97,4466* |
| в том числе: | *x* | *x* |
| областная | | |
| районная | | |
| городская | *2 192 122* | *97,4466* |

**5-6. Информация о дивидендах и акциях**

| Показатель | Единица измерения | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Количество акционеров, всего | лиц | 861 | 860 |
| в том числе: юридических лиц | лиц | 2 | 2 |
| из них нерезидентов Республики Беларусь | лиц | | |
| в том числе: физических лиц | лиц | 859 | 858 |
| из них нерезидентов Республики Беларусь | лиц | | |
| Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде | тысяч рублей | 0,00 | 0,00 |
| Фактически выплаченные дивиденды в данном отчетном периоде | тысяч рублей | 0,00 | 0,00 |
| Дивиденды, приходящиеся на одну простую (обыкновенную) акцию (включая налоги) | рублей | 0,000000 | 0,000000 |
| Дивиденды, фактически выплаченные на одну простую (обыкновенную) акцию (включая налоги) | рублей | 0,000000 | 0,000000 |
| Период, за который выплачивались дивиденды | месяц, квартал, год | | X |
| Дата (даты) принятия решений о выплате дивидендов | число, месяц, год | | X |
| Срок (сроки) выплаты дивидендов | число, месяц, год | | X |
| Обеспеченность акции имуществом общества | рублей | 3,84 | 4,08 |
| Количество акций, находящихся на балансе общества, – всего | штук | | |

**7. Отдельные финансовые результаты деятельности открытого акционерного общества**

| Показатель | Единица измерения | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | тысяч рублей | 21 611,00 | 38 200,00 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг, управленческие расходы; расходы на реализацию | тысяч рублей | 22 956,00 | 39 286,00 |
| Прибыль (убыток) до налогообложения – всего (Прибыль (убыток) отчетного периода) | тысяч рублей | -421,00 | -1200,00 |
| в том числе: прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг | тысяч рублей | -1345,00 | -1086,00 |
| прочие доходы и расходы по текущей деятельности | тысяч рублей | -14,00 | -170,00 |
| прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности | тысяч рублей | 938,00 | 56,00 |
| Налог на прибыль; изменение отложенных налоговых активов; изменение отложенных налоговых обязательств; прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода); прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода) | тысяч рублей | 103,00 | 29,00 |
| Чистая прибыль (убыток) | тысяч рублей | -524,00 | -1229,00 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | тысяч рублей | -4717,00 | -4212,00 |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | тысяч рублей | 114,00 | 106,00 |
| Долгосрочные обязательства | тысяч рублей | | |
| **8. Среднесписочная численность работающих** | **человек** | **290** | **391** |

**9. Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено двадцать и более процентов выручки от реализации товаров, продукции, работ, услуг (только в составе годового отчета):**
Оптовая торговля алкогольной продукцией – 43,85 % (9488,05 тыс. рублей); оптовая торговля сахаром – 14,31 % (3 097,55 тыс. рублей).

**10. Дата проведения годового общего собрания акционеров, на котором утверждался годовой бухгалтерский баланс за отчетный год:**
30 марта 2018 г.

**13. Сведения о применении открытым акционерным обществом Свода правил корпоративного поведения (только в составе годового отчета)**
Открытое акционерное общество «Белбакалея» обеспечивает соблюдение прав и интересов акционеров в соответствии с законодательством Республики Беларусь и уставом Общества.

**14. Адрес официального сайта открытого акционерного общества в глобальной компьютерной сети Интернет**
www.belbakaleya.by

ООО «Белросаудит»
пр-т Победителей, д. 89, корп. 3, пом. 4
Минск, Беларусь, 220020
Телефоны: +375 (17) 203 20 36; 203 17 02
Факс +375 (17) 203 18 46
Internet www.belrosaudit.by

## Аудиторское заключение по бухгалтерской (финансовой) отчетности ОАО «Белбакалея» за 2017 год

Акционерам и руководству ОАО «Белбакалея»
**Аудиторское мнение**

**Аудируемая организация**
Открытое акционерное общество «Белбакалея»;
юридический адрес: 220075, г. Минск, ул. Промышленная, 15;
сведения о государственной регистрации: зарегистрировано решением Минского городского исполнительного комитета от 19.02.2002 г. № 200, в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100025653.
УНП 100025653
ОКПО 01569340

**Аудиторская организация:**
Общество с ограниченной ответственностью «Белросаудит»;
юридический адрес: 220020, пр. Победителей, 89, к. 3, пом. 4;
тел./факс: (+375 17) 203 20 36; 203 17 02
сведения о государственной регистрации: зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 600506719 решением Мингорисполкома от 28.04.2000 г. № 465;
УНП 600506719

Мы провели аудит бухгалтерской (финансовой) отчетности ОАО «Белбакалея» (далее — «Общество»), состоящей из бухгалтерского баланса на 31 декабря 2017 г., отчета о прибылях и убытках, отчета об изменении собственного капитала, отчета о движении денежных средств за год, закончившийся на указанную дату, а также примечаний к бухгалтерской (финансовой) отчетности.

По нашему мнению, прилагаемая бухгалтерская (финансовая) отчетность достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение ОАО «Белбакалея» на 31.12.2017 г., а также финансовые результаты его деятельности и изменение его финансового положения, в том числе движение денежных средств, за год, закончившийся на эту дату, в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

**Основание для выражения аудиторского мнения**

Мы провели аудит в соответствии с требованиями Закона Республики Беларусь от 12 июля 2013 года «Об аудиторской деятельности» и национальных правил аудиторской деятельности, которые обязывают нас соблюдать нормы профессиональной этики, планировать и проводить аудит таким образом, чтобы обеспечить достаточную уверенность относительно наличия либо отсутствия существенных искажений в представленной финансовой отчетности.

Наша ответственность в соответствии с этими стандартами описана далее в разделе «Обязанности аудиторской организации по проведению аудита бухгалтерской (финансовой) отчетности» нашего заключения. Мы независимы по отношению к Обществу в соответствии с требованиями независимости, применимыми к нашему аудиту финансовой отчетности в Республике Беларусь, и мы выполнили наши профессиональные этические обязанности в соответствии с требованиями, применимыми в Республике Беларусь. Мы полагаем, что полученные нами аудиторские доказательства являются достаточными и надлежащими, чтобы служить основанием для выражения аудиторского мнения.

**Прочие сведения**

Аудит бухгалтерской (финансовой) отчетности Общества по состоянию на 31 декабря 2016 года и за год, закончившийся на указанную дату, был проведен нами, заключение, датированное от 10 марта 2017 года, содержало немодифицированное мнение о той отчетности.

**Ключевые вопросы аудита**

В результате проведенного аудита нами определено, что ключевые вопросы аудита, информацию о которых необходимо сообщить в аудиторском заключении, отсутствуют.

**Обязанности аудируемого лица по подготовке бухгалтерской (финансовой) отчетности**

Руководство аудируемого лица несет ответственность за подготовку и достоверное представление бухгалтерской (финансовой) отчетности в соответствии с национальными правилами аудиторской деятельности и за систему внутреннего контроля, которую руководство считает необходимой для подготовки бухгалтерской (финансовой) отчетности, не содержащей существенных искажений вследствие недобросовестных действий или ошибок.

При подготовке бухгалтерской (финансовой) отчетности руководство несет ответственность за оценку способности Общества продолжать непрерывно свою деятельность, за раскрытие в соответствующих случаях сведений, относящихся к непрерывности деятельности, и за составление отчетности на основе допущения о непрерывности деятельности, за исключением случаев, когда руководство намеревается ликвидировать Общество, прекратить его деятельность или когда у него отсутствует какая-либо иная реальная альтернатива, кроме ликвидации или прекращения деятельности.

Лица, отвечающие за корпоративное управление, несут ответственность за надзор за подготовкой бухгалтерской (финансовой) отчетности Общества.

**Обязанности аудиторской организации по проведению аудита бухгалтерской (финансовой) отчетности**

Наша цель состоит в получении разумной уверенности в том, что бухгалтерская (финансовая) отчетность не содержит существенных искажений вследствие недобросовестных действий или ошибок, и в составлении аудиторского заключения, включающего выраженное в установленной форме аудиторское мнение.

Разумная уверенность представляет собой высокую степень уверенности, но не является гарантией того, что аудит, проведенный в соответствии с национальными правилами аудиторской деятельности позволяет выявить все имеющиеся существенные искажения. Искажения могут быть результатом недобросовестных действий или ошибок и считаются существенными, если можно обоснованно предположить, что в отдельности или в совокупности они могут повлиять на экономические решения пользователей, принимаемые на основе этой бухгалтерской (финансовой) отчетности.

В рамках аудита, проводимого в соответствии с национальными правилами аудиторской деятельности, мы применяем профессиональное суждение и сохраняем профессиональный скептицизм на протяжении всего аудита.

Кроме того, мы выполняем следующее:

— выявляем и оцениваем риски существенного искажения бухгалтерской (финансовой) отчетности вследствие недобросовестных действий или ошибок; разрабатываем и проводим аудиторские процедуры в ответ на эти риски; получаем аудиторские доказательства, являющиеся достаточными и надлежащими, чтобы служить основанием для выражения нашего мнения. Риск необнаружения существенного искажения в результате недобросовестных действий выше, чем риск необнаружения существенного искажения в результате ошибки, так как недобросовестные действия могут включать сговор, подлог, умышленный пропуск, искаженное представление информации или действия в обход системы внутреннего контроля;

— получаем понимание системы внутреннего контроля, имеющей значение для аудита, с целью разработки аудиторских процедур, соответствующих обстоятельствам, но не с целью выражения мнения об эффективности внутреннего контроля общества;

— оцениваем надлежащий характер применяемой учетной политики и обоснованности бухгалтерских оценок и соответствующего раскрытия информации, подготовленной руководством;

— оцениваем правильность применения руководством аудируемого лица допущения о непрерывности деятельности и на основании полученных аудиторских доказательств делаем вывод о том, имеется ли существенная неопределенность в связи с событиями или условиями, в результате которых могут возникнуть значительные сомнения в способности аудируемого лица продолжать свою деятельность непрерывно;

— оцениваем общее представление бухгалтерской (финансовой) отчетности, ее структуру и содержание, включая раскрытие информации, а также того, обеспечивает ли отчетность достоверное представление о лежащих в ее основе операциях и событиях;

— осуществляем информационное взаимодействие с лицами, наделенными руководящими полномочиями, доводя до их сведения, помимо прочего, информацию о запланированных объеме и сроках аудита, а также о значимых вопросах, возникших в ходе аудита, в том числе о значительных недостатках системы внутреннего контроля;

— предоставляем лицам, наделенным руководящими полномочиями, заявление о том, что были выполнены все требования в отношении соблюдения принципа независимости и доведена до их сведения информация обо всех взаимоотношениях и прочих вопросах, которые можно обоснованно считать угрозами нарушения принципа независимости, и, если необходимо, обо всех предпринятых мерах предосторожности.

Генеральный директор И. Н. Долмат

Аудитор Т. М. Мицкевич

Беларусь, Минск
7 марта 2018 года







2007 год.

# Рэха Чарнобыля. ПАМІЖ ДЗВЮМА РАДЗІМАМІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Калі выбухнуў чарнобыльскі рэактар, тысячы нашых суайчыннікаў страцілі самае святое — малую радзіму. Вёску Варацец Хойніцкага раёна, у якой пражывалі 344 жыхары, рашэннем камісіі па адсяленні «прыпісалі» да вёскі Камсамолец Рэчыцкага раёна. Там для перасяленцаў пабудавалі новую вуліцу, якую і дагэтуль называюць «чарнобыльскай».

Варацецкая жыхарка Ганна Шаціла, якой у 1986 годзе было сорак чатыры гады, таксама вырашыла не адрывацца ад землякоў і, скарыўшыся лёсу, справіла «ўваходзіны» ў свой новы дом. Стала абжывацца. Не так проста было звыкацца з чужой бацькаўшчынай, але сям'я — муж і двое дзяцей, работа — усё жыццё Ганна працавала даяркай, і, нарэшце, добрыя адносіны з адавяскоўцамі-палешукамі дапамагалі справіцца з болем ад страты роднага гнязда.

Трыццаць два гады мінула з той пераломнай вясны, пасталелі і разляцеліся з дому дзеці, выраслі ўнукі, але цяга да пакінутай хаты (хоць яна і разрабавана), да родных магіл, не адпускае. І з набліжэннем радаўнічных дзён хваля ўспамінаў зноў прымушае мацней біцца сэрца. У такія дні баба Ганна чакае чарговай сустрэчы з Варатцом, не спіць і прымае таблеткі ад ціску.

— Хочацца пабачыцца з былымі суседзямі, сяброўкамі маладосці, нашчадкамі аднавяскоўцаў... Час ідзе, мы сівеем, мала нас ужо застаецца, — кажа Ганна Адамаўна ў размове пра сваё незваротнае мінулае, пра паездку ў Хойніцкі раён і пра новую радзіму — вёску Камсамолец, якая стала для яе сапраўды роднай.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

*Здымкі Ганны Шацілы зроблены сёлета — у вёсках Камсамолец і Варацец і ў 2007 годзе — на варацецкіх могілках.*

*(Больш здымкаў гэтага рэпартажу і відэа глядзіце на сайце zviazda.by)*







# САМЫ СХАВАНЫ

## Санака Самарасінха расказаў, што ўдалося зрабіць ААН у нашай краіне

**У канцы красавіка Санака пакідае Беларусь. За гады яго працы ў Сінявокай адбыўся шэраг значных змен: былі прынятыя Канвенцыя аб правах інвалідаў і Нацыянальны план дзеянняў па правах чалавека, прайшла кампанія «Інклюзіўная Беларусь», былі пастаўлены Мэты ўстойлівага развіцця, апроч таго, рэалізаваны шэраг праектаў агенцтваў ААН. Час працы гаспадара Самарасінхі на пасту пастаяннага каардынатара ААН і пастаяннага прадстаўніка ПРААН у краіне заканчваецца, і карэспандэнт «Звязды» сустрэўся з ім, каб падвесці вынікі і высветліць, якія пытанні застануцца для новага прадстаўніка Арганізацыі Аб'яднаных Нацый на гэтай пасадзе.**




За час працы пастаяннага прадстаўніка ААН быў рэалізаваны шэраг праектаў па ўсёй краіне.

***— Які з праектаў ААН у Беларусі вы лічыце самым паспяховым?***

— Складана выбраць адзін, таму што яны вельмі розныя і ўплываюць на розных людзей. З чым параўноўваць праект, напрыклад, па аднаўленні тарфянікаў, якія маюць вялікі эфект у вырашэнні праблемы змянення клімату? Ці праект па стварэнні «зялёных» працоўных месцаў? Мы дасягнулі вельмі важных вынікаў праз усё тое, што мы рэалізавалі ў розных сектарах. Але адной з найбольш паспяховых ініцыятыў з'яўляецца праца, якую мы правялі з Глабальным фондам па барацьбе з ВІЧ/СНІДам. Мы ўбачылі цудоўны вынік і значнае скарачэнне інфіцыравання, а таксама павышэнне ўзроўню інфармаванасці і колькасці тэсціравання. Нас усё яшчэ чакае работа па тым, каб перамагчы стыгматызацыю, якая звязаная з ВІЧ. Гэта тое, што датычыцца праектаў ПРААН.




Цягнік «Экспрэс ААН-70» тры гады таму пракаціўся па ўсіх абласцях Беларусі.

Па лініі ААН вы, напрыклад, сталі сусветным лідарам у прадухіленні распаўсюджвання злачынстваў і гандлю людзьмі. Адносна дзяцей многае было зроблена па прадухіленні траўматызму. Але ўсё адно ўзровень траўматызацыі вельмі вялікі з-за адсутнасці належнай увагі з боку бацькоў. Алкагалізацыя застаецца ўсё яшчэ вялікай праблемай у гэтай краіне. І мужчыны паміраюць на 11 гадоў раней, чым жанчыны. У вас 86—87 % гінуць ад неінфекцыйных захворванняў: сардэчна-сасудзістых, раку. І мы спрабуем гэтаму супрацьдзейнічаць, апроч іншага, шляхам папулярызацыі здаровага ладу жыцця.

Мы пачалі працаваць з вашым урадам па правах чалавека. За гэты час краіна падпісала і ратыфікавала Канвенцыю аб правах інвалідаў. 560 000 людзей з абмежаванымі магчымасцямі жывуць у вашай краіне, і гэты дакумент надзяляе іх законнымі правамі: дапамагае ўсвядоміць і вызначыць іх. Краінай быў прыняты і першы Нацыянальны план дзеянняў па правах чалавека. Гэта таксама тое, над чым мы вельмі ўзмоцнена працавалі разам. Зараз вы сталі прызнаным чэмпіёнам у рэгіёне па дасягненні Мэт развіцця тысячагоддзя. Гэтым таксама можам ганарыцца як нашай агульнай працай. Узаемадзеянне ідзе і з грамадскімі аб'яднаннямі, прадстаўнікамі прыватнага сектара... Гэта значыць шмат і робіць мяне шчаслівым. Я рады гэтаму. Але гэта не канец: чалавеку, які заменіць мяне на гэтай пасадзе, трэба будзе шмат яшчэ зрабіць.

***— Нацыянальны план па правах чалавека быў прыняты 1,5 года таму. Што змянілася за гэты час? І як гэта падзея паўплывала на статус Беларусі ў свеце?***

— Гэта адно з пытанняў, над якім нам яшчэ трэба будзе працаваць. Неабходна паглядзець план і тое, што задумалі рэалізаваць розныя дзяржаўныя структуры. Мы яшчэ гэта не зрабілі. Не так даўно дакумент быў прыняты, і я спадзяюся, што зусім хутка мы будзем працаваць над ім. Вядуцца дыскусіі, вядома, з грамадскімі аб'яднаннямі, з урадам, з ААН. Былі некаторыя агляды, але яшчэ не структураванае даследаванне з аб'ектыўнай ацэнкай, якое павінна быць праведзена. Я думаю, што ў той час, калі план быў прыняты, гэта быў вельмі важны крок, паколькі ён дапамог Беларусі ў яе ўзаемаадносінах з пэўнымі краінамі. У прыватнасці — Еўрапейскага саюза і збольшага з ЗША. Але ўсе разумеюць, што план — гэта ўсяго толькі намер. І яго недастаткова. Вы павінны яго рэалізоўваць і паведамляць, што ўжо зроблена. І таму я кажу, што мы яшчэ да гэтага этапу не дайшлі. Я разумею, што гэта вельмі адчувальнае пытанне. І некаторыя з праблем немагчыма вырашыць за адну ноч. Але мне здаецца, што нам патрэбны больш структураваны, сістэмны, узгоднены працэс маніторынгу ходу яго рэалізацыі. І больш шырокі дыялог з удзелам усіх партнёраў, уключаючы сусветную супольнасць. Таму што ёсць шмат энтузіязму з боку сусветнай супольнасці па аказанні падтрымкі, тэхнічнай дапамогі, знаходжанні адказаў. І мы не будзем вынаходзіць веласіпед: проста можам скарыстацца вопытам тых, у каго лепш атрымалася. І ў Беларусі ёсць чаму павучыцца. Сацыяльныя, культурныя, эканамічныя правы — у гэтай частцы краіна сапраўды зрабіла шмат. І гэтым яна можа падзяліцца з іншымі дзяржавамі ў рэгіёне і за яго межамі.

***— Ёсць меркаванне, што ААН недастаткова ўплывае ў глабальных маштабах. Але, як я бачу ў Беларусі, ёсць рашэнне канкрэтных праблем, блізкіх да мэтавай аўдыторыі. Вы адчуваеце, што засталіся групы людзей, якія яшчэ маюць патрэбу ў дапамозе арганізацыі?***

— Мы праводзілі кампанію ў 2016 годзе «Інклюзіўная Беларусь». Падчас яе спрабавалі вызначыць тых, каго лічаць найбольш уразлівымі або абздзеленымі, маргіналізаванымі, і тых, хто можа стаць такім і ў нейкі момант. Напрыклад, хто вядзе рызыкоўны лад жыцця: на дадзены момант усё добра, але, калі чалавек заахвоціцца алкаголем, наркотыкамі, небяспечным сексам, можа стаць маргіналізаваным. У прыватнасці, мы лічым падлеткаў уразлівымі перад аблічам тых праблем, якія я толькі што згадаў. Таксама ў вас ёсць — асабліва ў сельскіх рэгіёнах — насельніцтва, якое старэе і вельмі эканамічна адчувальнае. Ёсць пэўныя групы жанчын, якія асабліва ўразлівыя: тыя, хто хутчэй за ўсё можа стаць ахвярамі гандляроў людзьмі альбо хатняга гвалту. 30 % людзей, якіх забіваюць у Беларусі, гінуць ад рук сваякоў ці знаёмых. Тры з чатырох жанчын мелі вопыт той ці іншай формы гвалту ў адносінах да сябе. У вас досыць нядрэнны рэйтынг па гендарнай роўнасці: па даных ПРААН, вы ўваходзіце ў топ-30 краін. Але ёсць праблема розніцы ў зарплаце паміж мужчынамі і жанчынамі. Гэта ў прынцыпе не нешта ўнікальнае для Беларусі: у Амерыцы таксама гэтая праблема ёсць. Калі мужчыны атрымліваюць дыплом універсітэта, хутчэй за ўсё на 24 % іх зарплата будзе вышэйшая, чым у жанчын.

Мы лічым групы, якія знаходзяцца ў сферы найбольшай рызыкі. У вас ёсць і вялікая колькасць вымушана перамешчаных асоб: бежанцы з Украіны, Сірыі, Афганістана, мігранты, якія прыязджаюць у Беларусь і адпраўляюцца на працу у іншыя краіны, Расію. Яны ўсё яшчэ працягваюць сутыкацца з вялікай колькасцю цяжкасцяў, працоўнай эксплуатацыяй. Гэта многія з тых супольнасцяў, з якімі мы працуем у вашай краіне.

***— У адным з інтэрв'ю некалькі гадоў таму вы казалі, што трэба змагацца са стыгматызацыяй ВІЧ-інфіцыраваных. Што-небудзь за гэты час змянілася?***



Санака САМАРАСІНХА разам з дачкой на балоце Ельня.

— Баюся, што яшчэ недастаткова. Я ўвесь час кажу пра гэта. Пяць гадоў таму, памятаю, калі мы адкрывалі першы білборд у Мінску з фотаздымкамі майго сябра Яўгена, — гэта быў першы чалавек, які адкрыта сказаў, што ў яго ВІЧ і даў згоду на размяшчэнне сваёй фатаграфіі. І ён усё яшчэ гэта робіць: шмат праводзіць грамадскіх выступленняў, актыўна асвятляе гэтую тэму. Але людзі ўсё яшчэ думаюць, што гэта смяротны прысуд. А гэта больш не так. Зараз вы можаце жыць паўнавартасна, калі своечасова праводзіце тэсціраванне і атрымаеце доступ да лячэння. А з-за гэтых страхаў і стыгмы людзі баяцца здаваць аналізы. І стыгма не толькі парушае чалавечыя правы, але і вядзе да таго, што паміраюць людзі, якія, на самай справе, не павінны, гінуць.

***— Беларусь мае неблагія вынікі па дасягненні Мэт развіцця тысячагоддзя (МРТ). Чаму яна іх дасягнула? І які вопыт мог бы быць цікавы іншым краінам?***

— Мне здаецца, адна з прычын, чаму вам удалося дасягнуць гэтага, — вельмі моцная сацыяльная палітыка. І структура ўрада такая, што, калі рашэнне прымаецца, у вас ёсць магчымасць яго ажыццяўляць. Цэнтралізаваная структура кіравання дапамагла вам дасягнуць Мэт развіцця тысячагоддзя. На гэта паўплываў і той факт, што дзяржава, асабліва ў той перыяд, давала больш працоўных месцаў. І калі вы паглядзіце на МРТ — гэта праблемы беспрацоўя і беднасці. За 15 гадоў паказаны цудоўныя вынікі: узровень беднасці знізіўся з 45 % да 6 %. З боку аховы навакольнага асяроддзя вы адна з нешматлікіх краін Еўропы, якая захавала амаль 40 % пакрыцця лясамі. Акрамя гэтага, выкаранена перадача ВІЧ ад маці дзіцяці. Гэта ўсе тыя важныя дасягненні, якім іншыя могуць і павінны павучыцца.

Гэта вельмі добры падмурак для дасягнення Мэт устойлівага развіцця ў вашай краіне. Але, калі вы паглядзіце на МУР, яны ўсе ўзаемазвязаныя. Павінна быць у большай ступені інтэграцыя паміж тымі часткамі дзяржавы, якія працуюць па пытаннях аховы здароўя, адукацыі, стварэння працоўных месцаў для маладых людзей і г. д.

# САКРЭТ ЕЎРОПЫ

Другое — думаю, мы можам і павінны зрабіць нашмат лепш — больш падумаць аб патэнцыйных рызыках. Таму што тое, што адбываецца вакол Беларусі, мае значны ўплыў на краіну. Напрыклад, уводзяцца санкцыі супраць Расіі — спад эканомікі, працоўныя мігранты вяртаюцца ў Беларусь. Або канфлікт ва Украіне — прыязджаюць бежанцы. Таму прагназаванне, прадбачанне вельмі важнае, калі вы хочаце дасягнуць да 2030 года гэтых мэт.

***— Якая з мэт найбольш важная для дасягнення?***

— Немагчыма вылучыць. Вядома, можна спрачацца, што мэта № 14 «Захаванне марскіх экасістэм» менш актуальная для Беларусі. У вас няма выхада да мора, але я кажу — не. У мяне нават атрымалася пераканаць урад яшчэ раз перагледзець сваю пазіцыю, таму што многае з таго, што адбываецца ў вашых азёрах і рэках, адбіваецца на Балтыйскім і Чорным морах. У вас ёсць магчымасць на самай справе рабіць нешта добрае ці дрэннае ў гэтым кантэксце для іншых краін свету. Таму мае меркаванне, што мэты ў роўнай ступені важныя і, акрамя гэтага, з усімі нашымі партнёрамі, урадам, нашым нацыянальным каардынатарам па МУР і экспертамі ААН мы вызначылі чатыры паскаральнікі: тыя сферы, звяртаючы ўвагу, на якія мы зможам атрымаць паскоранае дасягненне мэт. Гэта пытанні гендарнай роўнасці, папулярызацыя зялёнай эканомікі (энергаэфектыўнасць, «зялёныя» працоўныя месцы, абыходжанне з адходамі). Мы таксама сказалі, што сапраўды важна канцэнтраваць сваю ўвагу на моладзі, каб краіна інвеставала асабліва ў падлеткаў. У вас усё больш-менш складваецца з дзецьмі, але не так добра з узростам ад 13 да 21. Трэба больш рабіць, бо зараз яны знаходзяцца ў групе высокіх як рызыкі, так і патэнцыялу. Акрамя таго, у вас выдатныя кадравы патэнцыял у сектары IT-тэхналогій. Калі вы сфакусіруеце сваю ўвагу на лічбавізацыі... Некаторы час таму я вячэраў з Аркадзем Добкіным (заснавальнік ЕРАМ. — **Аўт.**), і такую гутарку мы ўжо вядзём з таго часу, як я сюды прыехаў пяць гадоў таму. Як кампаніі, напрыклад ЕРАМ, дапамагаюць нам у дасягненні мэт — гэта вялікі патэнцыял. Чатыры паскаральнікі, якія, як нам здаецца, стануць часткай вашай нацыянальнай дарожнай карты па дасягненні МУР. Мы, вядома, будзем аказваць падтрымку, але гэта будзе ваша стратэгія.

***— Беларусь умацоўвае сваё становішча як пляцоўка для міжнародных перагавораў. Чаму, на ваш погляд, яна атрымала такі статус?***

— Мне падаецца, што ваша краіна шмат пакутавала з-за канфліктаў. І яна была месцам, дзе праходзіла шмат армій. І нічога добрага для Беларусі ў гэтым не было. Таму для мяне гэта не сюрпрыз, што тут ёсць людзі, якія фундаментальна імкнуцца да стабільнасці. Гэта станоўча, але часам гэта можа быць пэўнай складанасцю. Людзі на вуліцы, з якімі я размаўляў, гавораць: «Мы можам трошкі пацярпець, але мы не хочам, каб у нас былі канфлікты, каб здарылася тое, што ва Украіне». Ці ў Малдове (Прыднястроўе), у Грузіі (Паўночная Асеція), Азербайджане і Арменіі. У адрозненне ад іх вы адзіная краіна, дзе ёсць тэрытарыяльная цэласнасць і мір на працягу доўгіх гадоў. І таму гэта ні для кога не сюрпрыз, што вы павінны скарыстацца сваім рэсурсам. Вы заслужылі пэўную ступень даверу. Напэўна, краіне, якая ў стане канфлікту, будзе дастаткова складана папулярызаваць каштоўнасці міру, а вы — можаце. І я шмат гадоў выношваў гэтую ідэю, здаецца, многія пераканаў: Мінск — гэта новая Жэнева.

***— Ці засталіся яшчэ нерэалізаваныя ідэі і якой вы бачыце Беларусь гадоў праз 20?***

— У мяне шмат ідэй. Калі я пайду ў душ, вярнуся яшчэ з пяццю новымі *(смяецца)*. Але я сапраўды хацеў бы бачыць — і спадзяюся, што гэта паступова адбудзецца, — больш адкрытасці. Па-першае, адзін да аднаго, разумення таго, што Беларусь — ваша краіна і вы павінны пра яе клапаціцца. І гэта азначае, што неабходна рабіць гэта разам з вашым суседам. Сітуацыя мяняецца ў дачыненні да маладога пакалення, але ўсё ж такі ёсць у вас тыя, хто лічыць, што нехта будзе клапаціцца пра ўсё, а мне проста трэба думаць пра сваю сям'ю. Так было, мне здаецца, і ў маёй Шры-Ланцы з пакаленнем маіх бацькоў. Але з маладым пакаленнем мы сталі больш палітычна і сацыяльна адказнымі. І я спадзяюся, што гэта ўбачу і тут. А такое магчыма, толькі калі вы пачняце слухаць і размаўляць адзін з адным больш. Гэта мае пажаданне для Беларусі. Мы спрабуем такое прынесці сюды, напрыклад, падарожнічаючы на веласіпедах, размаўляючы з людзьмі ў розных кутках краіны. І я думаю, праз 20 гадоў я гэта ўбачу. А другое — гэта свет убачыць Беларусь. Такой, якой яна на самай справе з'яўляецца, а не такой, пра якую мы чуем у некаторых СМІ. Я ўжо казаў неаднаразова, што Беларусь — самы добра схаваны сакрэт Еўропы. Усё ж настаў час, каб ён быў раскрыты.



Леташні велапрабег Mind ower Matter.

**Надзея АНІСОВІЧ.**

■ Міжнароднае супрацоўніцтва

# Зялёны колер для італьянскага бізнесу

**У сталіцы прайшоў II Італа-беларускі форум па «зялёнай эканоміцы». Каля 200 удзельнікаў, у тым ліку прадстаўнікі амаль паўсотні італьянскіх кампаній, сабраліся разам, каб абмеркаваць новыя праекты. Вынікамі першага форуму, які прайшоў летась, стаў шэраг кантрактаў, а таксама заснаванне праз паўгода беларускага аддзялення асацыяцыі італьянскіх прадпрымальнікаў «Канфіндустрыя».**

Сёлета на парадку дня стаялі не менш важныя задачы. Як паведаміў **камерцыйны саветнік, намеснік пасла Італіі ў Мінску Паола ТАНІНІ**, за мінулы год на трэць павялічыўся італьянскі экспарт у Беларусь, у нашай краіне зарэгістравана больш за сотню прадпрыемстваў з італьянскімі інвестыцыямі. Агульны аб'ём інвестыцый ацэньваецца ў дзясятках мільёнаў еўра. Гаворачы пра асноўную тэму форуму, «зялёную эканоміку», Паола Таніні падкрэсліў: «У Італіі багаты вопыт, якім яна можа падзяліцца з пункту погляду як тэхналогій, так і прадпрымальніцкай дзейнасці ў гэтай галіне. Папярэдні форум меў вялікі поспех».

У панядзелак, дарэчы, «Канфіндустрыя Беларусь» падпісала дамовы аб супрацоўніцтве з дзвюма свабоднымі эканамічнымі зонамі «Гомель-Ратон» і «Брэст». Яны прадугледжваюць спрашчэнне ўмоў заснавання прадпрыемства на тэрыторыі СЭЗ і будуць спрыяць развіццю бізнесу. На думку камерцыйнага саветніка, Беларусь займае добрае стратэгічнае становішча дзякуючы сваёй інтэграцыі ў ЕАЭС і станоўчым адносінам з Еўрасаюзам. Наконт беларуска-італьянскага ўзаемадзеяння намеснік пасла лічыць, што ў абодвух бакоў ёсць усе падставы для развіцця сумеснага канкурэнтаздольнага бізнесу, у тым ліку ў «зялёнай эканоміцы», энергетыцы і сельскай гаспадарцы. Гаворачы пра экалагічны бок, у прывітальным слове спікер нагадаў пра Парыжскае пагадненне па клімаце, якое задало кірунні для развіцця.

**Начальнік упраўлення знешнеэканамічных сувязяў і эканамічнага развіцця адміністрацыі СЭЗ «Брэст» Аляксей ЛАЧЫМАЎ** расказаў, што зараз гэта свабодная эканамічная зона развівае супрацоўніцтва з больш чым 20 краінамі. Італія ў прыярытэце. Для інвестараў з гэтай краіны ў СЭЗ выдзелена каля 26 га зямлі з усёй неабходнай інфраструктурай. На сёння ў «Брэсце» маюцца тры прадпрыемствы з італьянскім капіталам, прычым адно ўжо скончыла будоўлю ўласнага завода.

**Старшыня БелГПП Уладзімір УЛАХОВІЧ** нагадаў, што некалькі гадоў таму тавараабарот паміж Беларуссю і Італіяй быў больш за $2 млрд (па выніках 2017-га — амаль $800 млн). Гэта краіна заўсёды была сярод ключавых партнёраў. Паміж краінамі існуе міжурадавая камісія, а БелГПП мае адносіны з рэгіянальнымі гандлёвымі палатамі Італіі. Дарэчы, у чэрвені адбудзецца першае пасяджэнне беларуска-італьянскага дзелавога савета ў Рыме.

**Надзея АНІСОВІЧ**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### ТРАМП НАЗВАЎ КІМ ЧЭН ЫНА СУМЛЕННЫМ І АДКРЫТЫМ ЧАЛАВЕКАМ



Прэзідэнт ЗША Дональд Трамп заявіў, што лічыць лідара КНДР «вельмі адкрытым і сумленным» чалавекам, паведамляе амерыканскі тэлеканал NBC News. «Кін Чэн Ын паводзіць сябе вельмі адкрыта і, я думаю, вельмі шчыра, зыходзячы з таго, што мы бачым», — заявіў амерыканскі прэзідэнт. Ён сказаў гэта напярэдадні саміту паміж лідарамі КНДР і Паўднёвай Карэі, які адбудзецца 27 красавіка, а таксама на фоне падрыхтоўкі сустрэчы Кім Чэн Ына з самім Трампам, якая прызначана на канец мая — пачатак чэрвеня. Раней падчас актыўнага дыпламатычнага супрацьстаяння Пхеньяна і Вашынгтона прэзідэнт ЗША неадночы называў Кім Чэн Ына «маньякам і вар'ятам», а таксама «маленькім чалавечкам-ракетай».

### ФІНАЎ ПАЗБАВЯЦЬ БЕЗУМОЎНАГА ДАХОДУ

У пачатку 2019 года ўрад завершыць першы нацыянальны эксперымент па выплаце грамадзянам фіксаванай сумы незалежна ад працаўладкавання. Са студзеня 2017 года дзве тысячы беспрацоўных штомесяц атрымлівалі ад дзяржавы па £560. Па задумцы Бюро сацзабеспячэння народанасельніцтва, гэта павінна было матываваць грамадзян да пошуку вакансій — калі яны знаходзілі работу на працягу двух гадоў, выплаты за імі захоўваліся. Калі б эксперымент пацвердзіў слушнасць праграмы, у будучыні да яе маглі б падключыць усіх паўналетніх грамадзян краіны. А безумоўны даход прыйшоў бы на змену дапамог, на якіх многім сёння сядзець часта значна больш камфортна, чым выходзіць на працу. Аднак кабінет міністраў адхіліў заяўку на працяг эксперымента, так і не назваўшы прычыну, перадае Euronews. Рашэнне ўрада падверглася жорсткай крытыцы: на думку аўтараў праекта, для атрымання пэўных вынікаў неабходна больш часу і грошай.

### КІТАЙ ПАЧАЎ АДБІРАЦЬ ТАЙКАНАЎТАЎ

Кітай афіцыйна прыступіў да адбору і падрыхтоўкі трэцяга пакалення касманаўтаў (тайканаўтаў), якім трэба будзе працаваць на ствараемай цяпер Паднябеснай касмічнай станцыі. Пра гэта абвясціў кіраўнік праграмы пілатуемых палётаў КНР, першы кітайскі касманаўт Ян Лівэй. «У трэці атрад касманаўтаў для падрыхтоўкі павінны быць адабраны 17—18 чалавек. Пасля завяршэння працэсу падрыхтоўкі яны возьмуць удзел у місіях, звязаных з касмічнай станцыяй», — цытуе Яна Лівэя агенцтва Xinhua. Асноўны модуль будучай касмічнай станцыі Кітай плануе вывесці на арбіту да 2020 года. У модулі будзе засяроджана кіраванне ўсімі сістэмамі станцыі, да яго адправіцца грузавы карабель, а пазней і карабель з касманаўтамі. Агульны мантаж усёй канструкцыі плануюць завяршыць да 2022 года, пасля таго як да асноўнага модуля далучаць дзве касмічныя лабараторыі вагой па 20 тон кожная. Акрамя таго, КНР мае намер стаць першай краінай, якая высадзіць касмічны зонд на адваротным баку Месяца.

### НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ЖЫВЁЛАЙ ЭСТОНІІ СТАЎ ВОЎК

Камісія груп па інтарэсах Эстоніі абрала нацыянальнай жывёлай ваўка. «За ваўка як нацыянальную жывёлу кажа той факт, што да гэтага часу ў ліку нашых нацыянальных сімвалаў не было ніводнага, звязанага з лесам», — паведаміла камісія. — Воўк з'яўляецца ўніверсальным відаміндыкатарам: ён адлюстроўвае як стан здароўя лесу, так і разуменне эстонца пра здароўе прыроды ў цэлым. Калі мы зразумеем месца ваўка ў лесе, мы зразумеем і тое, што адбываецца ў лесе», — абгрунтавала сваё рашэнне камісія. У яе склад увайшлі прадстаўнікі Таварыства абароны прыроды, камісіі аховы прыроды Акадэміі навук, Геаграфічнага таварыства, Талінскага заапарка, Таварыства настаўнікаў біялогіі і шэрагу іншых арганізацый, а таксама дзеячы СМІ, культуры і навукі. Ваўка выбралі нацыянальным сімвалам з шасці кандыдатаў. Акрамя яго за правы лічыцца нацыянальнай жывёлай «змагаліся» лісіца, вожык, казуля, барсук і бабёр.



# ВЕЛАГОРАД: ФАНТАЗІЯ ЦІ РЭАЛЬНАСЦЬ

## Хто і дзе ездзіць на двух колах?

**З надыходам вясны на вуліцах гарадоў назіраецца ўсё больш веласіпедыстаў. За апошнія гады ў цэлым веласіпедны рух у Беларусі значна ўзрос. Перамяшчацца на двух колах становіцца не толькі выгадна, карысна, але яшчэ і модна. Увесь красавік у свеце праходзіць акцыя «30 дзён на веласіпедзе», яна ахапіла каля сямі тысяч чалавек, амаль паўтары тысячы з іх — беларусы. Мы сустрэліся з прадстаўнікамі Мінскага веласіпеднага таварыства, каб пагаварыць пра тое, дзе знайсці месца для веласіпедыстаў і што варта змяніць у горадзе і ПДР, каб перамяшчацца на веласіпедзе стала яшчэ камфортней.**

### Не голыя лічбы

Аб росце колькасці веласіпедыстаў у горадзе можна меркаваць не толькі нагляднa, але і па статыстыцы. Калі ў 2011 годзе працэнт перамяшчэння на веласіпедзе складаў 0,02 %, то цяпер гэта 1 %. Каля 25 гарадоў у краіне актыўна развівае веларух. Паводле апытання, якое праводзілася мінулай восенню, у Мінску 800 тысяч дарослых ровараў (дарэчы, гэта столькі ж, колькі і машын) і 700 тысяч дзіцячых веласіпедаў або самакатаў. «Па апытанні 40 % мінчан лічаць сябе веласіпедыстамі і ездзяць на двухколавым сродку перамяшчэння некалькі разоў у месяц ці часцей, — расказвае **дырэктар Мінскага веласіпеднага таварыства Анастасія ЯНЧЭЎСКАЯ.** — 30 % апытаных гатовыя ездзіць значна часцей, калі ў горадзе будуць створаны спрыяльныя ўмовы, гэта, перш за ўсё, веладарожкі, велапалосы, адсутнасць высокіх бардзюраў, магчымасць захоўвання ровара ў дварах, веласіпедныя паркоўкі».

Сусветная статыстыка гаворыць аб тым што, калі інфраструктура горада не зусім бяспечная, больш на роварах перасоўваюцца мужчыны — каля 70 %. «Што датычыцца ўзроставых катэгорый, то вялікая колькасць людзей старэйшага ўзросту карыстаецца роварам у рэгіёнах. Часам гэта адзіны спосаб камфортнага перамяшчэння ў невялікім горадзе ці пасёлку. У Мінску мы, вядома, бачым больш маладых людзей на добрых роварах», — расказвае Анастасія.

Дарэчы, штогод з мая Мінскае веласіпеднае таварыства адкрывае велашколу, дзе любы можа атрымаць навык язды на ровары. Летась такіх ахвотных было каля 100, сярод іх і дзеці, і вучні, якім за 80. У гарадах пастаянна праходзяць розныя мерапрыемствы і праекты. «У маі ўжо чацвёрты раз у нас пройдзе велакарнавал, летась фестываль сабраў каля 15 тысяч чалавек, сёлета чакаем яшчэ больш. Праводзім велапрагулкі, розныя квэсты, летам плануецца шэраг цікавых выстаў, у жніўні пройдзе веласіпедны фэст, цяпер таксама рыхтуемся да еўрапейскага тыдня мабільнасці, які пройдзе ў верасні», — дзеліцца планамі Анастасія Янчэўская.

Нягледзячы на тое, што ўсё больш людзей набывае сабе ровары, гарадскія велапракаты не губляюць сваю актуальнасць. Прыватных велапракатаў у Мінску шмат, а вось чаго не хапае — гэта аўтаматызаванага гарадскога велапракату. Калі ты можаш узяць ровар на станцыі, даехаць да патрэбнага месца і пакінуць яго ў іншым пункце.

### Канфлікт з пешаходамі

Пакуль катэгорыі «пешаход» і «веласіпедыст» дзеляць адну тэрыторыю, таму часцяком паміж імі ўзнікаюць канфлікты. «Тут трэба казаць, перш за ўсё, аб тым, што інфраструктура для пешаходаў і веласіпедыстаў адна, а яна павінна быць падзелена. Веласіпед — транспартны сродак, які можа развіваць досыць прыстойную хуткасць — да 30—40 км/г, і гэта ўжо небяспечна для пешаходаў. Важна знайсці кампраміс і не забываць пра культуру».

### Паркоўкі і гаражы

Сёння адной з самых актуальных праблем веласіпедыстаў з'яўляецца захоўванне свайго транспарту. Калі сем гадоў таму веласіпедных паркоўак каля грамадскіх арганізацый у Мінску налічвалася ўсяго каля 70, цяпер — 800, і гэта колькасць пастаянна расце. З гаражамі справа больш складаная, людзям некамфортна выносіць веласіпед, напрыклад, з 10-га паверха кожны дзень, верагодна, калі б чалавек мог узяць яго на вуліцы, то выкарыстоўваў бы часцей. У Мінскім веласіпедным таварыстве адзначаюць, што самі распрацоўваюць праекты велагаражоў, якія маглі б прапанаваць зыходзячы з вылучанага бюджэту. Акрамя гэтага распрацоўваецца схема, як члены таварыстваў могуць сабрацца і вырашыць, ці трэба ім велагараж і ў выпадку неабходнасці на дваровай тэрыторыі пабудаваць яго.

### Веласіпедыстаў чакаюць змены

Сёлета Заводскім і Ленінскім раёнамі Мінска пачалося праектаванне моста для веласіпедыстаў і пешаходаў цераз раку Свіслач, які звяжа Серабранку і Чыжоўку. Веладарожка будзе цягнуцца ад разваротнага кальца ў бок парку 900-годдзя Мінска.

«Таксама чакаем змен у правілах дарожнага руху, — расказвае Анастасія. — Мы актыўна ўносілі свае прапановы ў працэсе напісання новых зьмяненняў. Яшчэ невядома, якая форма будзе прынятая, але мы гаварылі пра неабходнасць вызначыць электравеласіпед у ПДР у асобную катэгорыю (зараз ён па-за ўсімі катэгорыямі). Таксама прасілі даць веласіпедыстам магчымасць пераязджаць рэгуляваныя пешаходныя пераходы, не злазіўшы з ровара. Зараз гэта магчыма толькі там, дзе ёсць веласіпедная разметка».

Гаворачы пра ўсе нававвядзенні і ў цэлым пра рост веласіпеднага руху, актывісты веласупольнасці заклікаюць не забываць аб прадказальных і бяспечных паводзінах, бо гэта залог паспяховага развіцця.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**



Фота Аляксея БАСАЛАЯ.

# НА РОВАРЫ... ПТУШКАЙ

**Вось ужо некалькі гадоў у Гродне існуе традыцыя ўрачыста адкрываць чарговы веласезон. Усе ўдзельнікі збіраюцца на галоўнай плошчы горада і едуць вялікім гуртам па цэнтральных вуліцах. Але ці можна праехаць з вецярком па лясной ці паркавай зоне?**

Сапраўды, такая магчымасць ёсць, прычым у межах горада. У папулярнай у гродзенцаў зоне адпачынку Пышкі пракладзена і прамаркіравана некалькі веламаршрутаў. Адразу каля дарожнай магістралі з'явіўся і пункт пракату. Месца тут зручнае, дабрацца да лясной зоны можна з любога канца горада, прыпынак якраз побач. Гэта пачатак маршруту, які размечаны на розную ступень падрыхтоўкі. Ёсць і на пяць, і 25 кіламетраў. Бяру на пракат веласіпед (чатыры рублі за гадзіну) і выбіраю карацейшы маршрут.

Надвор'е спрыяе шпацыру, таму на дарожцы пад вечар даволі шмат гараджан. Асабліва з дзецьмі. Акрэсленую для веласіпедыстаў разметку ніхто быццам і не заўважае. Можа, таму, што яна ледзь відаць. А можа, па звычцы, бо раней гэта была вотчына пешаходаў, і многім цяжка прыстасавацца да суседзяў-веласіпедыстаў. А хочацца праехаць з вецярком, бо траса якраз спрыяе. Але прыходзіцца трымаць «каня», каб пазбегнуць непрыемных наступстваў. Тут табе і дзіцячыя атракцыёны, і летняя танцавальная пляцоўка, і аматары ролікаў... Абачлівасць патрэбна бадай што на працягу ўсяго маршруту, бо гараджане смела гуляюць па дарожцы, якая прызначана толькі для веласіпедаў. Аб чым гавораць і знакі. Дарэчы, маркіроўка на хвойках паказвае на наяўнасць адразу трох маршрутаў, якія потым разыходзяцца.

Выбіраю трасу ўздоўж Нёмана. Калі ехаць не так хутка, можна ўбачыць імклівую плынь вады і супрацьлеглы бераг. Крыху далей відуцца работы ў прыбярэжнай зоне, за якой знаходзіцца папулярны парк адпачынку «Прывал». Між тым траса становіцца больш пакручастай, кажуць, што яна пракладвалася так, каб не нашкодзіць прыродзе. Аб вельмі крутым спуску папярэджвае нават спецыяльная шыльда. Не кожны здолее пераадолець і круты пад'ём. Пасля экстрэмальнага ўчастка дарога становіцца больш раўніннай. І вось ужо 5-кіламетровае кола пераадолена. Часу хапіла і на тое, каб спыніцца на стаянцы і палюбавацца наваколлем і ракой. Дарэчы, на працягу нават такога кароткага маршруту ўстаноўлены некалькі добра ўпарадкаваных месцаў адпачынку з драўлянымі навесамі, сталамі, лаўкамі.

У пункце пракату расказалі, што веласіпедаў хапае, многія едуць сюды на свае. Але попыт з кожным новым сезонам расце, у дзень 30—40 кліентаў «набягае». І ўсё ж мне падалося, што ў Пышках веласіпедыстаў не вельмі многа. Здаецца, у гарадскім асяроддзі іх можна сустрэць значна часцей.

— Развіццё веластруктуры ў Гродне толькі пачынаецца, — адзначае **кіраўнік грамадскага аб'яднання «ВелаГродна» Юлія КАЛЯДА.** Веладарожкі ёсць, але яны раскіданы асобнымі кускамі, няма ніводнага закальцаванага маршрута, хоць працягласць не такая і малая — 20 кіламетраў. Таму ў горадзе вырашана браць асобныя часткі і ствараць там спрыяльныя ўмовы.

«ВелаГродна» створана пяць гадоў таму і налічвае больш за 100 членаў. Сюды прыходзяць нават тыя, хто пакуль не мае веласіпеда. Затое ў аб'яднання ёсць свая спартыўная каманда, а двое прадстаўнікоў прынялі ўдзел у велапрабегу Bike 4SDGs, арганізаваным ПРААН у падтрымку Мэт устойлівага развіцця. Старт быў дадзены 24 красавіка, а сам маршрут разлічаны на шэсць дзён і пройдзе па Гродзенскай і Брэсцкай абласцях. Як расказаў начальнік упраўлення спорту і турызму Гродзенскага аблвыканкама Алег Андрэйчык, Гродзеншчына другі год запар становіцца месцам правядзення велапрабегу ПРААН, у мінулым годзе ён праходзіў на Аўгустоўскім канале. Дарэчы, тут веларух развіваецца найбольш актыўна.

— У мінулым годзе мы праклалі на Аўгустоўскім канале каля 70 кіламетраў новых веламаршрутаў. У гэтым годзе сумесна з польскім бокам плануем «запусціць» унікальны маршрут «Аўгуст Вела». Ён звяжа беларускі пункт пропуску і Гродна. Пройдзе па цікавых мясцінах — былых сядзібах, аграгарадках. Гэты маршрут стане часткай еўрапейскіх маршрутаў і будзе сертыфікаваны па адпаведным стандарце. На гэтыя мэты выдзелена ў рамках трансгранічнага праекта 200 тысяч еўра. У раёне канала будзе рэканструявана 20 км дарог, тут з'явяцца і веладарожкі ў комплексе з аўтамагістралямі. У Лідзе пры падтрымцы ПРААН вядзецца пракладка веладарожкі даўжынёй 12 км.

Па словах чыноўніка, у веларуху шмат ініцыятыў, цікавасць да яго расце. Але пакуль інфраструктура спазняецца. Ёсць і новыя для рэгіёна ідэі. Напрыклад, ідзе гаворка аб тым, каб устанавіць стацыянарны пункт пракату ў горадзе, калі з тэлефона ўводзіцца код банкаўскай карткі і робіцца аплата. У найбліжэйшых планах — абнавіць знакі, разметку. Работа гэта не хуткая, бо ў рэгіёне налічваецца каля 300 км веладарожак.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

HOME CREDIT

**Открытое акционерное общество «Небанковская кредитно-финансовая организация «Хоум Кредит»**

Республика Беларусь, 220018, г. Минск, ул. Одоевского, 129.
Тел.: (8017) 229 89 91
**www.homecredit.by**

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 апреля 2018 года**

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.04.2018 | 01.01.2018 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | - | - |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 3 | 12 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 5 429 | 1 360 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 11 614 | 9 872 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 3 735 | 5 287 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | - | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | - | - |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 1 200 | 1 592 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | - | - |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | 9 | 20 |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | - | - |
| 14 | Прочие активы | 1113 | 9 936 | 10 992 |
| **15** | **ИТОГО активы** | **11** | **31 926** | **29 135** |
| **16** | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | - | - |
| 18 | Средства банков | 1202 | - | - |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | 1 526 | 1 929 |
| 20 | Ценные бумаги банка | 1204 | - | - |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | - | - |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | - | - |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | 1 321 | 628 |
| 24 | ВСЕГО обязательства | 120 | 2 847 | 2 557 |
| **25** | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | 14 479 | 14 479 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | 1 969 | 1 969 |
| 29 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | 167 | 168 |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | 12 464 | 9 962 |
| 31 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | 29 079 | 26 578 |
| **32** | **ИТОГО обязательства и собственный капитал** | **12** | **31 926** | **29 135** |

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ на 1 апреля 2018 г.**

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.04.2018 | 01.04.2017 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 509 | 2 529 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 98 | 745 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 411 | 1 784 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 267 | 892 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 53 | 178 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 214 | 714 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 29 | 14 |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 25 | (84) |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | - | - |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | (4 677) | 164 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 360 | 1 384 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 2 141 | 4 287 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 204 | 34 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 3 371 | (673) |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | 870 | - |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 2 501 | (673) |

Председатель Правления Полищук А.В.

Главный бухгалтер Бельник А.Н.

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 18, выданная НБ РБ 24 мая 2013 года. УНП 807000056.



**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «ТРАНСБУГ»**

**Предмет торгов**

Капитальное строение с инвентарным номером 100/С-345, общей площадью 72,1 кв. м (назначение: здание специализированное иного назначения; наименование: КПП)

| **Начальная цена без НДС:** 35 000,00 рублей | **Размер задатка:** 3 120,00 рублей |
|---|---|
| **Адрес объекта** | Брестская обл., г. Брест, ул. Красногвардейская, 114/2 |
| **Имущественные права на земельный участок** | Право постоянного пользования. Площадь и конфигурация земельного участка для обслуживания данного объекта будет определятся в процессе подготовки сделки купли-продажи |
| **Условия продажи** | С условиями |
| **Организатор торгов** | РУП «Институт недвижимости и оценки» Брестский филиал |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | В течение 20 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона |
| **Условия оплаты** | В соответствии с заключенным договором купли-продажи |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | BY76BPSB30121789380179330000 в ОАО «БПС-Сбербанк» Региональная дирекция № 100 по Брестской области, г. Брест, ул. Мицкевича, 10, BIC Банка BPSBBY2X, УНП 201028245 |

**Аукцион состоится 28 мая 2018 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

**Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционных торгах, а также иную информацию об объектах торгов, можно узнать у организатора аукционных торгов по телефонам 8-(0162)-20-92-13, 21-88-81, 8-(029)-626-72-52**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10, каб. 329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 28 мая 2018 г. до 10.00**



В суд Кобринского района поступило заявление об объявлении умершим Леонова Владимира Ивановича с просьбой ко всем гражданам и юридическим лицам, имеющим сведения о гражданине Леонове Владимире Ивановиче, 12 апреля 1964 года рождения, уроженце г. Алапаевска Свердловской области Российской Федерации, о котором не имеется никаких сведений с 2006 года, с предложением в течение двух месяцев с момента публикации сообщить суду Кобринского района Брестской области соответствующие сведения о месте пребывания Леонова Владимира Ивановича.

Последнее известное место жительства Леонова Владимира Ивановича – Российская Федерация, Свердловская область, г. Алапаевск, ул. Флегонта Кабакова, д. 31, кв. 7.


■ Простая мова

# ПАД БОГАМ...

**Цуд якія прыгожыя цыраты ў крамах! Кожны раз «тармажу» ля раскручаных рулонаў, кожны раз прыкідваю, што і вось гэтай можна было б адмераць — стол на кухні заслаць, і той, бо зручна: анучкай працёр і ніякага табе мыцця-прасавання.**

**А значыць, і ніякіх... успамінаў? Аб тым, напрыклад, што вось гэты абрус — яшчэ бабулін, саматканы, што яго мама дала ў пасаг, гэты — у спадчыну пакінула свякроў, гэты — падарыла нябожчыца-сяброўка...**

**Не помніць іх — нельга! Але ж трэба (і хочацца) успамінаць — штодня, ставячы на стол талеркі.**

## ЯНЫ НЕ МЫ

Радаўніца. Могілкі. Людзей зранку шмат: па двое, па трое, а то і цэлымі сем'ямі яны завіхаюцца ля магіл — прыбіраюць, гамоняць, месцамі і нарэшце наліваюць па чарцы.

— Ну, хай выбачаюць, — уздымаючы першую, кажа да сваіх памерлых (жанчын... потым паглядзелі на помнік) адзін з пажылых дзядзькоў. — Лісты мы падгрэблі, жоўтага пясочку насыпалі, кветак ім паставілі... Што маглі, зрабілі.

— Ды ўсё зрабілі, — пярэчыць яму другі. — Нават больш, чым яны!

— ?!

— Ну каб мы з табою памерлі, яны б таксама прыйшлі: магілкі прыбралі б, кветкі паставілі, можа, нават паплакалі. А вось чарку — наўрад ці ўзнялі.

Што праўда, тое праўда.

## ЁСЦЬ У МАНЕТЫ І ТОЙ БОК, І ГЭТЫ

«Грошы ў доўг...», «Грошы за 15 мінут...», «Грошы для ўсіх», «...Без пашпарта і даведак»...

Прапаноў такіх (у Мінску ва ўсякім разе), як слупоў! І ледзь не на кожным — аб'ява.

Каля чарговай інкасатарская машына спынілася. Недзе побач, трэба разумець, тыя грошы сабрала — можа, нават шмат... Але ж тут, на месцы, «не адыходзячы ад касы», не раздае — ва ўсякім разе пакуль...

Потым — можа і будзе?

Тым, у прыватнасці, хто забыўся крылатае: «Добры рубель пазычаны, толькі спаць не дае...»

## БЕЗ КРЫЎДАЎ?

Пра нябожчыкаў альбо нічога, альбо толькі добрае.

Тым больш што Мікітавіч гэтага варты: і дом ён добры паставіў, і дрэў за жыццё насадзіў, і па дзецях «план» перавыканаў. Тут яго ніхто не папракне: дапамог і дочкам, і сыну атрымаць адукацыю, справіць вяселлі, нават унукаў крыху пагадаваў...

А потым, ці не стаміўся? Выпіваць стаў — можна сказаць па-чорнаму. Жонка за траіх нагаравалася, бо не было больш ні міру, ні ладу, ні падмогі якой...

Не бачыў ніхто і немаленькіх бацькавых грошай — усе прапіваліся: якраз тады, калі з дзецьмі, але без мужа засталася адна дачка, якраз тады, калі па вушы ў крэдытах, не зводзячы канцы з канцамі, жыў сын.

Яны — добрыя дзеці, інтэлігентныя: на бацьку (ва ўсякім разе ў голас) ніколькі не крыўдуюць. А ў глыбіні душы...

Поцемкі там і боль.

Калі б не піў, — пажыў бы, пацешыўся, падтрымаў, дапамог.

Не захацеў.

## ЗЛАЧЫНСТВА І ПАКАЯННЕ

Субота. Кухня. Бліны: лыжка алею ў цеста, скрылік сала на падмазку і следам — нязменны ўспамін.

Год — 45—46-ы, вёска, раніца. Адзін з «вечна галодных» хлопчыкаў-сірот трапляе ў багацейшую хату, у кухню, дзе... пякуцца бліны. Талерка з імі стаіць на прыпечку злева — можна сказаць, на вачах у гаспадыні, падмазка — блішчучая, пахкая — ляжыць справа і як бы збоку ад яе...

Таму дзіця і не стрымалася: ухапіла яе, укінула ў рот і далося за дзверы...

Гаспадыня даганяць не стала (голад, як вядома, не цётка), некаму нешта казаць — таксама. Яна пра гэты выпадак, можа, заўтра забылася, а вось хлопчык — не. Бо падросшы і атрымаўшы першыя грошы, ён прывёз «пацярпелай» каробку цукерак і бутэльку шампанскага — кампенсаваў страты.

Значыць, помніў свой грэх і хацеў даравання.

## АДЗІН ЛАПАЦЬ, ДРУГІ ЧУНЬ

Сіноптыкі кажуць (што здзіўляе — самі!..) што яны, як тыя сапёры, памыляюцца толькі адзін раз, але кожны дзень.

Кіроўцы з падобнымі «замашкамі», відаць, загінулі б — прычым у першы ж працоўны, хірурга ці кухара звольнілі б на другі, журналіста (у залежнасці ад памылак) — максімум — на трэці... Бо нельга памыляцца — ні шаўцу, ні краўцу, ні маляру, ні муляру...

І толькі сіноптыкам...

Шторанак слухаючы іх, адна аўцючка на правую нагу абувала валёнак, на левую — бот, бо што рабіць, калі месцамі снег, а месцамі дождж?

Так і хадзіць?

## ПЕРАД ВЫБАРАМ

Дурная мода: знізу і на босыя ногі, лічы (бо шкарпэтачкі як слядкі) — абутак, трохі вышэй — такія ж кароткія (да костачак) нагавіцы-рэзанкі. У некага дзіркі на іх невялікія і толькі на сцёгнах альбо на каленях. У падлетка-суседа — па ўсёй калашыне. І гэта, як трэба разумець, «крута», бо хлопец ну вельмі фарсіў! Праўда, у цёплыя дні.

У халодныя — бачыла — ён пад тыя «рэзанкі» споднікі надзеў.

Цікава: бабуля прымусіла ці ў самога паміж здароўем і «круцізной» хапіла розуму выбраць важнейшае?

## ХТО ШУКАЕ...

«Мая Марыйка замуж ідзе, — пахвалілася ўвосень Ніна і ціха дадала, — здаецца».

Трэба разумець, не паверыла яшчэ, што гэта праўда (бо дачка — першакурсніца, з вёскі...)? А можа, сурочыць баялася, бо хлопец, па ўсім выглядае, сур'ёзны. Да таго ж — з грашыма, са сваім жытлом.

Ніна ў яго кватэры ўжо тройчы была. Прымаў — як належыць: частаваў, будучым жонкы і цешчы паказваў горад, вадзіў у свае любімыя кавярні, у тэатры...

Апошні прыезд таксама сплананаваў — чын чынам. І ўсё, відаць, атрымалася б, калі б у дачкі не разбалеўся зуб. Факт, што маладым зранку прыйшлося ехаць да знаёмага стаматолага. А госця сама (бо не маленькая і ў Мінску ў свой час вучылася) рушыла ў горад.

Збіралася проста пагуляць па вуліцах — зазірнуць у нейкія крамкі, з'есці марозіва, пагледзець на людзей... Аднак да гэтага не дайшло, бо вельмі хутка позірк яе ўпёрся ў шыльду «Салон прыгажосці».

Не ўтрымалася — зазірнула ў адкрытыя насцеж дзверы, спытала, колькі ў іх каштуе... Ну, напрыклад, валасы пафарбаваць?

— Вам у адзін колер? — удакладніла адміністратарка.

— Ну, — кіўнула жанчына (прыкінуўшы, што можна, відаць, і ў тры?).

— Трыццаць рублёў... І можна зараз... Праходзьце!

— Дзякуй, не трэба, — сказала Ніна, скіраваўшы да выхада і тут жа... пашкадаваўшы, бо грошы з сабою былі і аддаць іх — сапраўднаму майстру, у сталічным салоне — яна магла... (Не ўсё ж фарбавацца ў суседкі...)

Пакуль разважала так, дайшла да іншай цырульні, зноў, што называецца, усунула нос: спытала, колькі каштуе фарбаванне.

— Пятнаццаць рублёў, — усміхнулася мілая гаспадыня.

І Ніна (ну яшчэ б — такая халява!) тут жа села ў крэсла.

Што важна, устала з яго іншым чалавекам: да твару былі і новы колер валасоў, і лёгкая ўкладка... Зяць з дачкой засыпалі кампліментамі! Ды і сама яна рада была. Пакуль не ўбачыла, што цырульні ў сталіцы — на кожным кроку. І калі б яна адышлася далей...

Хто пытае, той не блудзіць, хто шукае, — знойдзе?

## БОГ ВЫБІРАЕ, КАГО ЗАБІРАЕ

...У пятай палаце і хворых пяць — пераважна цяжкіх, бо, па-першае, усе яны «з-пад нажа» хірурга, бо, па-другое, ужо немаладыя — каму за 50, а каму і за 70. Аднак неяк трымаюцца: ва ўсякім разе на лёс не скардзяцца і не стогнуць. А вось навенькі, шосты — той зусім раскіс: баіцца аперацыі, па мабільніку (вушы ж не заткнеш) расказвае ўсім, што зараз яго павязуць і невядома яшчэ, што будзе.

— Ды кінь ты... Абыдзецца, — разважаюць яго мужыкі. — Хірургі тут добрыя, аперацыя ў цябе лёгкая — мы не такія перажылі...

— Дык вам што?! — абураецца хлопец. — Вам жа ўсё роўна, вы ж старыя ўжо. А я — малады, я жыць хачу.

...Можна падумаць, той, каму за 70, ужо не хоча.

## НА МЯЖЫ

Прыяцелька ў бальніцы, у анкалогіі. Не заўжды выпадае праведаць, але ж пазваніць — гэта святое.

Жанчына рада: ахвотна расказвае пра свае навіны, пра суседак па палаце, дактароў і медсястрычак, любіць пажартаваць, бо гэта, як высвятляецца, яшчэ і на... публіку.

— Ведаеш, мы з табой размаўляем, — прызнаецца яна пры сустрэчы, — а ўсе, хто побач, так слухаюць, — ну аж вушы тапырацца!.. Бо па-беларуску... Асобныя прызнаюцца, што вось так, жыўцом, першы раз гэтую мову чуюць...

Асобныя, можа, баяцца, што ўжо і апошні?

## ЖАХІ НАШАГА ДВАРА

...Каляжанка пад уражаннем: з'ездзіла ва Украіну, у Львоў. Прычым шопінг там яе мала цікавіў. Куды больш — помнікі архітэктуры, музеі, карцінныя галерэі, так званыя дворыкі — мастакоў і жахаў.

У апошнім, расказвала, старыя дзіцячыя цацкі сабраны: бязрукія ды бязногія лялькі, «сляпыя» львы, розныя коцікі-сабачкі-мядзведзікі то без лап, то без поўсці, «падвешаны» дзед Мароз... Сумнае, карацей, відовішча.

У двары анкалагічнай бальніцы лялек няма. Там — ды ў добрае надвор'е — людзі, іх шмат. Побач амаль — на самай блізкай лавачцы — ну вельмі сімпатычная пара. Сужэнцы, відаць, абодвум — каля 50, статныя, рослыя. З імі — прыгажуня-дачушка, гадоў 20, з перавязаным шыйкай. Пасля аперацыі, трэба разумець: пухліна была на так званай шчытавідцы...

Непадалёк ад іх яшчэ адна лавачка і яшчэ адна пара — ужо іншая: абое худзенькія, невялічкія — больш, чым 50 (на дваіх) ну ніяк не дасі!

Насамрэч яны трохі старэйшыя і па сённяшнім часе — шматдзетныя: тром сыночкам пашчасціла — падраслі ва грудным малацэ, бо цяпер грудзей у мамы няма, абедзвюх.

А вось у той маладзіцы (яна не замужам) ёсць — як быццам... Ва ўсякім разе адна. Замест другой — так званы імплант. Ён вельмі дрэнна прыжываецца. Каб лепш, каб не было рэцыдыву, гэтай жанчыне курс уколаў параілі — коштам 12 тысяч долараў...

Гэтыя ды іншыя жахі — не ў іншым горадзе, не за мяжой. Яны — побач.

Пад Богам. Усе...

**Валянціна ДОЎНАР**

■

Статусбанк

## ОАО «Статусбанк»

www.stbank.by

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 апреля 2018 г.

*(в тысячах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | На 01.04.2018 г. | На 01.04.2017 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | | 7 030 | 5 029 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | | 1 994 | 1 545 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | | 1 923 | 14 616 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | | 30 643 | 19 922 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | | 50 449 | 52 513 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | | - | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | | - | - |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | | 3 149 | 2 948 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | | 86 | - |
| 12 | Отложенные налоговые активы | 1111 | | - | - |
| 13 | Прочие активы | 1112 | | 1 060 | 416 |
| **14** | **ИТОГО активы** | **11** | | **96 334** | **96 989** |
| **15** | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 16 | Средства Национального банка | 1201 | | - | - |
| 17 | Средства банков | 1202 | | 1 385 | 4 179 |
| 18 | Средства клиентов | 1203 | | 36 344 | 27 531 |
| 19 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | | 928 | 10 637 |
| 20 | Производные финансовые обязательства | 1205 | | - | - |
| 21 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | | - | - |
| 22 | Прочие обязательства | 1207 | | 1 280 | 1 027 |
| 23 | ВСЕГО обязательства | 120 | | 39 937 | 43 374 |
| **24** | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | | |
| 25 | Уставный фонд | 1211 | | 43 000 | 43 000 |
| 26 | Эмиссионный доход | 1212 | | - | - |
| 27 | Резервный фонд | 1213 | | 11 308 | 8 504 |
| 28 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | | 173 | 193 |
| 29 | Накопленная прибыль | 1215 | | 1 916 | 1 918 |
| 30 | ВСЕГО капитал | 121 | | 56 397 | 53 615 |
| **31** | **ИТОГО обязательства и собственный капитал** | **12** | | **96 334** | **96 989** |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ на 1 апреля 2018 г.

*(в тысячах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | На 01.04.2018 г. | На 01.04.2017 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 3 559 | 4 384 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 451 | 619 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | | 3 108 | 3 765 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 532 | 403 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 90 | 31 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | | 442 | 372 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | | (4) | (5) |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | | 894 | 798 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | | - | (40) |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | | 60 | 738 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | | 303 | 240 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | | 3 489 | 3 126 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | | 93 | 92 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | | 1 101 | 1 174 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | | 292 | 315 |
| **17** | **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)** | **2** | | **809** | **859** |

Председатель Правления В. А. Драгун

Главный бухгалтер С. С. Ящук

Дата подписания: 18 апреля 2018 г.

Лицензия Национального банка Республики Беларусь на осуществление банковской деятельности № 26 от 25.05.2017 г. УНП 807000043

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС общества с ограниченной ответственностью «Форвард-Брокер» за 2017 год

220007, г. Минск, ул. Авакяна, 19, пом. 191, к. 14, тел./факс (017) 228-12-89

*(в тыс. бел. руб.)*

| Активы | Код строки | На 31 декабря 2017 года | На 31 декабря 2016 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Основные средства | 110 | 106 | 121 |
| Запасы | 210 | 9 | 8 |
| Расходы будущих периодов | 230 | 1 | 41 |
| Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам | 240 | 15 | 15 |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 49 | 18 |
| Денежные средства и эквиваленты денежных средств | 270 | 268 | 256 |
| **БАЛАНС** | **300** | **448** | **459** |

| Собственный капитал и обязательства | Код строки | На 31 декабря 2017 года | На 31 декабря 2016 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Уставный капитал | 410 | 35 | 35 |
| Добавочный капитал | 450 | 151 | 141 |
| Нераспределенная прибыль | 460 | 234 | 159 |
| Отложенные налоговые обязательства | 530 | 12 | - |
| Краткосрочная кредиторская задолженность | 630 | 16 | 19 |
| Доходы будущих периодов | 650 | - | 105 |
| **БАЛАНС** | | **448** | **459** |
| | | | |

### ОТЧЕТ о прибылях и убытках общества с ограниченной ответственностью «Форвард-Брокер» за 2017 год

*(в тыс. бел. руб.)*

| Наименование показателя | Код строки | За январь – декабрь 2017 года | За январь – декабрь 2016 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 010 | 869 | 1 014 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг | 020 | (66) | (64) |
| Валовая прибыль (010-020) | 030 | 803 | 950 |
| Управленческие расходы | 040 | (254) | (251) |
| Прибыль от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 060 | 549 | 699 |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 070 | - | - |
| Прочие расходы по текущей деятельности | 080 | - | - |
| Прибыль от текущей деятельности | 090 | 549 | 699 |
| Доходы от инвестиционной деятельности | 100 | 13 | 25 |
| в том числе: доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 101 | - | - |
| проценты к получению | 103 | 13 | 25 |
| Расходы по инвестиционной деятельности | 110 | - | - |
| Доходы по финансовой деятельности | 120 | 136 | - |
| в том числе: курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 121 | 136 | - |
| Расходы по финансовой деятельности | 130 | (54) | - |
| в том числе: курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 132 | (54) | - |
| Прибыль от инвестиционной и финансовой деятельности | 140 | 95 | 25 |
| Прибыль до налогообложения | 150 | 644 | 724 |
| Налог на прибыль | 160 | (104) | (130) |
| Изменение отложенных налоговых обязательств | 180 | (12) | |
| Чистая прибыль | 210 | 528 | 594 |
| Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль | 220 | 10 | 15 |
| Совокупная прибыль | 240 | 538 | 609 |

**Годовая индивидуальная отчетность ООО «Форвард-Брокер» за 2017 год в полном объеме размещена на интернет-сайте vipinsurance.by.**

### АУДИТОРСКОЕ ЗАКЛЮЧЕНИЕ по бухгалтерской отчетности Общества с ограниченной ответственностью «Форвард-Брокер» за период с 1 января 2017 г. по 31 декабря 2017 г.

*Директору*
*Сергееву Сергею Леонидовичу*

АУДИТОРСКОЕ МНЕНИЕ

Наименование аудируемого лица: Общество с ограниченной ответственностью «Форвард-Брокер» (ООО «Форвард-Брокер»)

Местонахождение: 220007, г. Минск, ул. Авакяна, д. 19, пом. 191, комн. 14

Сведения о государственной регистрации: зарегистрировано Министерством финансов Республики Беларусь 21 апреля 2006 г., регистрационный номер в едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей № 806000181.

Мы провели аудит прилагаемой бухгалтерской отчетности ООО «Форвард-Брокер», состоящей из бухгалтерского баланса на 31 декабря 2017 г., отчета о прибылях и убытках, отчета об изменении собственного капитала, отчета о движении денежных средств за год, закончившийся на указанную дату, а также примечаний к бухгалтерской отчетности.

По нашему мнению, бухгалтерская отчетность ООО «Форвард-Брокер» достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение ООО «Форвард-Брокер» на 31 декабря 2017 г., а также финансовые результаты его деятельности и изменения его финансового положения, в том числе движение денежных средств, за год, закончившийся на указанную дату, в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь.

ОСНОВАНИЕ ДЛЯ ВЫРАЖЕНИЯ АУДИТОРСКОГО МНЕНИЯ

Мы провели аудит в соответствии с требованиями Закона Республики Беларусь от 12 июля 2013 года «Об аудиторской деятельности» и национальных правил аудиторской деятельности. Наши обязанности в соответствии с этими правилами описаны далее в разделе «Обязанности аудиторской организации по проведению аудита бухгалтерской отчетности». Нами соблюдались принцип независимости по отношению к ООО «Форвард-Брокер» согласно требованиям законодательства и нормы профессиональной этики. Мы считаем, что полученные аудиторские доказательства являются достаточными и надлежащими, чтобы служить основанием для выражения аудиторского мнения.

ОБЯЗАННОСТИ АУДИРУЕМОГО ЛИЦА ПО ПОДГОТОВКЕ БУХГАЛТЕРСКОЙ ОТЧЕТНОСТИ

Руководство ООО «Форвард-Брокер» несет ответственность за подготовку и достоверное представление бухгалтерской отчетности в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь и организацию системы внутреннего контроля, необходимой для подготовки отчетности, не содержащей существенных искажений, допущенных вследствие ошибок и (или) недобросовестных действий.

При подготовке бухгалтерской отчетности руководство несет ответственность за оценку способности ООО «Форвард-Брокер» продолжать свою деятельность непрерывно и уместности применения принципа непрерывности деятельности при подготовке отчетности, а также за надлежащее раскрытие в отчетности в соответствующих случаях сведений, относящихся к непрерывности деятельности, за исключением случаев, когда руководство намеревается ликвидировать ООО «Форвард-Брокер», прекратить его деятельность или когда у него нет реальной альтернативы таким действиям.

ОБЯЗАННОСТИ АУДИТОРСКОЙ ОРГАНИЗАЦИИ ПО ПРОВЕДЕНИЮ АУДИТА БУХГАЛТЕРСКОЙ ОТЧЕТНОСТИ

Наша цель состоит в получении разумной уверенности в том, что отчетность ООО «Форвард-Брокер» не содержит существенных искажений вследствие ошибок и (или) недобросовестных действий, и составлении аудиторского заключения, включающего выраженное в установленной форме аудиторское мнение. Разумная уверенность представляет собой высокую степень уверенности, но не является гарантией того, что аудит, проведенный в соответствии с национальными правилами аудиторской деятельности, позволяет выявить все имеющиеся существенные искажения. Искажения могут возникать в результате ошибок и (или) недобросовестных действий и считаются существенными, если можно обоснованно предположить, что в отдельности или в совокупности они могут повлиять на экономические решения пользователей отчетности, принимаемые на ее основе.

В рамках аудита, проводимого в соответствии с национальными правилами аудиторской деятельности, мы применяем профессиональное суждение и сохраняем профессиональный скептицизм на протяжении всего аудита.

В процессе проведения аудита мы выполняем следующее:

– выявляем и оцениваем риски существенного искажения отчетности вследствие ошибок и (или) недобросовестных действий; разрабатываем и выполняем аудиторские процедуры в соответствии с оцененными рисками; получаем аудиторские доказательства, являющиеся достаточными и надлежащими, чтобы служить основанием для выражения аудиторского мнения. Риск необнаружения существенных искажений отчетности в результате недобросовестных действий выше риска необнаружения искажений в результате ошибок, так как недобросовестные действия, как правило, подразумевают наличие специально разработанных мер, направленных на их сокрытие;

– получаем понимание системы внутреннего контроля аудируемого лица, имеющей значение для аудита, с целью планирования аудиторских процедур, соответствующих обстоятельствам аудита, но не с целью выражения мнения относительно эффективности функционирования этой системы.

– оцениваем надлежащий характер применяемой аудируемым лицом учетной политики, а также обоснованности учетных оценок и соответствующего раскрытия информации в отчетности;

– оцениваем правильность применения руководством аудируемого лица допущения о непрерывности деятельности и на основании полученных аудиторских доказательств делаем вывод о том, имеется ли существенная неопределенность в связи с событиями или условиями, в результате которых могут возникнуть значительные сомнения в способности аудируемого лица продолжать свою деятельность непрерывно. Если мы приходим к выводу о наличии существенной неопределенности, мы должны привлечь внимание в аудиторском заключении к соответствующему раскрытию данной информации в отчетности. В случае если такое раскрытие информации отсутствует или является ненадлежащим, мы должны модифицировать аудиторское мнение. Наши выводы основываются на аудиторских доказательствах, полученных до даты подписания аудиторского заключения, однако будущие события или условия могут привести к тому, что аудируемое лицо утратит способность продолжать свою деятельность непрерывно;

– оцениваем общее представление отчетности, ее структуру и содержание, включая раскрытие информации, а также того, обеспечивает ли отчетность достоверное представление о лежащих в ее основе операциях и событиях.

Мы осуществляем информационное взаимодействие с лицами, наделенными руководящими полномочиями, доводя до их сведения, помимо прочего, информацию о запланированных объеме и сроках аудита, а также о значимых вопросах, возникших в ходе аудита, в том числе о значительных недостатках системы внутреннего контроля, если мы выявляем таковые в процессе аудита.

Мы предоставляем лицам, наделенным руководящими полномочиями, заявление о том, что нами были выполнены все требования в отношении соблюдения принципа независимости и доведена до их сведения информация обо всех взаимоотношениях и прочих вопросах, которые можно обоснованно считать угрозами нарушения принципа независимости, и, если необходимо, обо всех предпринятых мерах предосторожности.

Директор
Частного предприятия «Аудит-конто» Гапанович А. Г.
Аудитор Летецкая Е. В.

СВЕДЕНИЯ ОБ АУДИТОРСКОЙ ОРГАНИЗАЦИИ:

Наименование: частное аудиторское унитарное предприятие «Аудит-конто»

Местонахождение: 220004, г. Минск, ул. Сухая, д. 3, каб. 504

Сведения о государственной регистрации: зарегистрировано Минским горисполкомом 01.02.2007 г., регистрационный номер в едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей № 190799512.

Дата подписания аудиторского заключения:
15 марта 2018 г. УНП 806000181

## РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки» извещает о проведении 28 мая 2018 г. в 10.00 открытого аукциона по продаже объекта недвижимости – здания магазина «Спутник» со складом, расположенного по адресу: Гомельская обл., Лельчицкий р-н, г. п. Лельчицы, ул. Советская, 80Б, принадлежащего Лельчицкому районному потребительскому обществу на праве собственности

| № лота | Наименование объекта | Краткая характеристика объекта | Начальная цена, руб. (в т. ч. НДС по ставке 20 %) | Задаток, руб. (в т. ч.НДС по ставке 20 %) |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Здание магазина «Спутник», инв. № 334/С-1106 | Назначение: здание специализированное розничной торговли. Одноэтажное кирпичное строение 1999 года постройки. Общая площадь 68,0 кв. м. Составные части и принадлежности: склад | 25 800,00 | 2 580,00 |

***Земельный участок** для обслуживания здания на праве постоянного пользования площадью **0,0176 га** с кадастровым номером 322855100002000020. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь*

Шаг аукциона – 5 %. Место проведения аукциона: г. Гомель, ул. Артема, 23. Заявления на участие в аукционе с приложением необходимых документов принимаются по адресу: **г. Гомель, ул. Артема, 23, 2-й этаж, каб. 2–6** по рабочим дням с 9.00 до 12.00 и с 13.00 до 16.00 **по 25 мая 2018 г. включительно**. Подача документов по почте не допускается. Заявления, поступившие позже установленного срока, не рассматриваются.

В аукционе имеют право участвовать юридические и физические лица, а также индивидуальные предприниматели, своевременно подавшие заявление на участие в аукционе с приложением необходимых документов, внесшие задаток по заявляемому лоту до подачи заявления и прошедшие заключительную регистрацию с 09.00 до 10.00 **28 мая 2018 г**. Допускается участие на стороне покупателя консолидированных участников.

Аукционные торги проводятся в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь и Положением о порядке организации и проведения аукционов, утвержденным Организатором торгов.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену на аукционе; лицом, приравненным к победителю, признается единственный зарегистрированный участник, выразивший согласие купить Объект по начальной цене, увеличенной на 5 %.

**При подаче заявления участник должен иметь**: 1) копию платежного поручения с отметкой банка, подтверждающего внесение задатка для участия в аукционе; 2) физическое лицо – паспорт; представитель физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность; представитель юридического лица (резидента РБ) – паспорт (руководитель – копию документа о назначении на должность), доверенность на участие в аукционе и подписание документов, копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации организации и их подлинники для заверения их копий организатором аукциона; консолидированные участники дополнительно предоставляют копию договора о совместном участии в аукционе с предъявлением оригинала этого договора; представитель юридического лица (нерезидента РБ) – легализованные в установленном порядке доверенность на участие в аукционе и подписание документов (руководитель – копию документа, подтверждающего назначение на должность), копии учредительных документов и выписку из государственного (торгового) реестра юридических лиц страны происхождения (выписка должна быть датирована не позднее шести месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на белорусский (русский) язык. В случае отсутствия у физического лица текущего счета необходимо его открыть.

Задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления на **р/с BY84ALFA30122305700080270000 в ЗАО «Альфа-Банк», г. Минск, BIC: ALFABY2X. Получатель платежа – РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки». УНП 490318588. Назначение платежа:** задаток для участия в аукционе **по лоту № 1** согласно извещению в газете «Звязда» от 26 апреля 2018 г.

Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшими победителем (лицом, приравненным к победителю), будет засчитан в счет окончательной стоимости Объекта. Задаток, уплаченный участниками аукциона, не ставшими победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю), Организатор торгов возвращает безналичным платежом на их счета в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

**Победитель торгов (лицо, приравненное к победителю) обязан**: в течение 3 рабочих дней после подписания протокола о результатах аукциона уплатить Организатору аукциона вознаграждение по результатам аукциона в размере 4 % от окончательной цены продажи Объекта; в течение 15 календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта; в сроки согласно заключенному договору купли-продажи выплатить Продавцу стоимость Объекта, сформированную в установленном порядке. Если между Продавцом и Победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи Объекта, не достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты за Объект, такая оплата должна быть произведена в течение 30 рабочих дней с момента заключения договора купли-продажи Объекта.

**Организатор: РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки», г. Гомель, ул. Артема, 23. 8 (0232) 32-46-47; 32-18-95 • www.gino.by • e-mail: info@gino.by**
**Продавец: Лельчицкое райпо, Гомельская обл., г. п. Лельчицы, ул. Советская, 64. 8 (02356) 5-01-82, 2-03-58, 2-07-70.**

## Вниманию акционеров ОАО «Элема»!

Наблюдательный совет ОАО «Элема» доводит до сведения акционеров, что 03.05.2018 г. состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Элема»:

– место проведения собрания – г. Минск, ул. Тростенецкая, 5А, Дом культуры ОАО «Элема»;

– время начала собрания – 12.00;

– время и место регистрации участников собрания: в день проведения собрания с 11.00 до 11.50 по адресу: г. Минск, ул. Тростенецкая, 5А, Дом культуры ОАО «Элема»;

– время и место ознакомления акционеров с документами по вопросам повестки дня собрания: в рабочие дни (понедельник–пятница), начиная с 25.04.2018 г. по 02.05.2018 г., по месту нахождения ОАО «Элема»: г. Минск, ул. Тростенецкая, 5 (приемная директора) с 9.00 до 15.00; 03.05.2018 г. – по месту проведения собрания с 9.00 до 12.00.

**Повестка дня**

1. О продаже акций ОАО «Элема» инвесторам на условиях, предусмотренных бизнес-планом.

Список лиц, имеющих право на участие в собрании, будет составлен по состоянию на 25.04.2018 г.

Просим принять участие в собрании или поручить представлять Ваши интересы на собрании акционеров представителю. Для участия в собрании акционеру необходимо при себе иметь паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность, оформленную в соответствии с требованиями законодательства, либо иной документ, подтверждающий его полномочия в качестве представителя.

Дополнительная информация по телефонам: + 375 29 332 72 91, + 375 17 364 73 09.

УНП 100074549



## ЯК ДАЖЫЦЬ ДА СТА І НЕ СТАМІЦЦА?

Гэтымі днямі я шмат думаю пра жыццё і смерць. І зусім не выпадкова. Толькі за апошнія паўгода памерла некалькі маіх знаёмых ва ўзросце да 60 гадоў...

«А колькі нежывых людзей сустракаецца на вуліцах, — прымушае задумацца глыбей Святлана Зэрэ, стваральніца Вышэйшай жаночай школы. — Нежывых не ў прамым сэнсе, а ў пераносным. Яны фізічна жывыя, але энергетычна ад іх вее смерцю, вочы патухлыя, інтарэс да жыцця страчаны».

Нядаўна муж прапанаваў паглядзець натхняльны фільм пра Акінаву. Гэты японскі востраў — сусветны рэкардсмен па колькасці доўгажыхароў.

Кардыёлаг Макота Сузукі пераехаў на сонечную Акінаву з Токіа ў 1972 годзе. Сталічны медык сутыкнуўся з нечаканай праблемай: большасць з яго падапечных... не мела патрэбы ў лячэнні, нават калі ім ужо споўнілася 100 гадоў. «Я чуў, што ў адной вёсцы жыве стагадовая Камэ Сан. Паехаў туды на аўтобусе. На прыпынку сустрэў пажылую жанчыну. Яна ішла з вялікімі кашамі за спінай. Запытаўся ў яе: «Дзе мне знайсці Камэ Сан?» — «Гэта я». Мы сталі размаўляць, і аказалася, што яе суседцы нядаўна таксама споўнілася 100 гадоў. Гэта было неверагодна. Два стагадовыя чалавека жылі на адной вуліцы і былі абсалютна здаровыя». Сёння Макота Сузукі — герантолаг з больш як саракагадовым стажам. Ён сцвярджае, што генетыка ды клімат маюць значэнне, але не вырашальнае. Таму працягласць нашага жыцця ў руках кожнага з нас.

Пасля прагляду фільма я вывела для сябе формулу выключнага здароўя і доўгажыхарства акінаўцаў.

Па-першае, на востраве прытрымліваюцца старадаўняй традыцыі Хара Хачы Бу — «не трэба запаўняць страўнік поўнасцю, заўсёды пакідайце крыху месца». Хамамота Хейсаа, у свае 78 гадоў ён адзін з запатрабаваных выкладчыкаў баявых майстэрстваў на Акінаве, кажа: «Я ем усё, але ніколі не аб'ядаюся. Каб я мясам аб'еўся, такога наогул ніколі не было». Як вынік, мясцовыя доўгажыхары практычна не хварэюць на рак страўніка.

Па-другое, працягнуць жыццё могуць дружная сям'я і шырокае кола зносін. Ёхене Шыге 100 гадоў. Амаль увесь вольны час доўгажыхарка бавіць на пляжы. «Мы тут з суседзямі часта збіраемся. Сядзім на пяску, размаўляем. Калі няма вялікіх хваляў, я з суседкай у мора выходжу. Я яшчэ сама грабці магу. Яшчэ мы з аднавяскоўцамі разам спяваем караоке. Для таго каб доўга жыць, каб не стаць «агароднінай», трэба да ўсіх добра ставіцца, не трымаць ні на кога зла, мець шмат сяброў. Асабіста я застаюся адна, толькі калі ем».

Яшчэ адным унікальным складнікам акінаўскага доўгажыхарства з'яўляецца ікегай. У прыватнасці, 93-гадовы Ямакава Фуміясу не ўяўляе свайго жыцця без спорту. Фірменнае практыкаванне доўгажыхара — стойка на галаве. Яго акінавец упершыню выканаў у 40 гадоў. «Рэгулярна бегаць я пачаў у 55. У 69 даведаўся, што ў нас праводзяцца спаборніцтвы для пенсіянераў па лёгкай атлетыцы. З тых часоў я ў іх удзельнічаю». У сціплай кватэры доўгажыхара не знойдзеш прадметаў раскошы. Галоўная каштоўнасць — калекцыя спартыўных узнагарод. За апошнія 20 гадоў дзядуля 139 разоў падымаўся на п'едэстал. Зараз рыхтуецца ўстанавіць рэкорд па кіданні молата для пажылых. Галоўная ж мара — выйсці на бегавую дарожку ў 100 гадоў. «Я не займаюся атлетыкай для здароўя. Я здаровы менавіта таму, што атрымліваю задавальненне ад любімай справы. Гэта тое, дзеля чаго я жыву. У нас на Акінаве гэта называецца ікегай».

Вучоныя, якія рабілі фільм пра акінаўскіх доўгажыхароў, здзіўляліся: «Мы ні разу не чулі ад герояў, што яны пакутуюць ад старасці. Нават у стагадовым узросце гэтыя людзі працягваюць строіць планы на будучыню».

Для параўнання: мая бабуля апошнія 10 гадоў жыцця штораз, калі я прыязджала да яе, паўтарала адну і тую фразу: «Відаць, унучанька, апошні раз з табой бачымся...»

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**


# Сямейная газета

**Выпуск № 8 (99)**


■ Тыя, хто побач

# СТАЛІЧНЫ ЭКСКЛЮЗІЎ



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

*(Працяг на 5-й стар. «СГ».)*

■ Сустрэча без абзацаў

## Ірына ПУШКАРОВА:

# «МЯНЕ ТРЭБА ХВАЛІЦЬ»

**Пакуль дырэктар сямейнага інклюзіў-тэатра «і» заварвае для мяне свой любімы напой — каву, не губляю часу. Прашу Ірыну назваць тры словы, з якімі яна сябе асацыюе. «Пуанты, дзеці, — адказала практычна не раздумваючы. — А яшчэ сабака і чатыры каты — яны непадзельныя *(смяецца)*.**



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

### Пра кашмары, аркестравую яму ды прыма-балерыну

**На працягу ўсяго жыцця мяне пераследуюць кашмары.** То сніцца, што я не змяшчаюся ў пачку, то заходжу перад спектаклем у грымёрку і бачу, што тасёмкі не прышытыя да пуантаў...

**Мая мама — прыма-балерына.** Яна выконвала першыя ролі, доўгі час выкладала ў харэаграфічным вучылішчы і толькі два гады таму пайшла на пенсію. Таму ўсё дзяцінства я прасядзела ў аркестравай яме. Памятаю, падчас рэпетыцый да мяне падыходзілі маміны калегі — такія зорныя, з апломбам. Казалі: «Ну што, дзетка, будзеш ты ў нас балерынай». А я адказвала: «Ды не, наогул у гэтай сталовай есці не хачу».

**Калі мне было 10 гадоў, бацькі сказалі:** «Ведаеш, мы ўжо не маладыя, таму хочам, каб ты атрымала прафесію, якая пачне карміць, як мага раней. Выбачай, але аддаём цябе ў харэаграфічнае вучылішча». Яны ведалі, што я марыла быць скульптарам.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «СГ».)*


Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

> БЛІЦ-АПЫТАНКА

***— Праектамі для асаблівых дзетак займаюцца пераважна іх ініцыятыўныя бацькі. Але інклюзіў-тэатр не той выпадак: у вас, наколькі я ведаю, здаровыя сыны.***

— Дзякуй богу. І гэта вялікі плюс у такой справе. Калі бацькі прыходзяць і робяць штосьці ад болю, гэта адно бачанне. Хочацца, каб нас, тых, хто штосьці робіць для дзетак з аўтызмам проста з жадання дапамагчы, станавілася больш.

***— Вашае месца сілы?***

— Лес.

***— Што для вас грошы?***

— Магчымасці. Калі б у мяне з'явілася шмат грошай, у тэатра былі б іншыя памяшканні, іншыя касцюмы. Дзяцей бы вывезлі за мяжу на гастролі. Яны павінны выступаць на розных сцэнах. З-за таго, што з фінансамі ўсё няпроста, мы не змаглі мінулым летам з'ездзіць у Італію. І ў Галандыю мне давялося ехаць адной, без дзяцей, з відэапрэзентацыяй.

***— Самы шчаслівы дзень у вашым жыцці?***

— Іх шмат. Як для маці — дні нараджэння дзяцей. Як для кіраўніка тэатра — поспехі акцёраў. Хтосьці не гаварыў і загаварыў ці нейкі новы рух асвоіў... Гэта вялікае шчасце. У такія моманты я разумею, дзеля чаго жыву.

***— Калі вы апошні раз плакалі?***

— Апошнім часам пастаянна плачу, калі расказваю пра дзяцей. Калі з імі працуеш штодзень, гэта звычайная працэй. А гаварыць пра поспехі дзяцей, калі іх не бачыш, цяжка. Адразу ж ком у горле ды слёзы на вачах. Вядома, слёзы радасці.

***— Самае вялікае ваша дасягненне?***

— Самае вялікае, напэўна, наперадзе.

# «МЯНЕ ТРЭБА ХВАЛІЦЬ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

**Я скончыла харэаграфічнае вучылішча на выдатна. Не таму, што мела выключныя даныя,** — у асноўным дзякуючы стараннасці і ўпартасці. Таго, што астатнім давалася лёгка, я дабівалася шматгадзіннымі трэніроўкамі. Проста не магла не апраўдаць чаканні бацькоў.

**Калі я з'явілася на свет, маёй маме было 40 гадоў.** Быць познім дзіцем вялікая адказнасць. Мама часта паўтарала: «Калі б я цябе не нарадзіла, мне б яшчэ і народную СССР далі». Яна на той час ужо мела званне народнай артысткі БССР. Ёй казалі: «Ты яшчэ годзік патанцуй». Але яна вырашыла нарадзіць. З самага дзяцінства я адчувала вялікую адказнасць, бо з-за мяне маме не дасталася высокае званне. Таму старалася радаваць бацькоў, з пяці гадоў ужо нарэзала салаты, прыбіралася ў кватэры...

**Лічыцца, што пасля нараджэння дзіцяці практычна нерэальна вярнуцца на сцэну.** Таму многім маміным вучаніцам па 38 гадоў, а яны яшчэ ні разу не нараджалі. На сцэне не адчуваеш, як хутка ляціць час. Калі траўмы вымушаюць раней часу пакінуць балет, для многіх гэта трагедыя, бо аказваецца, табе столькі гадоў, а дзіцяці яшчэ няма... Я з такім, на шчасце, не сутыкнулася. Паехала працаваць у Польшчу. А там іншы культ быў сярод танцоўшчыц, усе хадзілі з дзеткамі. Вось я і праніклася духам мацярынства. Ніколькі не шкадую, што раней пакінула балет і нарадзіла, бо невядома, як склаўся б мой лёс.

**«Вельмі цяжка пераношу такія рэчы, калі бацькі не далі магчымасці дапамагчы дзіцяці».**

**На стварэнне ўласнай творчай студыі мяне натхніў малодшы сын.** У свой час аддала яго танцаваць у адну з мінскіх школ, дзе яму «завалілі зводы». Падрыхтоўка ступні, корпуса — усё гэта закладваецца ў першыя гады і павінна быць бездакорным. А калі класічнай харэаграфіі навучае педагог без чуцця ды падыходу да дзіцяці, гэта можа сапсаваць яму будучыню. У выніку я вырашыла ўзяць усё ў свае рукі. Падабрала спецыялістаў, у прафесіяналізме якіх не сумнявалася. Так з'явілася творчая студыя Ірыны Пушкаровай. Вырашылі навучаць дзяцей комплексна: харэаграфіі, вакалу, граць на музычных інструментах. Дзякуй богу, нікога не сапсавалі.

**У сваю студыю я прымала ў тым ліку і дзяцей з асаблівасцямі.** Яны займаліся разам з асноўнай групай. Аднойчы мне патэлефанавала Таццяна Якаўлева, якая ўзначальвае арганізацыю «Дзеці. Аўтызм. Бацькі», і прапанавала: «А давайце створым інклюзіў-тэатр. Гэта дапаможа дзецям». Ад такой прапановы немагчыма адмовіцца. З маіх калег ніхто не сумняваўся. А потым, калі ты бачыш, што тэатр сапраўды дапамагае... Гэта натхняе.

## Пра «іксатыя» ногі, стратэгічны запас пельменяў ды аднавокага ката

**Калі на вуліцы хтосьці крыкне «мама», заўсёды азіраюся.** У мяне, відаць, моцны мацярынскі інстынкт. Гэта такое вялікае шчасце, што я зараз увесь час працую з дзецьмі. Тэатр для мяне не работа. Гэта жыццё. Вялізны дзякуй мужу за разуменне. Гатаваць ён, праўда, так і не навучыўся. Калі ў мяне пачынаецца перыяд прэм'ер спектакляў, ён закупляе пельмені і складвае свой стратэгічны запас у маразілку *(смяецца)*. Зараз падрос старэйшы сын, дзякуй богу, ён цудоўна гатуе. Нядаўна тэлефаную: «Мамачка, ты ў колькі будзеш?» — «Ну, гадзіне а 10-й вечара, можа, а 11-й». — «Не перажывай, я сям'ю пакармлю».



**Мой муж не звязаны з тэатрам.** Але ў яго надзвычай «іксатыя» ногі — у балеце такія лічацца асабліва прыгожымі. У нас ёсць невялікае лецішча ў садаводчым таварыстве для тэатралаў. Дык напачатку ўсе мне праходу не давалі: «Вой, Іра, не магу прыгадаць, на якой сцэне бачыла твайго мужа. Скажы, дзе танцаваў?» І ніхто не можа паверыць, што ён не танцуе.

**Мой малодшы сын** заняты ў інклюзіў-тэатры на ўсю катушку. Ён і танцуе, і спявае... Яму магу цалкам даверыцца. Сказаць, напрыклад: «Ты выводзіш з той кулісы Максіма ці Кастуся...» І ведаю, што не падвядзе.

**Ганаруся сваім старэйшым сынам. Ён працуе цьютарам** — суправаджае дзіця з аўтызмам — у школе, а таксама дапамагае мне ў тэатры. Гэта штодзённая вельмі складаная работа, але ён спраўляецца. Гляджу, піша кожны дзень: «Максім сёння паглядзеў так, зрабіў тое...» Гэта, відаць, яго прызванне. Я вельмі паважаю выбар сына.

**Ніколі не прымушала сваіх дзяцей** чымсьці займацца. Цалкам магчыма, што я да гэтага вельмі мякка падыходжу. У старэйшага сына абсалютны слых, яго ў свой час нават адбіралі на скрыпку ў музычную школу, але ён не захацеў. Зараз жыць без музыкі не можа, увесь час ходзіць у навушніках. Нядаўна сказаў: «Мама, чаму ты мяне не прымусіла хадзіць у музыкалку?» Зараз разумею, што трэба было настаяць, бачачы яго яркі талент.

**Цярпець не магу хадзіць па крамах,** ды і часу на гэта шкада. У мяне ёсць сяброўка дзяцінства. Яна даўно ўжо жыве ў Швецыі. Перад сваім прыездам штораз тэлефануе і кажа: «Іра, прызнавайся, табе там зноў няма чаго насіць? Не перажывай, я хутка прыеду і ўсё прывязу». Аня ведае мой памер, клапоціцца пра мяне, як мамка, хоць мы аднагодкі з ёй.

**Усё жыццё прыцягваю да сябе** параненых ці бяздомных жывёл і птушак. Усе людзі як людзі: выйшлі ў двор і гуляюць сабе спакойна. А я знайшла вараняню. Яго трэба выхадзіць. Сабака — адзіны, каго я купіла свядома, бо я сабачніца. Коцікі ж прыходзяць самі. Праз наш дом ужо прайшло 17 вусатых знаходак. Усіх міленькіх разабралі, у нас дома засталіся чатыры — самыя непрывабныя, тыя, якіх нікуды не прыстроілі. Сярод іх — аднавокі кот, ён наогул не бачыць. Мае сябры, калі прыходзяць, кажуць: «Іра, ты б яму павязку якую надзела, бо страшна глядзець». Сям'я ўжо змірылася з гэтым, але дзеці часта паўтараюць: «Мама, дзякуй табе вялікі, у нас ніколі не будзе сваіх жывёл».

## Пра Уладу, скорагаворкі ды коўзкія прыступкі

**У нашым інклюзіўным тэатры 76 акцёраў. Сярод іх — 26 з аўтызмам.** Мы не дзелім дзяцей на асаблівых і звычайных. Бачым у першую чаргу не дыягназ, а чалавека і яго талент. А ён, гэта я ведаю дакладна, раскрываецца толькі ў атмасферы любові і даверу.

**Некаторыя бацькі, даведаўшыся, што ў тэатры будуць незвычайныя акцёры, забралі сваіх здаровых дзетак.** Сышло працэнтаў 30. Потым многія з іх вярнуліся. Убачылі, наколькі дзеці з аўтызмам таленавітыя.

**Улада даўно марыла стаць актрысай.** Малявала гэта. Прыйшла яна да нас не ў пяць, не ў 10, а ў 13 гадоў. Зусім не размаўляла, павольна, нязграбна хадзіла. Заходзіла ў рэпетыцыйную залу і ўжо праз хвіліну пачынала гучна крычаць, закрывала вушы і ўцякала. Пра яе ўсе казалі: «Іра, цудаў не бывае». Вы б бачылі, як іншыя дзеці хацелі, каб Улада сказала хоць адно слова, праваквалі на занятках. Міша кожнае практыкаванне ёй казаў: «Гавары, гавары!» Калі я першы раз пачула, што Улада на сцэне вымаўляе скорагаворкі, вырашыла, што я самы шчаслівы чалавек. Зараз яна разам з астатнімі ўдзельнічае ў рэпетыцыях, робіць харэаграфічныя элементы. Калі шчыра, я здзіўляюся такому прагрэсу за вельмі кароткі перыяд. Дзеці насамрэч здольныя на большае, чым мы думаем.

**Я свой тэлефон ніколі не адключаю,** у любы час дня і ночы адказваю на званкі. Бо ведаю, што гэта вельмі важна.

**Нярэдка бацькі дзетак з аўтызмам разлічваюць на імгненны вынік.** Прывяла мама свайго сына на рэпетыцыю, той дзесяць хвілін пазаймаўся, а ўвесь астатні час прасядзеў у куце. Гэта нармальна. Дзесяць хвілін для пачатку — гэта ўжо вельмі добра. Наступны раз будзе дзесяць з паловай. Але мама здалася і перастала прыводзіць дзіця.

**Вельмі цяжка пераношу такія рэчы,** калі бацькі не далі магчымасці дапамагчы дзіцяці. Разумею, што тут я ўжо нічога не магу зрабіць, гэтыя дзверы зачыненыя і тыя ды другі раз ужо не пагрукаеш.

**Раней думала, што паспяховы чалавек — гэта той, у якога, умоўна кажучы, ёсць шыкоўная кватэра, машына.** Зараз разумею, што мы, людзі, прыйшлі ў гэты свет зусім для іншага. А ад стэрэатыпаў трэба пазбаўляцца. Мы тады будзем значна больш шчаслівыя.

**Рэпетыцыя. У мікрафоны спяваюць толькі тыя дзеці, якія займаюцца вакалам.** Стаю за кулісамі і чую: нешта не тое. Разумею, што Міша, у якога цудоўны голас, даў свой мікрафон Кірылу, які ў якасці ніколі ў прынцыпе не спяваў. Спачатку хацела пасварыцца. А пасля думаю: «Якое пасварыцца? Гэта ж так важна. Гэта ж зусім іншыя людзі растуць».

**Асаблівае дзіця можна ўбачыць, калі гэта сіндром Даўна ці ДЦП. Аўтызм не бачны.** Ідзе па вуліцы прыгожае дзіця. Калі яно паводзіць сябе неяк не так, зусім не абавязкова, што бацькі яго разбалавалі. Некаторыя падыходзяць і робяць заўвагу маме ці кажуць свайму малому: «Паглядзі, як дрэнна сябе паводзіць той хлопчык». Крыху больш уважлівымі трэба быць. Цалкам магчыма, што трэба проста прайсці міма, не звяртаючы ўвагі, ці дапамагчы.

**У нас побач з лецішчам ёсць лагер,** дзе адпачываюць дзеці з асаблівасцямі развіцця. Калі яны прыходзяць на пляж, многія рэагуюць вельмі дрэнна, адварочваюцца. Дзіця ідзе ў ваду па коўзкіх прыступках, і ніхто не ўстае дапамагчы. Некаторыя выключна таму, што не ведаюць, як гэта зрабіць. Я бачу, што ў гэтага хлопчыка аўтызм. Устаю (але не набліжаюся, каб не было панікі) і з добразычлівым тварам коратка пытаюся: «Дапамагчы?» (Хуткае маўленне дзеці з аўтызмам могуць успрыняць як болевы шум). Калі бачу ківок галавы, значыць маю права падысці бліжэй.

**У наступным годзе плануем зняць фільм** з удзелам нашых артыстаў. Яны будуць расказваць, што павінны ведаць людзі пра асаблівых дзяцей. Думаю, гэта будзе карысны фільм.

**Люблю, калі мяне хваляць.** З дзяцінства так: калі сварацца — рукі апускаюцца. Таму мяне трэба хваліць. Калі сказаць, што я малайчына, крылы вырастаюць, і я ў блін разаб'юся, каб было яшчэ лепш.

**Самая вялікая пахвала** нават не тады, калі гледачы не бачаць, дзе на сцэне дзеці з асаблівасцямі. А калі бацькі пасля прагляду спектакля прыводзяць да нас сваіх здаровых дзетак і кажуць: «Мы хочам у ваш тэатр».

**Вельмі хочацца** ўжо мець сваё вялікае памяшканне. Каб акцёры з аўтызмам, якіх не ўзялі ў школу, маглі прыйсці зранку і застацца ў нас на ўвесь дзень. Для іх на сёння гэта адзіная магчымасць сацыялізацыі. Мару, каб наш інклюзіў-тэатр ставіў вельмі цікавыя спектаклі і стаў вядомы на ўвесь свет.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**

■ Бацькі і дзеці

# СКАЖЫ, АЛІСА...

— Скажы, Аліса, якая адлегласць да Месяца? — запыталася я ў сваёй электроннай сяброўкі.

— 384 400 кіламетраў, — пачула ў адказ.

— Колькі патрабуецца часу, каб да яго дабрацца?

— Самы хуткі палёт зойме восем гадзін трыццаць пяць хвілін, — зноў падказала Аліса.

А я задумалася: да Месяца ўсяго восем гадзін! А мае бацькі дабіраюцца з працы да дома амаль паўтары гадзіны. Хоць адлегласць значна меншая!

— Драбяза, — як заўсёды скажа тата. — Вось у Амерыцы...

У таты ўсё «драбяза». І на ўсё ў яго ёсць адказ. Звычайна для аргумента ён прыводзіць прыклад: як у Амерыцы, Японіі, Інданезіі і шмат дзе яшчэ. Цікава, ці ведае пра гэтыя факты Аліса?

А ў маці і на дробязі часу няма. Яна ўся ў працы. І калі прыходзіць дадому, амаль з парога кажа: «Пачынаецца мая другая змена».

Я пагутарыла б з татам пра дробязі. Але пасля прывядзення фактаў у яго спартыўныя тэлеперадачы, гутарка з суседам, маленькі рамонт. Словам, драбяза...

Я паразмаўляла б з папугаем Жорыкам. Але той маўчыць, як партызан. Відаць, размаўляць з вучаніцай 5 «А» класа нецікава. А можа, я не яго ўзровень? І ён мяне проста ігнаруе?

Пра «ўзровень» мне заўсёды кажа Сашка, які жыве на нашай лесвічнай пляцоўцы. Ён вучыцца ў восьмым класе і лічыць сябе вельмі дарослым, каб размаўляць з «малымі».

На гадзінніку сёмая вечара. Я пакуль усё яшчэ адна. Бацькі вернуцца з працы праз паўгадзіны. Гэта калі, відома, яны не зойдуць у супермаркет. Гэты час я баўлю са сваёй электроннай сяброўкай Алісай, ну і з папугаем Жорыкам, хоць ён мне нічога не адказвае.

Я, вядома, магла б патэлефанаваць сяброўцы Машы. Але тая, як заўсёды ў такі час, робіць хатняе заданне па матэматыцы. Маша марыць стаць вядомай. Каб яе біяграфія стаяла ў адным шэрагу з такімі вучонымі, як Архімед, Альберт Эйнштэйн, Леанард Эйлер. А на дробязі ў яе часу няма. Пасля таго як Машка ўдосталь нарашаецца прыкладаў, яна будзе глядзець любімы навуковы серыял.

> ➢ ДАВЕДКА
>
> **Аліса — віртуальная галасавая памочніца, створаная кампаніяй «Яндэкс». Імітуе жывы дыялог, распазнаючы натуральную гаворку (вусную і пісьмовую) і даючы адказы на пытанні (прамаўляючы іх уголас і выводзячы на экран). Афіцыйны запуск Алісы адбыўся 10 кастрычніка 2017 года.**

Я ж пакуль не ведаю, што ў гэтым свеце для мяне важна. Знаходжуся ў пошуку.

— Скажы, Аліса, што такое пошук?

— Перабор пэўнай сукупнасці аб'ектаў, пры якім праводзіцца аналіз кожнага аб'екта да таго часу, пакуль не будзе вычарпаная сукупнасць аб'ектаў або аналіз не пакажа, што аб'ект задавальняе вызначаным крытэрыям, — адчаканіла сяброўка.

Ого! Паспрабуй запомніць! Шкада, што Алісу нельга браць з сабой, калі ідзеш адказваць да дошкі. Калі б гэта было магчыма, я была б выдатніцай.

Зазваніў тэлефон.

— Веселова, матэматыку зрабіла? — запытаўся Колька.

Колька — вучань так сабе. Ён не марыць стаць вядомым вучоным, яго цікавяць толькі хакей і футбол.

— Так, — адказваю я яму.

— Які адказ? — запытаўся Колька.

Я называю лічбы.

— Зразумела, — адказвае Колька.

— Што зразумела? — пытаюся я. — Табе нават нецікава ведаць дзеянні?

— Драбяза. Я тут у пошуку футбольнай амуніцыі. На трэніроўку спазняюся. Не да дзеянняў.

Так, так. Я забылася сказаць, што Колька марыць стаць вядомым футбалістам. Нашым Раналду. А ўсё іншае для яго — драбяза. Нават дзеянні.

А кім мару стаць я? Ніякіх схільнасцяў у мяне няма. Мабыць, я так і застануся Настассяй Весяловай. Толькі з часам стану дарослай.

Я паглядзела на Жорыка. Цікава, кім марыць стаць ён? Відаць, гэтаксама як і яго маленькая гаспадыня, нікім. Інакш бы ён даўно навучыўся размаўляць і здымаўся ў кіно. Я глядзела б яго па тэлевізары і ўсім сваім знаёмым казала, што гэта мой Жорык.

— Скажы, Аліса, які самы вядомы папугай?

— Алекс. Афрыканскі шэры папугай, які атрымаў вядомасць з-за эксперыментаў доктара навук Айрын Пеперберг.



Эксперыменты! Не, я нікому не дазволю ставіць доследы на маім Жорыку. Няхай ён таксама будзе невядомы. Драбяза! Затое ён заўсёды будзе побач са мной.

— Скажы, Аліса, якая адлегласць ад супермаркета да нашага дома?

— Адказ не знойдзены, — праз некалькі секундаў паведаміла тая.

— Хоць штосьці ты не ведаеш! — узрадавалася я.

Я падышла да акна. Каля пад'езда сядзеў на прывязі сабака і чакаў свайго гаспадара. Ён не зводзіў вачэй з дзвярэй.

«Цікава, колькі ён вось так сядзіць?» — падумалася мне.

Магчыма, столькі, колькі я чакаю сваіх бацькоў з працы. Мне захацелася выйсці на двор, пазнаёміцца з сабачкам. Цікава, што б ён расказаў мне, калі мы маглі б зразумець адзін аднаго?

Пэўна, пра сваё жыццё. Што вось так увесь час чакаеш тых, хто прыручыў, а яны нават пра цябе ў гэты момант не думаюць. Ці думаюць так: «Нічога з ім не станецца. Пачакае». І так штодзённа.

У гэты час з пад'езда выйшла пара. Сабачка радасна завіхляў хвастом. Праз некалькі імгненняў яны ўтраіх пайшлі па дарожцы. Сабака бег паперадзе і ўвесь час азіраўся. Відаць, баяўся, што яго гаспадары зноў некуды знікнуць. Але яны не знікалі. І яму, відаць, ад гэтага было радасна.

У той момант я пачула, як адчыняюцца нашы ўваходныя дзверы. Вось і дачакалася! Цяпер усе дома!

— Скажы, Аліса, ты гэтаму рада?

— Вядома, — адказала сяброўка. — Бо гэтаму рада ты...

Тады я ўсвядоміла яшчэ адну маленькую дробязь у сяброўстве. Але якую важную! Аказваецца, і дробязь бывае важная. Я падумала аб тым, што трэба пацікавіцца ў таты, як там наконт гэтага у Амерыцы ці Інданезіі.

І пабегла ім насустрач...

**Андрэй СІДАРЭЙКА**

---

Сямейная пошта

## Нарадзіць «для сябе»

Чакаць, спадзеючыся на лёс, сустрэчы з «мужчынам сваёй мары» альбо асмеліцца, разумеючы, што гады бягуць, нарадзіць дзіця «для сябе»? Нярэдка ў наш час незамужнія маладыя жанчыны выбіраюць другі варыянт. І справа, напэўна, не ў адсутнасці нормаў маралі, а ў тым, што ніхто не мае права забараніць жанчыне выканаць сваё галоўнае, прыродай дадзенае прызначэнне — быць маці.

Вось і ў выпадковай аўтобуснай размове ад сваёй былой вучаніцы даведалася: у адной з яе колішніх аднакласніц, таксама маёй выхаванкі, сын нарадзіўся. З апошняй, дарэчы, праз некалькі месяцаў, ізноў жа ў аўтобусе, давялося сустрэцца асабіста і ўжо з яе вуснаў пачуць:

— А нам ужо чатыры месяцы, паціху расцём...

— Ад душы віншую! — кажу ў адказ і слухаю стрымана-радасны расказ маладой маці. Пра тое, які харошы і прыгожы яе хлопчык, якім асаблівым сэнсам напоўнены цяпер яе дні і што яна ні разу не пашкадавала пра сваё рашэнне, прынятае ў 30-гадовым узросце...

Як будзе далей — жыццё падкажа само. Бо толькі яму і вядома, што правільна, а што — не, што вартае асуджэння альбо, наадварот, заслугоўвае самай шчодрай узнагароды.

## Каханне бывае рознае...

Пранесці праз дзесяцігоддзі сумеснага жыцця яркасць і непасрэднасць пачуццяў, ставіцца адно да аднаго з юначай любоўю і пяшчотай... Згадзіцеся, далёка не кожная сямейная пара можа па-добраму гэтым пахваліцца. Куды часцей даводзіцца чуць гісторыі пра побыт і надзённыя праблемы, з-за якіх і здрабнела калісьці вялікае каханне; пра звычку, што даўно замяніла радасць і шчасце.

Таму нельга забыць эпізод, які давялося назіраць на святкаванні юбілею адной цудоўнай і прыгожай жанчыны.

Які яна выдатны прафесіянал, чулы і душэўны чалавек — пра гэтыя і многія іншыя якасці юбіляркі доўга і пранікнёна гаварылі запрошаныя на ўрачыстасць родныя, калегі, сябры. Але найбольш запомнілася віншаванне мужа.

— Каханне бывае рознае — платанічнае, фізічнае і шмат якое яшчэ, — пачаў ён з прачытанага дзесьці. А пасля прамовіў тое, што прасілася з душы: — А я жадаю ўсім такога, як у нас, — сапраўднага!..

Узрушаныя госці дружна закрычалі «горка!», і на нейкі момант здалося, што святкуецца не юбілей, а па меншай меры сярэбранае вяселле. І, гледзячы на закаханых, як у юнацтве, «маладых», хацелася думаць: «Дай Божа, каб такімі словамі кожны муж згадваў пра сваю жонку не толькі праз дваццаць ці трыццаць, але яшчэ праз многа-многа гадоў пасля вяселля».

**Ірына МАТУСЕВІЧ.**

---

■ Фотаздымак з гісторыяй

# ЛІСТЫ З ВАЙНЫ

**Гэты здымак на конкурс даслаў Мацвей ДУБЯГА, вучань 11 «Б» класа СШ № 3 горада Вілейка. «Выпадкова мне ў рукі трапілі лісты і паштоўкі перыяду Першай сусветнай вайны, — піша хлопец. — Яны шмат гадоў захоўваліся ў сям'і віляйчанкі Наталлі Урублеўскай.**

На жаль, Наталля Аляксандраўна практычна нічога не памятае пра свайго прадзеда. Але, чытаючы лісты і паштоўкі, якія Лука Маркевіч дасылаў родным, я змог паглядзець на падзеі стагадовай даўнасці вачыма іх сведкі.

Лука Іванавіч практычна мой аднагодак. На момант пачатку службы яму было 18 гадоў, і ў гэтым узросце ён перажыў страшэнныя баі, газавую атаку, смерць таварышаў па службе. Нашаму пакаленню, якое жыве ў мірны час і пра вайну ведае толькі па кніжках, складана ўявіць, што на долю маладога чалавека можа выпасці столькі цяжкасцяў.



**Лука МАРКЕВІЧ (справа) разам са сваім саслужыўцам.**

Першы з захаваных лістоў датаваны 4 ліпеня 1915 года. З яго відаць, што малады чалавек знаходзіцца на ваенным абучэнні ў даволі цяжкіх умовах. «Вы сами и знаете какая теперь учения тяжелая... Учения начинаецъ четырох часов утра до 12ти часов ночи» *(усе цытаты набраныя з захаваннем арфаграфіі Лукі Іванавіча).*

19-гадовы хлопец, атрымаўшы лісты ад родных, у адказ піша: *«А як стал читать я ваша письмо так облився слизами и непрочитал».*

Наступныя лісты робяцца больш спакойнымі і ўпэўненымі, відаць, як цяжбы службы фарміруюць з юнака мужчыну. Тым не менш ён чакае кожнага ліста ад родных. *«Мне сейчас хорошо и всего хватаить покамись что толка там плоха что вы мне непишетя писемь или они можа до меня не доходят».*

12 лютага 1916 года Лука Маркевіч піша аб тым, што 10 сакавіка яго адпраўляюць на фронт. *«Я нахожусь в учебной команде экзаментъ намъ былба десятого Февраля ну как сейчас у насъ баёв неть такъ нас оставили до десятага марта ещё учится а потом поедем на пазицию»*. Гэта апошні ліст...

Наступнай вестачкай ад Лукі былі ўжо паштоўкі. Першая напісана 1 жніўня 1916 года з лагера ваеннапалонных у нямецкім горадзе Саарбрукене.






У адрозненне ад лістоў (паколькі канверты не захаваліся) на паштоўцы можна ўбачыць адрасы атрымальнікаў. Лука Маркевіч піша ў родную вёску Баранцы свайму брату Кірылу ды сястры Дар'і, цётцы Ефрасінні ў Вілейку. У кожнай паштоўцы адчуваецца туга па блізкіх. *«1917 год 7 мая здраствуй дорогая сестрица Дарья посылаю я вамъ нижающие почтения и низко кланеюся прошу я васъ шлит якакъ можна черныхъ сухорей и почему вы мне не пишитяписемъ я получил от вас три посылки ещокланеюся тетке Ефросиній затем досвидания прощайте».*

Пасля вайны Лука Іванавіч вярнуўся ў родную вёску, стварыў сям'ю і пражыў доўгае жыццё. Але я перакананы, што не вымераць той балючы след, які пакінула ў яго сэрцы страшная вайна».

***Шаноўныя чытачы! Конкурс «Фотаздымак з гісторыяй» працягваецца. Мы па-ранейшаму чакаем ад вас цікавых фота з сямейнага альбома. Здымкі (не больш за тры) з невялікай гісторыяй дасылайце з адпаведнай пазнакай на адрас: вуліца Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск або info@zviazda.by. Найлепшага аўтара чакае прыз. Арыгіналы дасланых фотаздымкаў абавязкова вяртаюцца***

■ Натхненне

# КАЛІ ТЫ — «ЗДОЛЬНАЯ»

## Унікальны праект дае магчымасць беларускам займацца спортам незалежна ад узросту і фізічнай падрыхтоўкі

**Два гады таму каманда аднадумцаў запусціла ўнікальны для нашай краіны сацыяльна-спартыўны праект, каб кожная беларуска ведала, на што яна здольная: пераадолець унутраныя бар'еры, выйсці за рамкі стэрэатыпаў, стаць больш упэўненай у сабе і палюбіць актыўны лад жыцця. Праект так і назвалі — «Здольная». Сёння на бясплатныя трэніроўкі прыходзяць самыя розныя жанчыны. Хтосьці з іх апошні раз займаўся спортам шмат гадоў таму, мабыць нават у школе, хтосьці — нарадзіў дзіця і не можа яго ні з кім пакінуць. Але «Здольная» — яна для ўсіх.**

### СТАЦЬ МОЦНАЙ І ЎПЭЎНЕНАЙ У САБЕ

— Ідэя праекта з'явілася ў мяне падчас вучобы ў магістратуры ў Вялікабрытаніі, — расказвае **стваральніца праекта «Здольная» Ганна БАНДАРЭНКА.** — Тады я пазнаёмілася з мясцовым праектам This Girl Can, мэта якога — матываваць брытанак быць больш актыўнымі. Да гэтага я завяршыла прафесійную футбольную кар'еру, і мне вельмі хацелася зрабіць нешта сацыяльна значнае для беларусак.

Каб правільна сфармуляваць канцэпцыю і місію «Здольнай», спатрэбіўся час. Першы год каманда арганізоўвала бясплатныя трэніроўкі па футболе, рэгбі, амерыканскім футболе, асобных відах адзінаборстваў. Але праз нейкі час прыйшло ўсведамленне: праект не проста далучае беларусак да здаровага ладу жыцця. Дзякуючы спорту жанчыны адчуваюць сябе больш моцнымі, прыгожымі, упэўненымі ў сабе і шчаслівымі.

— Калі ёміста сказаць, пра што наш праект, — працягвае Ганна, — то ён пра тое, што кожная жанчына павінна мець магчымасць займацца любой спартыўнай актыўнасцю незалежна ад узросту, матэрыяльнага дабрабыту, наяўнасці дзяцей, а таксама ўзроўню фізічнай падрыхтоўкі. На жаль, праблема, якую мы вырашаем, не ляжыць на паверхні. Але калі задумацца крыху больш, то, напэўна, у асяроддзі кожнага ёсць знаёмая, якой не па кішэні абанемент у дарагі фітнесклуб або няма з кім пакінуць дзіця, каб рэгулярна трэніравацца.

Акрамя таго, як адзначае стваральніца праекта, «Здольная» — у тым ліку і аб гендарнай роўнасці:

— Вельмі шкада, што назват цяпер словазлучэнне «гендарная роўнасць» у некаторых беларусаў выклікае скрыўленую грымасу. Але паглядзім фактам у вочы. Як правіла, сярэднестатыстычная беларуска зарабляе на 33 % менш за мужчын, а таксама ўдвая больш заклапочана працай па доме і выхаваннем дзяцей, таксама на яе плечы кладзецца ўвага да дарослых членаў сям'і. Мы хацелі б даваць магчымасць жанчынам удзельнічаць у даступных спартыўных занятках па інтарэсах, не звяртаючы ўвагі на тое, што на трэніроўку яны могуць прыйсці з дзецьмі, або тое, што апошні раз яны бегалі ў школе на ўроках фізкультуры.



Заснавальніца праекта «Здольная» — Ганна БАНДАРЭНКА.



Адкрытыя заняткі па футболе.

### НА ФУТБОЛ — З ДЗЕЦЬМІ

Сёння большасці жанчын у праекце ад 18 да 35 гадоў, самай жа старэйшай з удзельніц — крыху больш за 40. У асноўным усе яны ніколі не займаліся спортам прафесійна.

— Нярэдкая карціна — убачыць на занятках і мам з дзецьмі, — дзеліцца Ганна. — Гэта асобная катэгорыя ўдзельніц праекта, да якіх неабходна асаблівая ўвага. Некаторыя дзеці займаюцца разам з мамамі, меншых жа падчас трэніроўкі могуць даглядаць валанцёры. Але, на жаль, сёння ў праекта няма адпаведнай інфраструктуры: дзіцячага пакоя або прафесійнай няні.

Дарэчы, большасць трэнераў «Здольнай» — жанчыны. Яны самі адгукнуліся на аб'яву Ганны ў інтэрнэце і вырашылі далучыцца да праекта. Такім чынам удалося запусціць канкрэтныя актыўнасці: каратэ, футбол, рэгбі, бадмінтон.

Апошнія некалькі месяцаў «Здольная» сфакусавана на адным кірунку — футболе. Па выніках унутранага даследавання, гэта самы папулярны від фізічнай актыўнасці ў праекце.

— Часам мы праводзім «адкрытыя трэніроўкі» і па іншых відах спорту. Напрыклад, не так даўно былі заняткі па рэгбі, а яшчэ ўлетку мы запрасілі ў Мінск каманду па ролер-дэрбі з Санкт-Пецярбурга, каб пазнаёміць беларусак з гэтым драйвовым відам спорту.

Пакуль праект дзейнічае толькі ў Мінску, аднак, як прызнаецца Ганна, яна разумее яго вялікую важнасць і патрэбнасць менавіта ў рэгіёнах, дзе не так развіта спартыўная інфраструктура:

— Маштабавацца ў рэгіёны — гэта доўгатэрміновыя планы. Я буду вельмі рада водгуку энергічных людзей, якія хацелі б пачаць рэгіянальныя ініцыятывы пад крылом «Здольнай».

**Як далучыцца да праекта?**

**«Здольная» чакае ўсіх ахвотных ад 18 гадоў. Для таго каб далучыцца да трэніровак, трэба запоўніць анлайн-форму рэгістрацыі на заняткі на сайце zdolnaja.by.**

### Водгукі ўдзельніц

**Ганна ЛАНЕЦ (футбол):**

— Я даўно хацела паспрабаваць пагуляць у футбол і, калі даведалася, што праект арганізуе трэніроўку, вырашыла: а чаму б і не? І да гэтага часу не шкадую. Калі пачула, што ідзе набор у каманду па міні-футболе і ўзровень навыкаў гульні не важны, вырашыла далучыцца. Зараз я ўваходжу ў склад каманды «Здольная» па футболе.

Самае галоўнае, што атрымала дзякуючы праекту, — гэта адчуванне, што я магу! Мяне вельмі натхняюць жанчыны, якія прыходзяць на трэніроўкі, якія гуляюць са мной у камандзе, іх сіла і адкрытасць, узаемадапамога і падтрымка. Гэта напаўняе мяне сілай.

**Кацярына ГРАЧОВА (рэгбі):**

— Аб «Здольнай» я даведалася праз сацыяльныя сеткі яшчэ да пачатку паўнавартаснай працы праекта. Вельмі чакала, калі пачнецца запіс на трэніроўкі, нават перыядычна пыталася ў арганізатараў, ці не прапусціла яго. Так я трапіла на адкрытую трэніроўку па жаночым рэгбі ў клуб, за які гуляю ўжо больш за год (РК «Гражданачка». — **Аўт.**). Сёння я не ўяўляю сябе без трэніровак, сяброў па камандзе, гэтай асаблівай энергіі, якую даюць заняткі спортам. Што асабліва прыемна, праз некаторы час пасля таго, як я пачала займацца рэгбі, мяне запрасілі на адкрытую лекцыю ад праекта «Здольная» ў якасці прадстаўніка гендарна-маркіраванага віду спорту. Было цудоўна падзяліцца з іншымі дзяўчатамі сваім вопытам і, магчыма, падштурхнуць кагосьці не спалохацца зрабіць крок, каб знайсці спорт па душы.

### ТАНЦАВАЛЬНЫ ФЛЭШМОБ СУПРАЦЬ ГВАЛТУ

Амаль за два гады існавання праекта «Здольная» ўдалося арганізаваць і правесці больш за 100 заняткаў, а таксама рэалізаваць шэраг сумесных ініцыятыў. Адзін з прыкладаў — танцавальны флэшмоб супраць гендарнага гвалту One Billion Rising («Адзін мільярд паўсталых»).

— Ідэя арганізаваць флэшмоб з'явілася сумесна з ГА «Радзіслава», — расказвае Ганна, — бо яны ўжо праводзілі падобнае мерапрыемства два гады таму. На жаль, з прычыны арганізацыйных складанасцяў мы не змаглі прыцягнуць вялікую колькасць удзельніц, але нам удалося запрасіць прадстаўнікоў СМІ і такім чынам расказаць аб існуючай праблеме вялікай колькасці чытачак. Мы паспрабавалі данесці, што ў Беларусі ёсць спецыялізаваныя арганізацыі, заклікаnыя дапамагаць жанчынам, якія знаходзяцца ў няпростым становішчы.

**Ганна БАГІНО.**

**Фота з архіва праекта «Здольная»**

■ Людзі і лёсы

# «ЗЛАМАНЫ», АЛЕ НЕ ЗЛОМЛЕНЫ,

## або Чаму так важна не памыліцца з выбарам жонкі

**Юрый ХОМІЧ з аграгарадка Камянюкі мае добрую і клапатлівую жонку Святлану, дзвюх дарослых паспяховых дачок, прасторны ўтульны дом, вялікую гаспадарку і ўласны бізнес па дрэваапрацоўцы... І гэта ўсё пры тым, што мужчына прыкаваны да інваліднага крэсла, вельмі дрэнна бачыць і пальцы яго рук цалкам нерухомыя.**

Так было не заўсёды. Пасля заканчэння Беларускага інстытута механізацыі і сельскай гаспадаркі (цяперашні БАТУ. — **Аўт.**) Юрый працаваў інжынерам у калгасе, затым — галоўным механікам у нацыянальным парку «Белавежская пушча». У 1995-м атрымаў другую нерабочую групу інваліднасці па зроку.

Пасля звальнення з пушчы адкрыў сваю справу. Жыццё ішло сваім ходам, падрасталі дзеці, Юрый Іванавіч, ужо маючы вопыт кіраўніка, даволі паспяхова кіраваў бізнесам. Ніхто не мог падумаць, што неўзабаве ўсё перавернецца з ног на галаву.

...Адзін з нешматлікіх выхадных вырашылі правесці з сябрамі. Пікнік праходзіў цалкам традыцыйна: мужчыны займаліся шашлыком, жанчыны — дзецьмі, якія аблюбавалі спартыўную пляцоўку непадалёк. Дачка Юрыя Іванавіча Насця вырашыла пахваліцца майстэрствам гімнасткі, на што тата адказаў: «Давай пакажу, як трэба». «Пад'ём з пераваротам» — не самы складаны трук у яго спартыўнай скарбонцы. Аднак вароты не былі ўмацаваныя належным чынам, і Юрый упаў разам з імі. Але, як ні дзіўна, болю амаль не было. Першая думка: «А што з дачкой?» Дзякаваць богу, дзяўчынка своечасова саскочыла на зямлю, не атрымаўшы ніводнай драпіны. А вось бацька, як ні стараўся, падняцца так і не змог. Цела адмаўлялася падпарадкоўвацца...

Сябры Юрыя дзейнічалі аператыўна: адвезлі ў Брэст, дзе пацыента тэрмінова прааперыравалі. Аднак лепш не стала. Пасля абласнога цэнтра — шпіталізацыя ў Мінску і... сем месяцаў лячэння.

Без руху Юрый Іванавіч прабыў месяцы. Пазней яго пачалі саджаць у інвалідное крэсла. У палаце з Юрыем пастаянна знаходзілася жонка Святлана і хто-небудзь са сваякоў або сяброў, бо яна не магла самастойна справіцца з фізічнай нагрузкай.

Ілюзій адносна выздараўлення ніхто з членаў сям'і не меў: дактары адразу растлумачылі, што пакуль у свеце няма тэхналогій па стапрацэнтным аднаўленні рухальных функцый пасля пераломy пазваночніка, аднак навука не стаіць на месцы. Пасля мінімальнага рэабілітацыйнага курса сям'я працягнула развіваць бізнес, бо падрасталі дзеці, а да бытавых выдаткаў дадаліся і выдаткі на лекі.

Як расказвае Юрый, чорных думак з нагоды свайго стану ў яго не было, проста вельмі хацелася дадому. Святлана Васілеўна таксама ўсімі сіламі старалася вярнуць жыццё ў ранейшае рэчышча.

«Трэба працягваць жыць! І не проста выжываць, а паляпшаць свой узровень, — раіць Юрый Іванавіч усім, хто апынуўся ў падобнай сітуацыі. — А акрамя працы іншага спосабу для гэтага няма, і ўсё залежыць ад самога чалавека. Тым больш цяпер столькі ўсяго для людзей з абмежаванымі магчымасцямі».

Натуральна, працаваць за камп'ютарам, кіраваць машынай і нават чытаць з-за праблем з вачыма і нерухомасці пальцаў мужчына не можа, аднак пытанні, звязаныя з бізнесам, вырашае па тэлефоне. За рулём і на важных сустрэчах яго замяняе жонка, пры гэтым Юрый — амаль заўсёды побач: у пасажырскім крэсле аўто ці калясцы. Сумаваць няма калі! Адзіны выхадны — гэта нядзеля... Ды і тое, калі няма гасцей.

Вялікую ролю ў рэабілітацыі Юрыя Іванавіча адыграла жонка. Па-першае, яна не адмовілася ад мужа пасля трагедыі (што, па статыстыцы, адбываецца ў пераважнай большасці выпадкаў). Па-другое, Святлана валодае чароўнымі жаночымі якасцямі. У прыватнасці, адданасцю каханаму, уменнем яму падпарадкоўвацца і цалкам давярацца яго рашэнням. Таму праблем з урэгуляваннем многіх пытанняў у галавы сямейства з такой памочніцай не ўзнікае апрыёры. Тым больш цяпер частка абавязкаў у дрэваапрацоўчым цэху, дзе заняты пятнаццаць работнікаў, ускладзена на дачок і зяця.



Дарэчы, нядаўна старэйшая дачка Лена з мужам падарылі Юрыю і Святлане ўнука Васіля. Бабуля і дзядуля дапоўнілі адзін з пакояў дзіцячым ложачкам. Жыццё працягваецца...

**Ганна СОЎПЕЛЬ,** *Камянецкі раён*

# СТАЛІЧНЫ ЭКСКЛЮЗІЎ



Чатыры гады спадар Казімір працаваў модным дыджэем.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

**На інтэрв'ю дыджэй КАЗІМІР прыйшоў «на стылі». Сонечныя акуляры, начышчаныя чаравікі, парфума. У адным вуху — навушнік, які ён не вымае на працягу ўсёй размовы. Сустрэцца пенсіянер прапанаваў побач з экстрым-паркам на вуліцы Сталетава.**

— Гэта адно з маіх любімых месцаў у горадзе, — тлумачыць. — Часта прыходжу сюды са сваёй бабулькай (жонкай Ларысай. — **Аўт.**). Падабаецца, як пляцоўку ўладкавалі: зрабілі прыгожа і для нас, пенсіянераў, і для дзяцей. Святочна выглядае, цудоўна. Адзінае, што раскрадаюць. Вунь узяць лавачкі на футбольным полі — адну ўжо год таму разабралі па частках.

Эпатажны Казімір Карпенка добра вядомы многім мінчанам. З сівой барадой, у капелюшы, з арыгінальнай палкай і пярсцёнкамі на руках, ён раней часта прагульваўся ў цэнтры горада. Размаўляў вершамі і рабіў па просьбе мінакоў прадказанні. А пяць гадоў таму стаў модным дыджэем. Дыскатэкі, кліпы, гастролі — усё як належыць. Казіміру Казіміравічу за 70, але дакладны ўзрост ён не называе: «Калі ёсць інтарэс да жыцця, навошта лічыць гады?»

## «Кожны выхад з дому для мяне свята»

***— Вы заўсёды былі такім эпатажным?***

